# Беларуская мова

# 5

## Частка 2



# Беларуская мова

Вучэбны дапаможнік для 5 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай
мовамі навучання

У дзвюх частках

Частка 2

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2019

Правообладатель Национальный институт образования

УДК 811.161.3(075.3=161.3=161.1)
ББК 81.2Беи-922
Б43

А ў т а р ы:

**Г. М. Валочка, С. М. Якуба** («Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год»);

**В. У. Зелянко** («Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія»);

**С. В. Мартынкевіч** («Лексіка. Фразеалогія»)

Р э ц э н з е н т ы:

кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» (кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры *Д. В. Дзятко*);

настаўнік беларускай мовы і літаратуры кваліфікацыйнай катэгорыі «настаўнік-метадыст», намеснік дырэктара па вучэбна-метадычнай рабоце дзяржаўнай установы адукацыі «Маларыцкая раённая гімназія» *М. І. Навумчык*

## Умоўныя абазначэнні:

— правіла;

— рубрыка «Успамінаем вывучанае»;

— рубрыка «Гавары і пішы правільна»;

— рубрыка «Скарбы мовы»;

— заданні, накіраваныя на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў;

● — дадатковыя пытанні і заданні, накіраваныя на замацаванне ведаў і ўменняў па раней вывучаных тэмах;

— заданні творчага характару, накіраваныя на развіццё звязнага маўлення вучняў;

— спасылкі на заданні (QR-коды) для праверкі ведаў пры дапамозе смартфона ці планшэта;

— дадатковы матэрыял, размешчаны на электронным адукацыйным рэсурсе «Беларуская мова. 5 клас» (нацыянальны адукацыйны партал: http://e-vedy.adu.by);

аратар* — лексічнае значэнне слова тлумачыцца ў слоўніку;

дзень[ф] — зрабіць фанетычны разбор слова;

зорка[л] — зрабіць лексічны разбор слова;

Узышло сонца.[сн] — зрабіць сінтаксічны разбор сказа.

ISBN 978-985-594-328-1 (ч. 2)
ISBN 978-985-594-326-7

© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2019

Правообладатель Национальный институт образования

# Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія

## § 1. Гукі беларускай мовы

**1.** Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго падзел на абзацы.

Можна сцвярджаць, што першыя навуковыя веды, якія свядома набывае чалавек, звязаны з гукавым ладам мовы. Ужо ў першыя месяцы жыцця дзіця ўважліва прыслухоўваецца да маўлення дарослых. Перш чым засвоіць асобныя словы і фразы, яно ўпэўнена адрознівае інтанацыю. Малы супакойваецца, калі чуе разважныя словы, кідаецца ў плач ад гучнага голасу. Немаўляты яшчэ самі не могуць размаўляць, але вельмі рана пачынаюць разумець мову.

Наступныя крокі на шляху да ведаў таксама звязаны з авалоданнем гукавым ладам мовы. Вельмі хутка ў малога ўзнікае жаданне не толькі моўчкі слухаць бацькоў, але і самому выказацца: паклікаць маму, папрасіцца на рукі да таты, адмовіцца ад кашы.

Ад двух да пяці гадоў — вось які час неабходны для авалодання роднай мовай. У гэты час маленькі чалавек спасцігае таямніцы роднага слова і здзіўляе дарослых сваімі ўдумлівымі адносінамі да яго *(Паводле Л. Выгоннай)*.

Прывядзіце ўласныя прыклады, якія пацвярджаюць думку, выказаную ў першым сказе тэксту.

Карыстаючыся прыведзенай у тэксце інфармацыяй, растлумачце значэнне і паходжанне слова *немаўля*.

● Складзіце і запішыце два словазлучэнні са словам *малы*, каб яно ўжывалася ў ролі прыметніка і назоўніка.



Правообладатель Национальный институт образования

**2.** Вусна адкажыце на пытанні.

Чаму гукі лічацца будаўнічым матэрыялам для слоў? На якія дзве групы падзяляюцца гукі беларускай мовы?

**Фанетыка** — раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца гукі мовы.

**Арфаэпія** — раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца правілы вымаўлення гукаў і іх спалучэнняў.

**3.** Слова *фанетыка* паходзіць ад грэчаскага *phōnē* — ‘гук’. Частка *фон- (фан-)*, што значыць ‘які мае адносіны да гукаў’, ёсць у некаторых словах беларускай мовы. Прывядзіце прыклады такіх слоў.

**4.** Прачытайце тэкст. З якой мэтай быў абвешчаны Міжнародны дзень роднай мовы? Сфармулюйце і запішыце адказ на гэта пытанне.

21 лютага адзначаецца Міжнародны **дзень** роднай мовы. З прапановай увесці такі дзень выступіла краіна Бангладэш. Там 21 лютага 1957 года, адстойваючы права вучыцца на роднай мове, загінулі пяць студэнтаў.

Сёння ў свеце налічваецца **больш** за шэсць тысяч моў. Палова з іх знаходзіцца пад пагрозай знікнення. Дзеля іх захавання і быў абвешчаны Міжнародны дзень роднай мовы.

Гэта свята спрыяе таму, каб **людзі** задумаліся пра лёс роднай мовы, на якой вымавілі **першае** слова, на якой размаўлялі іх **продкі**.

Давайце і мы задумаемся пра будучыню беларускай мовы. Размаўляйце па-беларуску, не саромейцеся недасканалай гаворкі. Мова жыве там, дзе ёсць людское жаданне *(Паводле інтэрнэт-рэсурсаў)*.

*па-белару́ску*

Растлумачце сэнс апошняга сказа тэксту.

Зрабіце гукавы запіс выдзеленых слоў.

У з о р: *краіна* — [к р а й і́ н а].



Правообладатель Национальный институт образования

**5**. У кожным слове замяніце адзін гук, каб атрымалася новае слова. Запішыце словы парамі. Укажыце гукі, якімі адрозніваюцца словы.

У з о р: *колас* — *голас* [*к*] — [*г*].

Гара, рака, мост, коска, байка, галі́на, піць, кропка, месці, вадзіць.

**6.** Уявіце, што кожны гук — гэта асобная цаглінка. Пабудуйце з «цаглінак»-гукаў як мага больш слоў, запішыце іх.

[а] [э] [і] [л'] [р] [с] [п] [т] [к]

**7.** Прачытайце верш. Растлумачце сэнс загалоўка.

**Маладая восень**

Залатыя стужкі
на бярозцы мілай.
Хутка, хутка птушкі
паляцяць у вырай.
І вятры крутыя
гучна загамоняць,
воблакі густыя
неба запалоняць.[сн]

*В. Жуковіч.*

Якія словы ў канцы вершаваных радкоў з'яўляюцца сугучнымі?
Запішыце гэтыя словы парамі. Назавіце гукі, якімі яны адрозніваюцца.

**8.** Прачытайце тэкст. З якой мэтай ён напісаны? Якія сказы перадаюць асноўную думку тэксту?

Кожны з нас можа дапамагчы птушкам перажыць **цяжкія** зімовыя месяцы. Для гэтага дастаткова **прыладзіць** у садзе


Правообладатель Национальный институт образования

або за акном кармушку. Самы просты варыянт — пластыкавая **бутэлька** з прарэзанай збоку адтулінай. **Вельмі** каларыйны зімовы корм — гэта кавалачкі несалёнага сала і сырое насенне сланечніку.

Дапамагайце ўзімку сваім пярнатым **суседзям**! *(Паводле С. Зуёнка).*

Запішыце, з якіх гукаў утвораны выдзеленыя словы.

Узор: *месяцы* — [м’], [э], [с’], [а], [ц], [ы].

- Растлумачце пастаноўку працяжнікаў у сказах.

## § 2. Літара як знак гука

**9.** Прачытайце тэкст. Чаму аўтар сцвярджае, што літара — гэта «партрэт» гука?

Адзін і той жа гук можа перадавацца на пісьме з дапамогай розных літар. Ці мы напішам вялікую літару *А*, ці малую, ці ўбачым яе надрукаваныя абрысы, усё роўна ўсе гэтыя знакі будуць перадаваць на пісьме адзін галосны гук — [а]. Літару можна напісаць алоўкам, ручкай, фарбай, яе можна ўбачыць, закрэсліць. А з гукам мы гэтага не можам зрабіць. Гук можна вымавіць, пачуць, запісаць з дапамогай літар ці, напрыклад, дыктафона. Пры гэтым дыктафон дазволіць нам узнавіць вымаўленне гука ў момант яго стварэння. А літара застанецца толькі знакам, з дапамогай якога нам паведамляецца, які быў гук у самым агульным выглядзе. Таму і гавораць, што літара — гэта вобраз гука, яго «партрэт», які перадае самыя агульныя рысы *(Паводле Л. Выгоннай).*

Карыстаючыся прыведзенай у тэксце інфармацыяй, сцісла растлумачце, чым адрозніваюцца гукі ад літар. Адказ запішыце.



Правообладатель Национальный институт образования

**Літара** — графічны знак, які выкарыстоўваецца для абазначэння на пісьме гукаў мовы.

**Графіка** — раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца пісьмовыя знакі, суадносіны паміж гукамі і літарамі.

**Арфаграфія** — раздзел навукі аб мове, у якім вывучаюцца правілы напісання слоў і іх частак.

**10.** Прачытайце схему. Падрыхтуйце вуснае паведамленне пра суадносіны паміж гукамі і літарамі. Прывядзіце ўласныя прыклады.

СУАДНОСІНЫ ПАМІЖ ГУКАМІ І ЛІТАРАМІ

- **гук = «свая» літара** → Гукі могуць абазначацца «сваімі» літарамі: *рэха* [рэха], *воблака* [воблака].
- **гук = «не свая» літара** → Гукі могуць абазначацца «не сваімі» літарамі: *лыжка* (ж = [ш]), *прыказка* (з = [с]).
- **2 гукі = 1 літара** → Два гукі могуць абазначацца адной літарай: *яблык* (я = [йа]), *раён* (ё = [йо]).
- **1 гук = 2 літары** → Адзін гук можа абазначацца дзвюма літарамі: *джэм* (д + ж = [д͡ж]), *дзякуй* (д + з = [д͡з’]).

**11.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку.

## Маці

Аднойчы на ўзлессі я ўбачыў дзвюх кнігавак, якія стомлена ішлі адна за адной. Час быў асенні. Усе кнігаўкі даўно



Правообладатель Национальный институт образования

паляцелі на поўдзень. А гэтыя дзве засталіся. Большая крочыла ўперадзе, а за ёй пасоўвалася са спушчаным крылом меншая кнігаўка. «Маці, — мільганула здагадка, — а кволая птушка — яе дзіця».

Відаць, маладая кнігаўка, уцякаючы ад ястраба, ударылася аб дрэва. Магчыма, ліса схапіла неразумнае птушаня, але яму пашчасціла вырвацца. У вырай кнігаўка ўжо не магла ляцець. Але маці не пакінула ў бядзе сваё дзіця. Яна пешшу павяла яго ў цёплыя краі.

Гэта будзе вельмі доўгі і небяспечны шлях. Але кнігаўкі ўпэўнена ідуць жыццю насустрач. Хочацца верыць, што яны абавязкова дойдуць. Шчаслівага вам шляху, адважныя падарожнікі! *(Паводле Р. Ігнаценкі)*.

***насу́страч***

Выпішыце з тэксту па два словы, у якіх:
а) колькасць гукаў і літар супадае;
б) літар больш, чым гукаў;
в) літар менш, чым гукаў.

- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказе з простай мовай.

**12.** Адгадайце крыжаванку, падабраўшы да слоў рускай мовы беларускія адпаведнікі.

1) Цапля; 2) ласточка; 3) аист; 4) глухарь; 5) утка; 6) чибис.



| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | | п | | | | | |
| 2 | | | т | | | | | |
| | | 3 | у | | | | | |
| 4 | | | ш | | | | | |
| 5 | | | к | | | | | |
| | 6 | | і | | | | | |

Запішыце ў сшытку назвы птушак па-беларуску. Зрабіце гукавы запіс слоў.



Правообладатель Национальный институт образования

Якую птушку вы бачыце на малюнку? Вусна апішыце яе.

Д л я   д а в е д к і: *жывоцік белы, грудкі чорныя, доўгі чубок на патыліцы, зялёны бляск.*

**13.** Запішыце словы ў два слупкі: у адзін — словы, у якіх літара ***з*** абазначае «свае» гукі — [з] або [з']; у другі — словы, у якіх літара ***з*** абазначае «не свае» гукі — [с], [с'] або [ж].

Сляза, позна, казка, зямля, сказ, разжаваць, зязюля, бяроза, мазь, возера, мароз, зжаць.

● З трыма словамі (на выбар) складзіце і запішыце словазлучэнні. Абазначце ў іх галоўныя словы.

**14.** Прачытайце тэкст. Якія сказы перадаюць асноўную думку тэксту?

## Паклон лесу

Цябе чакае ў госці лес, напоены сало..кім водарам кветак і ягад, г..ркаватым пахам грыбоў. Будзь добры з лесам, і ён пакажа табе свае таямніцы.

У с..рэдзіне лета лес усыпаны суніцамі. Яны грэюць на сонцы круглыя б..кі. Кланяйся лесу — і напоўніш кошык м..довымі ягадамі.

А калі лета пакоціцца на восень, пачнуць праз апалае лісце прабівацца г..лоўкі б..равікоў і падасінавікаў. Збяруцца ў чародкі з..латыя лісічкі, зб..гуцца ў падлесак белыя падб..розавікі.[сн] І цяпер а*(д/т)*бівай лесу паклоны. А будзеш задзіраць нос — нічога *(не)*знойдзеш *(Паводле В. Хомчанкі)*.

Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Падкрэсліце словы, у якіх ёсць зычныя гукі, што абазначаны «не сваімі» літарамі.

Растлумачце сэнс выразу *задзіраць нос*.



Правообладатель Национальный институт образования

## § 3. Прызначэнне літар *е, ё, ю, я, і*

**15.** Прачытайце пары слоў. Якія гукі абазначаны літарамі ***е, ё, ю, я, і*** ў выдзеленых складах?

**ле**кі [л’э] — **лье**цца [л’йэ]
**пю**рэ [п’у] — **п’ю** [пйу]
**ня**дзеля [н’а] — тва**я** [йа]
**ві**наград [в’і] — сала**ўі** [йі]
**цё**мны [ц’о] — **ё**гурт [йо]
**зі**ма [з’і] — **і**ней [йі]

У якіх словах літары ***е***, ***ё***, ***ю***, ***я***, ***і*** абазначаюць мяккасць папярэдніх зычных?

Колькі гукаў абазначаюць літары ***е, ё, ю, я, і*** пасля мяккіх зычных?

Колькі гукаў абазначаюць літары ***е, ё, ю, я, і*** пасля раздзяляльнага мяккага знака, апострафа, галоснага, літары ***ў***, у пачатку слова?

Літары ***е, ё, ю, я, і*** могуць абазначаць адзін або два гукі.

Пасля зычных яны абазначаюць адзін галосны гук ([э], [о], [у], [а], [і]) і мяккасць папярэдняга зычнага: *сядзелі* [с’адз’эл’і].

Літары ***е, ё, ю, я, і*** абазначаюць два гукі ([йэ], [йо], [йу], [йа], [йі]):

- у пачатку слова: ***я**блык* [йа], ***ю**нак* [йу];
- пасля раздзяляльнага мяккага знака: *ль**ю*** [йу], *біль**я**рд* [йа];
- пасля апострафа: *вераб’**і*** [йі], *з’**е**сці* [йэ];
- пасля галоснага: *сва**ё*** [йо], *кра**і**на* [йі];
- пасля літары ***ў***: *здароў**е*** [йэ], *салаў**і*** [йі].



Правообладатель Национальный институт образования

**16.** Прачытайце верш. Вызначце яго тэму.

Прыеду я абавязкова
У той любімы мой куток,
Дзе першае прамовіў слова,
Дзе я зрабіў свой першы крок.
Прыеду, каб адчуць душою,
Як веюць водарам лугі,
Аб чым шапоча над ракою
Лес — сябар мой найдарагі.

*М. Пазнякоў.*

Назавіце ў словах гукі, якія абазначаны літарамі ***е, ю, я, і***.

**17.** Запоўніце «лесвічку» словамі, якія пачынаюцца літарамі ***е, ё, ю, я, і***.

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | і | |
| | | | 2 | ё | | |
| | | 3 | я | | | |
| | 4 | ю | | | | |
| 5 | е | | | | | |

**1.** Вязкі асадак на дне вадаёмаў. **2.** Невялікая рыба сямейства акунёвых з калючымі плаўнікамі. **3.** Вялікая і лёгкая спартыўная парусная лодка. **4.** Спецыяліст па юрыдычных пытаннях. **5.** Яловы лес.

Зрабіце гукавы запіс слоў.

**18.** Падбярыце да назоўнікаў прыметнікі. Запішыце словазлучэнні. Падкрэсліце літары ***е, ё, ю, я, і*** адной лініяй, калі яны абазначаюць адзін гук, і дзвюма лініямі, калі яны абазначаюць два гукі.

Узор: *яркія кветкі*.

**Фіялкі, вяргіні, лілеі, гладыёлусы, пралескі.**



Правообладатель Национальный институт образования

**19.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову. Запішыце.

## Как составить букет

Большие и пышные букеты дарят на юбилеи. Это может быть также корзина с экзотическими цветами. В день рождения можно подарить небольшой букет или корзинку, а также украсить цветами подарок.



Если вы идёте в больницу, то не подбирайте большие, яркие, а главное — пахучие цветы.

Важно учитывать, кому вы дарите цветы. Женские букеты обычно круглые, с небольшими нежными цветами. Мужские, наоборот, высокие, из крупных и ярких цветов *(По Е. Рабион)*.

На аснове прыведзенай у тэксце інфармацыі выкажыце меркаванне, каму і ў сувязі з якой падзеяй можна падарыць букет, паказаны на малюнку.

Падкрэсліце ў словах літары ***е, ё, ю, я, і***, якія абазначаюць два гукі.

**Слоўнік**

дарят, да́рите — *дораць, дорыце*
экзотический — *экзатычны*
идёте — *ідзяце́*
крупный — *буйны́*
нежные цветы — *далікатныя кветкі*

**20.** Прачытайце. Перастаўце сказы так, каб атрымаўся тэкст. Запішыце яго.

Самы высокі паверх — для неба і для вачэй. Гэта крапіва, папараць, сунічнік, чарнічнік, мох, верас. А паміж імі —


Правообладатель Национальный институт образования

сярэдні паверх. Беларускі лес, можна сказаць, трохпавярховы. Гэта хвоя, елка, бяроза, клён, ліпа, ясень. Самы нізкі — на зямлі, пад нагамі. Гэта ядловец, каліна, рабіна, арэшнік, маліна, чаромха, шыпшына *(Паводле Я. Сіпакова)*.

Падкрэсліце ў словах літары ***е, ё, я, і***, якія абазначаюць адзін гук.

## § 4. Беларускі алфавіт. Назвы літар

**21.** Прачытайце тэкст. З якой мэтай ён напісаны?

Слова *алфавіт* утворана ад назваў дзвюх першых літар грэчаскага пісьма — *альфа* і *бэта* (з часам стала называцца *віта*). Яны былі ўзяты ад фінікійцаў, якія карысталіся іерогліфамі. Першы ў радзе іерогліфаў меў выгляд галавы быка (бык па-фінікійску — *алеф*). Другі іерогліф меў выгляд дома *(бэт)*. Спалучэнне *альфа* і *бэта* — *альфабэтас*, або *алфавіт* *(Паводле І. Шпадарука, В. Рудакоўскага)*.

***іеро́гліф***

Карыстаючыся прыведзенай у тэксце інфармацыяй, а таксама схемамі, раскажыце пра паходжанне слоў *алфавіт* і *азбука*.









Правообладатель Национальный институт образования

**Алфавіт** — сукупнасць літар, размешчаных ва ўстаноўленым парадку.

| | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Аа** | **Бб** | **Вв** | **Гг** | **Дд** | **Ее** | **Ёё** | **Жж** | **Зз** | **Іі** | **Йй** |
| *а* | *бэ* | *вэ* | *гэ* | *дэ* | *е* | *ё* | *жэ* | *зэ* | *і* | *і нескладовае* |
| **Кк** | **Лл** | **Мм** | **Нн** | **Оо** | **Пп** | **Рр** | **Сс** | **Тт** | **Уу** | **Ўў** |
| *ка* | *эл* | *эм* | *эн* | *о* | *пэ* | *эр* | *эс* | *тэ* | *у* | *у нескладовае* |
| **Фф** | **Хх** | **Цц** | **Чч** | **Шш** | **Ыы** | **Ьь** | **Ээ** | **Юю** | **Яя** | |
| *эф* | *ха* | *цэ* | *чэ* | *ша* | *ы* | *мяккі знак* | *э* | *ю* | *я* | |

**22.** Вусна адкажыце на пытанні.

Колькі літар у беларускім алфавіце?
Якія літары абазначаюць галосныя гукі, зычныя гукі?
Якая літара не абазначае гука?
Спалучэннямі якіх літар абазначаюцца гукі [дж] і [дз’]?
Для чаго трэба ведаць алфавіт?

**клавіяту́ра**

**23.** Разгледзьце малюнак камп’ютарнай клавіятуры. Назавіце літары кожнага рада клавішаў. Як вы лічыце, чаму літары на клавіятуры размешчаны не ў алфавітным парадку?




Назавіце ўсе гукі і літары ў словах *клавіятура, камп’ютар*.



Правообладатель Национальный институт образования

**24.** Растлумачце сэнс выразаў *ад а да я*, *не разумець ні а ні бэ*, *пачынаць з азоў* (*аз* — старадаўняя назва літары *а*).

Д л я  д а в е д к і: *з самага пачатку, з простага; ад пачатку да канца, цалкам; зусім нічога.*

Складзіце і запішыце сказы з гэтымі выразамі.

Як вы разумееце сэнс прыказкі «Спярша аз ды букі, а потым усе навукі»?

**25.** Складзіце спіс экспанатаў школьнага музея «Спадчына», размеркаваўшы іх назвы па групах: а) посуд; б) ткацкія вырабы; в) сельскагаспадарчыя прылады. У межах кожнай групы размясціце назвы экспанатаў у алфавітным парадку.

Ручнік, гаршчок, абрус, каса́, дыван, самавар, збан, серп, вілы, посцілка, граблі, патэльня.

**26.** Прачытайце пачатак паэмы Якуба Коласа «Міхасёвы прыгоды».

Надакучыла дзецям зіма:
Ім разгону зімою няма.
Маркотна Міхасю,
Алесю і Ясю,
Валодзю, Андрэю
І ўсім, хто дурэе
І хоча разгону —
Ну, Юрку, Сымону,
Марынцы, Таццянцы,
Аленцы, Мар’янцы,
І Інцы, і Юльцы,
Натальцы, Ганульцы —
Ну, словам, дзяўчатам
І хлопцам,
Тым хватам.

Запішыце імёны дзяцей у назоўным склоне, размясціўшы іх у алфавітным парадку: *Аленка...*



Правообладатель Национальный институт образования

## § 5. Склад

**27.** Вусна адкажыце на пытанні. Прывядзіце прыклады.

Як вызначыць колькасць складоў у слове?
Ці можа адзін гук утвараць склад?

**Склад** — адзін або некалькі гукаў, якія вымаўляюцца адным штуршком паветра: *а-рэх*, *за-ве-я*.

Асновай склада з’яўляецца галосны гук. Колькі ў слове галосных гукаў, столькі і складоў: *гром* (1 склад), *рэ-ха* (2 склады), *кры-ні-ца* (3 склады), *на-валь-ні-ца* (4 склады).

**28.** Прачытайце тэкст. Дакажыце, што сказы ў тэксце звязаны паслядоўнай сувяззю.

Міколка з дзядулем **выйшлі** з хаты, сталі на лыжы і пашыбавалі ў лес. Хутка яны **апынуліся** на ўзгорку, пасярод якога расла **маладзенькая** прыгожая **ялінка**. **Дрэўца** нібы выбегла насустрач Міколку і **стаяла** перад хлопчыкам у сваім **бялюткім** кажушку. На ім успыхвалі пад ранішнім сонцам вясёлыя **агеньчыкі**. І Міколка мімаволі ўсміхнуўся ялінцы *(Паводле Я. Бяганскай)*.

Запішыце выдзеленыя словы, падзяляючы іх на склады.

Падбярыце сінонім да слова *пашыбавалі*.

*усміха́цца*

**29.** Запішыце словы, размяркоўваючы іх у тры слупкі ў залежнасці ад колькасці складоў.

Таполя, каштан, ліпа, дуб, бяроза, ясень, бук, вольха, асіна, яліна, сасна, клён, яблыня, вяз, рабіна.

● Складзіце і запішыце сказ з абагульняльным словам пры аднародных членах, выкарыстаўшы 3-4 словы.


Правообладатель Национальный институт образования

**30.** Да кожнай схемы падбярыце 2-3 прыклады слоў, запішыце. Умоўныя абазначэнні: *Г* — галосны гук, *З* — зычны гук.

У з о р: *Г-ЗГ-ЗГЗ* — *а-га-род*, *э-кі-паж*, *у-ра-джай*.

| ЗГ-ЗГ | ЗГ-ЗГ-ЗГ | ЗГЗ-ЗГ | Г-ЗГ-ЗГ |
|---|---|---|---|

**31.** Прадоўжыце «ланцужок слоў» так, каб апошні склад папярэдняга слова стаў першым складам наступнага. Запішыце, падзяляючы словы на склады.

У з о р: *пры-ро-да* → *да-ро-га* → *га-зе-та* → ...

**32.** Прачытайце верш. Вызначце яго асноўную думку.

## Бяроза

Снежная пустэча.
Бель у вочы коле...
І адна бяроза —
Вартаўніца поля.

Легкадумны вецер
Між галін смяецца,
Хоча запалоніць
Белакосай сэрца.

Хоць бярозу вабіць
У даль начная зорка, —
Стыне, не пакіне
Роднага пагорка.

*Д. Бічэль.*

Выпішыце з тэксту па два словы: а) аднаскладовыя; б) двухскладовыя; в) трохскладовыя; г) чатырохскладовыя. Падзяліце іх на склады.



Правообладатель Национальный институт образования

## § 6. Націск

**33.** Прачытайце тэкст. Каму ён адрасаваны?

Некаторыя склады ў словах вымаўляюцца больш выразна, працягла і гучна. Гэтыя склады называюцца націскнымі. У беларускай мове націск свабодны. Ён можа па́даць на розныя склады ў словах:

на першы склад: ***ва́жна***, ... ;
другі склад: ***вячэ́ра***, ... ;
трэці склад: ***павуці́нне***, ... ;
чацвёрты склад: ***замацава́ны***, ... *(Паводле Л. Выгоннай).*

Вусна дапоўніце тэкст уласнымі прыкладамі (па 2-3 словы з рознымі націскнымі складамі).

**Націск** — больш гучнае і працяглае вымаўленне аднаго са складоў слова: *па-ня-дзе́-лак, аў-то́-рак, се-ра-да́.*

Галосны гук, на які падае націск, і склад з гэтым галосным называюцца **націскнымі**. Астатнія галосныя гукі і склады ў слове **ненаціскныя**.

**34.** Запішыце назвы месяцаў года, размяркоўваючы іх па групах у залежнасці ад месца націску: а) першы склад; б) другі склад; в) трэці склад. Назва якога месяца мае адзін склад?

Некаторыя беларускія словы адрозніваюцца ад адпаведных слоў рускай мовы месцам націску: бел. *дачка́* — рус. *до́чка*, бел. *мале́нькі* — рус. *ма́ленький*, бел. *лёгка* — рус. *легко́*, бел. *не́сці* — рус. *нести́* і інш.

**35.** Спішыце, пастаўце націск у словах. Праверце правільнасць выканання задання па арфаграфічным слоўніку.



Правообладатель Национальный институт образования

Рэмень, каршун, сантыметр, іскра, крапіва, вярба, імя, адзінаццаць, спіна, фартух, шкляны, каменны.

● З трыма словамі (на выбар) складзіце сказы (апавядальны, пытальны і пабуджальны).

**36.** Да кожнай схемы падбярыце 2-3 словы, запішыце.

Умоўныя абазначэнні: □ — націскны склад, □ — ненаціскны склад.

У з о р:  — *парасо́н, акія́н, паліто́*.



**37.** Прачытайце пары слоў. Складзіце з імі словазлучэнні.

Ка́са — каса́, па́ра — пара́, па́мяць — памя́ць, пла́чу — плачу́, буйны́ — бу́йны, а́тлас — атла́с.

Зрабіце вывад пра ролю націску ў мове.

**38.** Прачытайце тэкст. Прыдумайце яго пачатак (2-3 сказы).

— Дзядзечка, глядзіце пад ногі, лісічкі патопчаце! — закрычалі хлопчыкі.

Асцярожна ступаючы, я прайшоў крокаў сем і натрапіў на сямейку лісічак. Здавалася, што ў траве пахаваліся не лісічкі, а маленькія сонейкі. Доўга стаяў над імі і любаваўся, пакуль асмеліўся зрэзаць ножыкам.

У вёску вяртаўся з паўнюсенькім вядзерцам грыбоў. Ішоў і радаваўся, як малы. Вельмі хацелася, каб хто сустрэўся мне па дарозе *(Паводле Я. Галубовіча)*.

Выпішыце з тэксту па 2 словы з першым, другім і трэцім націскнымі складамі. Пастаўце націск у словах.



Правообладатель Национальный институт образования

## § 7. Правілы пераносу слоў (паўтарэнне)

**39.** Вусна прадоўжыце сказы.

1. Словы пераносяцца з аднаго радка на другі па … . 2. Склад з адной літары нельга … . 3. Пры пераносе слоў літары … не аддзяляюцца ад папярэдняй літары. 4. Пры пераносе слоў не раздзяляюцца спалучэнні літар … .

Якія з названых пунктаў правіл пераносу слоў можна праілюстраваць наступнымі прыкладамі: *бай-ка, са-джаць, ігол-ка, праў-да, паль-ма, на-дзея*?

**40.** Прачытайце табліцу. На кожны пункт правіл пераносу слоў прывядзіце ўласныя прыклады, запішыце.

| Правілы пераносу слоў | Прыклады |
|---|---|
| З аднаго радка на другі словы пераносяцца па складах | *пе-рамога, пера-мога, перамо-га* |
| Калі паміж галоснымі ёсць спалучэнне зычных, то пераносіцца на наступны радок або ўсё гэта спалучэнне, або любая яго частка | *га-рбуз, гар-буз, збо-жжа, збож-жа* |
| Нельга пакідаць або пераносіць на наступны радок адну літару | *асі-на, чы-тае, юнак* |
| Нельга раздзяляць пры пераносе спалучэнні літар ***дж*** і ***дз***, калі яны абазначаюць гукі [д͡ж], [д͡з], [д͡з’] | *гля-дзяць, гля-джу* |
| Спалучэнні ***дж*** і ***дз*** можна раздзяляць пры пераносе, калі ***д*** адносіцца да прыстаўкі, а ***з***, ***ж*** — да кораня | *пад-жаць, ад-звінець* |
| Ад папярэдняй літары не аддзяляюцца літары ***й***, ***ў***, мяккі знак і апостраф | *вай-на, поў-ны, кась-ба, пад’-ём* |



Правообладатель Национальный институт образования

**41.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак у форме пытальнага сказа.

Вылез з зямлі расточак, а на ім — два **доўгія** лісцікі. Потым **з'явілася** махнаценькая сцяблінка, а на ёй — лісцік з **пяццю** зубчыкамі. Сцяблінка пакрыта **тоненькімі** валасінкамі.

Расце сцяблінка, **таўсцее**, новыя лісцікі на ёй з'яўляюцца. Трэба сачыць, каб сцяблінкі не перапляталіся паміж сабой. Таму іх раскладваюць на градцы ў **розныя** бакі.

Вось на адной сцяблінцы кветачка расцвіла — вялікі жоўты званочак. Адцвіце кветачка, пялёсткі **ападуць**, а на сцяблінцы застанецца **маленькі** агурок[сн] *(Паводле С. Фядотавай)*.

Запішыце выдзеленыя словы, падзяляючы іх для пераносу.

Знайдзіце ў тэксце памяншальна-ласкальныя словы *(расточак, лісцікі, ...)*. З якой мэтай яны ўжываюцца аўтарам?

*расцвісці́*

**42.** Размяркуйце словы па групах:

а) словы, якія нельга падзяліць для пераносу;

б) словы, пры пераносе якіх магчымы толькі адзін варыянт;

в) словы, пры пераносе якіх дапускаюцца два варыянты.

Пошта, аб'езд, жыццё, пудзель, якар, алея, каўнер, унук, лічба, шайба, ідэя, месца.

**43.** Запішыце назвы гарадоў па-беларуску, падзяляючы іх на склады і для пераносу.

Волковыск, Жодино, Иваново, Заславль, Вилейка, Ивье, Марьина Горка.

Прывядзіце 2-3 прыклады назваў беларускіх гарадоў, якія нельга падзяліць для пераносу.



Правообладатель Национальный институт образования

**44.** Прачытайце тэкст. З якой мэтай ён напісаны?

На нашых палетках добра радзі́ў лён. Як цвіў, здавалася, блакітны.. азёры гайдаліся хвалямі. З пяшчотай дагл..далі в..скоўцы л..няныя палеткі. А калі прадавалі лён, яго ўсе хвалілі: «У вас не лён, а шоўк!» Далёка пайшла чутка пра м..сцовых іл..наводаў. Людзі цікавіліся: «Калі зноў прыв..зуць шоўкавы лён?» Вось і нарад..ілася назва вёскі — Шоўкавічы *(Паводле У. Ліпскага)*.

Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце словы, якія нельга падзяліць для пераносу.

Раскажыце пра паходжанне назвы вашай вёскі (горада).

## § 8. Галосныя гукі

**45.** Вусна адкажыце на пытанні.

Колькі галосных гукаў у беларускай мове? Назавіце іх.

Чаму яны атрымалі такую назву?

Які галосны гук не сустракаецца ў пачатку слоў беларускай мовы?

Якія галосныя гукі вымаўляюцца звычайна пад націскам?

**Галосныя гукі** ўтвараюцца з дапамогай голасу. Пры іх вымаўленні паветра праходзіць праз поласць рота свабодна, не сустракаючы перашкод.

У беларускай мове 6 галосных гукаў: [а], [о], [у], [ы], [і], [э]. Для іх абазначэння на пісьме выкарыстоўваецца 10 літар: ***а, о, у, ы, э, е, ё, і, ю, я***.



Правообладатель Национальный институт образования

**46.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып.



На гербе Жлобіна — **вялікая** парусная лодка. Даўней яна называлася ладдзя. Прыгожая, з надзьмутымі **ветразямі**, яна падобна да белага лебедзя з выгнутай **шыяй**.

Карабель **плыве** па ціхіх хвалях. А навокал — блакітны прастор, як неба і рачная вада. Бела-чорная ладдзя — сімвал вечнага падарожжа па жыцці з мінулага ў **будучыню** *(Паводле У. Ліпскага)*.

Назавіце ў выдзеленых словах галосныя гукі і літары, якімі яны абазначаны.

- Растлумачце пастаноўку працяжніка ў апошнім сказе тэксту.

Вусна апішыце герб вашага горада (вёскі, раённага цэнтра).

**47.** Спішыце словы, устаўляючы прапушчаныя літары. У дужках укажыце, якія гукі яны абазначаюць.

У з о р: *глеба* [э].

Д..бры, м..ккі, б..гаты, св..тлы, пр..гожы, с..р’ёзны, р..зкі, л..бімы, дал..кі, ш..рокі, цв..рды, бл..зкі.

Якія галосныя пішуцца пасля цвёрдых зычных, а якія — пасля мяккіх зычных?

- Да якой часціны мовы належаць прыведзеныя словы?
- Назавіце словы з супрацьлеглым значэннем.

**48.** Замяніце ў словах адзін галосны гук так, каб атрымалася новае слова. Запішыце словы парамі.

У з о р: *ціць* — *пець*.

Сын, лічыць, мара, вусень, крык, парог, коска, сталь, слова, рэчка.



Правообладатель Национальный институт образования

**49.** Запішыце па 3 назвы гарадоў або краін, якія пачынаюцца:
а) з галоснага гука *(Ашмяны, ...)*;
б) з літары, якая абазначае два гукі *(Ельск, ...)*.

**50.** Прачытайце тэкст. Назавіце словы, якія з'яўляюцца сродкамі сувязі сказаў.

### Смачная вада

Алёна імчалася да калодзежа. Ёй здавалася, што з першага пасля доўгай ночы вядра вада самая смачная. Дзяўчына з усмешкай даставала вядро з глыбокага калодзежа. Спярша Алёна гучна пацягвала губамі вадзіцу, прылёгшы грудзьмі на край вядзерца. Затым трымала ў роце некалькі хвілін, нібы смакавала, а пасля паціху глытала *(Паводле З. Бядулі)*.

Выпішыце з тэксту словы, у якіх тры галосныя гукі. Укажыце, на якія галосныя гукі падае націск.

У з о р: *Алёна* [о].

Якімі словамі вы апісалі б смак калодзежнай вады?

## § 9. Вымаўленне і правапіс галосных *о, э, а*

**51.** Прачытайце тэкст. Да якога тыпу ён належыць? Абгрунтуйце сваю думку.

### Белка і Зорка

Бабуля налівае ў даёнку цёплай вадзіцы і выходзіць на падворак:

— Белка, Зорка!

Кароўкі, выцягнуўшы шыі, бягуць да бабулі.

У Белкі галава пакрыта густымі шарсцінкамі. Вочы вялікія — па яблыку. Над імі ўзлятаюць чорныя вейкі, быццам крылы маладога шпачка. Шырокая грудзіна нібы перавязана



Правообладатель Национальный институт образования

белым ручніком, а на н**а**гах быццам светлыя шкарпэткі* — таму і Белка.

Зорка чырв**о**ная, як в**о**сеньскае неба на зах**а**дзе. Вочы прыг**о**жыя, ветлівыя. Р**о**жкі невялікія, светлыя, нібыта р**о**гі месяца-м**а**л**а**дзіка*. На лбе светлая плямка — вось і Зорка *(Паводле М. Бусько)*.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

Знайдзіце ў тэксце слова, што мае значэнне ‘пасудзіна, у якую дояць малако’.

**52.** Сфармулюйце правіла правапісу галосных ***о, э, а***, вусна запоўніўшы пропускі ў тэксце.

Літары … звычайна пішуцца пад націскам. Гукі [о], [э] не пад націскам пераходзяць у гук […]. Тады замест літар ***о, э*** пішацца … .

Праілюструйце правіла прыкладамі з тэксту «Белка і Зорка».

Літары ***о, э*** звычайна пішуцца пад націскам: *по́шта*, *дрэ́ва*.

Не пад націскам замест ***о, э*** пішацца ***а***: *паштальён*, *драўля́ны*.

**53.** Прачытайце верш. Вызначце яго тэму.

## Зорны дождж

Жнівень патыхае хлебам.  
Значыць,  
Не бывае бядзе.  
А са жнівеньскага неба  
**Ноччу** зорны **дождж** ідзе.



Правообладатель Национальный институт образования

Рассыпаюць іскры znічкі,
Стрымгалоў* на дол ляцяць.
Месяц **малады** з крынічкі
Ціха стаў **ваду** каўтаць*...
*В. Лукша.*

Знайдзіце ў вершы радкі, якімі можна растлумачыць сэнс прыказкі «Жнівеньскі дзень год корміць».

Да выдзеленых слоў падбярыце і запішыце такія аднакаранёвыя словы, каб назіралася чаргаванне галосных гукаў [о] — [а]. Падкрэсліце ў словах літары, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс галосных ***о, э, а***».

Чаму, на вашу думку, зорка, якая па́дае, называецца знічкай?

Падбярыце сінонім да слова *патыхае*.

**Арфаграма** — гэта напісанне, якое выбіраецца з некалькіх магчымых і патрабуе прымянення арфаграфічнага правіла або звароту да арфаграфічнага слоўніка.

Калі ў слове ёсць выбар варыянтаў напісання (***о*** ці ***а***, ***е*** ці ***я***, ***у*** ці ***ў***), значыць, ёсць і арфаграма.

Напрыклад, у слове ***вадзіца*** літара ***а*** з'яўляецца арфаграмай. Яе напісанне падпарадкоўваецца правілу: не пад націскам замест ***о*** пішацца ***а*** ***(во́дны — вадзі́ца)***.

**54.** Прачытайце словы, прыведзеныя ў табліцы.

| З лацінскай мовы | З грэчаскай мовы | З французскай мовы |
|---|---|---|
| эква́тар<br>тэрыто́рыя | эпо́ха<br>тэрмо́метр | энцыклапе́дыя<br>гардэро́б |

Чаму ў гэтых словах не пад націскам захоўваецца літара ***э***?


Правообладатель Национальный институт образования

У пачатку і ў сярэдзіне некаторых іншамоўных слоў не пад націскам вымаўляецца гук [э], пішацца літара ***э***: *экза́мен, экску́рсія, дэльфі́н, рэспу́бліка*. Правапіс такіх слоў трэба правяраць па слоўніку.

У словах славянскага паходжання (з рускай, украінскай, польскай і іншых моў) і ў словах, даўно запазычаных з неславянскіх моў (лацінскай, грэчаскай, французскай, італьянскай і інш.), не пад націскам пішацца літара ***а***: *жамчу́жына, а́драс, рамо́нт, сакрэ́т*.

Канцавыя ненаціскныя часткі ***-эр, -эль*** у іншамоўных словах перадаюцца як ***-ар, -аль***: *камп'ют**ар**, прынт**ар**, шніц**аль***.

Але ў імёнах і прозвішчах людзей, геаграфічных назвах захоўваюцца ***-эр, -эль***: *горад Манчэст**эр**, кампазітар Генд**эль***.

**55.** Прачытайце словы. На якой падставе яны аб'яднаны ў групы? Дапоўніце кожны слупок слоў уласнымі прыкладамі.

| | | |
|---|---|---|
| чарніцы | лідар | жэтон |
| сардэчны | кратар | рэцэпт |
| шаптаць | світар | эпідэмія |
| паштоўка | ордар | дэталь |

● Сярод прыведзеных слоў знайдзіце прыметнік. Складзіце з ім два словазлучэнні «прыметнік + назоўнік», каб прыметнік ужываўся ў прамым і пераносным значэннях.

**56.** Спішыце сказы, устаўляючы замест кропак літары ***о, э*** ці ***а***. Растлумачце правапіс слоў з прапушчанымі літарамі.

1. Парыў ветру рвануў з прыд..рожнай дзікай ігрушы хмару сч..рнелага лісця *(К. Чорны)*. 2. Віка ст..яла каля



Правообладатель Национальный институт образования

камп’ют..рнага ст..ліка *(А. Федарэнка)*. 3. Мы цярпліва сядзелі каля в..гнішча і чакалі старшага лейт..нанта *(І. Чыгрынаў)*. 4. Па рудаватай прыпяцкай в..дзе сярод палескіх б..лот бягуць два белыя кат..ры *(В. Казько)*. 5. Старажытныя тураўскія кавалі́ з ж..леза ўмелі зр..біць усё, што дазв..ляла зр..біць т..хналогія таго часу *(М. Ермакоў)*.

У некаторых словах са спалучэннямі літар ***ро, ло*** замест ***о*** не пад націскам пішацца літара ***ы***: *кро́ў — крыва́вы, гло́тка — глыто́к*, а таксама ў словах *яблык, яблыня, яблычны*.

У адпаведнасці з беларускім літаратурным вымаўленнем у некаторых іншамоўных словах пішацца літара ***ы***: *інжынер, канцылярыя, цырымонія, почырк, трывога* і інш.

**57.** Запішыце словы па-беларуску.

Хрестоматия, крошить, деревянный, инженер, кондитер, цена, лотерея, глотать, технический, трио, тревожный, черепаха, сольфеджио, яблоко, фломастер.

Падкрэсліце ў словах арфаграмы-галосныя.
Назавіце словы, у якіх літара ***я*** абазначае два гукі.

**58.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып. Запішыце, устаўляючы прапушчаныя літары.

## Ярыла

Веч..рам на п..горках г..рэлі яркія в..гнішчы, каб убачыў іх бог сонца Ярыла і завітаў у госці. Старэйшыя расказвалі м..ладым, што Ярыла нагадваў прыг..жага юн..ка. Куч..равы, светлав..лосы, у белым плашчы і на белым к..ні, б..санож



Правообладатель Национальный институт образования

ездзіць ён па свеце. На г..лаве ў Ярылы — вянок з п..лявых кветак. У левай руцэ — жменька жыта, у правай — па́ліца. Махне Ярыла жытам — ніва кол..сам м..цнее. Паліцай махне — гром гр..міць, дождж сыплецца.



А там, дзе м..лады прыг..жун Ярыла ступаў босымі н..гамі, густа к..ласілася жыта, каб ур..джаем аддзячыць руплівому сейбіту (*Паводле энцыклапедычнага слоўніка «Міфалогія беларусаў»*).

Вусна апішыце Ярылу, адлюстраванага на малюнку.

**59.** Выканайце тэставыя заданні па тэме «Правапіс галосных ***о***, ***э***, ***а***».

**60.** Да дзеяслова падбярыце назоўнікі, каб атрымаліся выразы з прыведзенымі значэннямі.

Д л я  д а в е д к і: *словы, слёзы, слінка*.

| Дзеяслоў | Назоўнік | Значэнне |
| --- | --- | --- |
| **гл..таць** | ? | ‘з зайздрасцю глядзець на што-небудзь спакуслівае, але недаступнае’ |
| | ? | ‘старацца стрымаць плач’ |
| | ? | ‘гаварыць неразборліва, невыразна’ |

Складзіце і запішыце сказ з адным выразам (на выбар).



Правообладатель Национальный институт образования

**61.** Выпішыце словы, у якіх прапушчана літара ***э***. Растлумачце іх правапіс.

Інж..нер, р..партаж, ж..ніх, р..спубліка, Юпіт..р, ч..мадан, ..підэмія, сц..нарый, пр..стыжны, тр..вога, р..клама, вет..ран, р..монт, прынт..р, ..нергія.

## § 10. Вымаўленне і правапіс галосных *е, ё, я*

**62.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль.

Растаў апошні, ужо брудны снег. Сонца, іграючы ў небе, яшчэ нясмела кідала на зямлю свае гарачыя промні, і тады ад зямлі падымалася лёгкая па́ра. Весела булькаючы, беглі, спяшаліся невядома куды мале́нькія ручайкі. Займаць драўляныя домікі, зробленыя для іх чалавекам, прыляцелі шпакі *(Г. Васілеўская)*.

Пракаменціруйце правапіс выдзеленых літар.

Растлумачце лексічныя значэнні слоў *па́ра* і *пара́*.

**63.** Устанавіце адпаведнасць паміж пунктамі правіла «Правапіс літар *е, ё, я*» і прыкладамі напісанняў.

| | |
|---|---|
| 1. У беларускай мове літара *ё* пішацца пад націскам. | а) белы — бялі́ць, лёд — лядо́вы |
| 2. У першым складзе перад націскам замест *е, ё* пішацца літара *я*. | б) цёплы, пялёстак |
| 3. У іншых ненаціскных складах *е* захоўваецца. | в) белава́ты, ледаві́к, во́сень |

Дапоўніце правіла прыкладамі з тэксту папярэдняга практыкавання.



Правообладатель Национальный институт образования

У першым складзе перад націскам замест ***е, ё*** пішацца літара ***я***: *дзевяць — дзявя́ты, несці — нясе́, цёмны — цямне́ць*.

У іншых ненаціскных складах ***е*** захоўваецца: *дзевятна́ццаць, вы́несці, цемнава́ты*.

**64.** Прачытайце тэкст. Якая карціна ўзнікае ў вашым уяўленні? Пра якіх «зялёных птушанятак» ідзе гаворка ў творы?

З разамлелых пупышак
Выпырхнулі неяк раніцою
Мільярды зялёных птушанятак.
Абселі яны галінкі
І залопалі кволенькімі крыльцамі —
Мусіць, хацелі зляцець на зямлю,
Ды збаяліся...
Так і засталіся яны на дрэвах сядзець да восені
І спяваць сваю зялёную песню...

*Я. Сіпакоў.*

Выпішыце з тэксту двухскладовыя словы з літарай ***я*** ў першым складзе перад націскам.

Назавіце гукі і літары ў слове *сядзець*.

**65.** Прачытайце словы, прыведзеныя ў табліцы.

| З лацінскай мовы | З грэчаскай мовы | З французскай мовы |
|---|---|---|
| л***е***-ге́н-да<br>м***е***-ло́-ды-я | м***е***-ду́-за<br>а-б***е***-лі́ск | г***е***-па́рд<br>б***е***н-зі́н |

Чаму ў гэтых словах у першым складзе перад націскам захоўваецца літара ***е***?



Правообладатель Национальный институт образования

Літара **е** захоўваецца ў першым складзе перад націскам у запазычаных словах пасля **г, к, х**: *гербáрый, кефíр, горад Херсóн*.

У многіх запазычаных словах літара **е** пішацца ў першым складзе перад націскам пасля іншых зычных: *спектáкль, берэ́т, элемéнт*.

**66.** Запішыце словазлучэнні па-беларуску.

Аппетитное печенье, весёлая мелодия, стебель герани, опередить бегуна, сезонный абонемент, поделить апельсин, периметр помещения.

Падкрэсліце арфаграмы, якія адпавядаюць правілу «Правапіс літар **е, ё, я**».

**67.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары. Растлумачце іх правапіс.

1. Праз адчыненую брамку Максім выйшаў на п..рон *(І. Чыгрынаў)*. 2. Прыд..рожныя в..тракі паволі махаюць услед нам шэрымі крыламі *(А. Васілевіч)*. 3. І толькі жаўранкі п..юць недзе ўгары, паміж з..лёнаю з..млёй і чыстым блакітам неба *(Я. Брыль)*. 4. В..рнуліся мы на станцыю каля дз..в..ці гадзін веч..ра *(В. Вольскі)*. 5. Набліжалася навальніца з б..с-концымі маланкамі і п..рунамі *(Г. Васілеўская)*.

Каранёвая літара **я** захоўваецца на пісьме незалежна ад націску: *цяжкі — цяжкавáты, мяккі — мяккавáты, свята — святкавáць; мéсяц, зáяц, пóяс, пáмяць, сýвязь, ты́сяча, дзéвяць, дзéсяць, Пры́пяць, Бéсядзь*.

Літара **я** пішацца ў паслянаціскных складах у некаторых суфіксах: *рóўнядзь, бóязь, дрóбязь, вéяць, сéяць, кáшляць*.



Правообладатель Национальный институт образования

**68.** Выпішыце словы ў наступным парадку:
а) літара ***я*** ў першым складзе перад націскам;
б) літара ***я*** каранёвая;
в) літара ***е*** не ў першым складзе перад націскам;
г) літара ***е*** ў першым складзе перад націскам.

Вас..мнаццаць, тыс..ча, ап..льсін, лял..чны, б..сконцы, сп..вак, г..рой, м..ккаваты, м..тал, по..с, ц..мнаваты, кол..р, н..дзеля, сув..зь, б..даваць, бал..рына.

● Да слова *бясконцы* падбярыце два аднакаранёвыя словы — назоўнік і дзеяслоў.

**69.** Напішыце зрокавы слоўнікавы дыктант па тэме «Правапіс галосных ***е, ё, я***».

Словы *не* і *без* заўсёды пішуцца з літарай ***е***: ***не спаў, не бачыць, без гальштука, без цукру***. У першым складзе перад націскам гук [э] у словах *не* і *без* вымаўляецца як [а]: [н’**а**] *спа́ў*, [н’**а**] *ба́чыць*, [б’**а**з] *га́льштука*, [б’**а**с] *цу́кру*.

**70.** Прачытайце выразы, захоўваючы нормы літаратурнага вымаўлення.

Не верыць сваім вушам, карона з галавы не зва́ліцца, не лезе ў рот, зімой снегу не выпрасіш, крукам носа не дастаць, у агні не гарыць і ў вадзе не тоне.

Якія з прыведзеных выразаў маюць наступныя значэнні:
а) ‘хто-небудзь вельмі фанабэрыцца, зазнаецца’;
б) ‘нічога асаблівага не здарыцца з кім-небудзь, чый-небудзь гонар не будзе закрануты’?
Складзіце і запішыце сказ з адным выразам (на выбар).


Правообладатель Национальный институт образования

**71.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары.



Пад м..стком да самых зам..р..зкаў н..чавалі дзве пары белых леб..дзяў, дзве с..м'і. На досвітку яны парамі вых..дзілі на бер..г, агладжвалі ч..рнымі дзюбамі гнуткія зм..іныя шыі, пляскалі крыламі — р..білі гімнастыку. Пры гэтым яны б..сконца гл..дзеліся ў в..ду і пераг..ворваліся на св..ёй мове.

— Ці добра я сёння выгл..даю? — пыталася ў мужа жонка-л..б..дзіха.

— Ты самая цудоўная ў свеце! — зад..волена адказваў муж-леб..дзь *(Паводле А. Васілевіч)*.

*до́світак*



Складзіце і запішыце дыялог другой пары лебедзяў.

**72.** Спішыце словы, размяркоўваючы іх па групах у залежнасці ад таго, якому правілу падпарадкоўваецца правапіс выдзеленых арфаграм.

Святкаваць, размясціцца, спектакль, лянок, легенда, Прыпяць, метро, весяліцца, зефір, сямнаццаць, Германія, сувязь, глядач, заяц.

## § 11. Вымаўленне і правапіс спалучэнняў *іё (ыё), ія (ыя), іе (ые)* у запазычаных словах

**73.** Прачытайце пары запазычаных слоў. Параўнайце вымаўленне выдзеленых спалучэнняў літар у рускай і беларускай мовах.

| | |
|---|---|
| киоск | кіёск |
| регион | рэгіён |



Правообладатель Национальный институт образования

| | |
|---|---|
| ф**ио**летовый | ф**ія**летавы |
| библ**ио**тека | бібл**ія**тэка |
| д**иа**гноз | д**ыя**гназ |
| олимп**иа**да | алімп**ія**да |

Які гук узнікае паміж галоснымі ў словах беларускай мовы?

У беларускай мове ў большасці запазычаных слоў паміж галоснымі ўзнікае ўстаўны гук [й], што передаецца на пісьме:

***ио*** → *праз* ***іё (ыё)*** пад націскам, ***ія (ыя)*** не пад націскам: *чэмп**іё**н — чэмп**ія**на́т, патр**ыё**т — патр**ыя**ты́чны*;

***иа*** → *праз* ***ія (ыя)*** незалежна ад націску: *ф**ія́**лка, д**ыя**ло́г*;

***ие*** → *праз* ***іе (ые)*** незалежна ад націску: *гіг**іе**ні́чны, д**ые́**та*.

На канцы запазычаных слоў спалучэнне ***ио*** передаецца праз ***іа (ыа)***: *тр**ыа**, Ток**іа***.

В ы к л ю ч э н н е: *рад**ыё***.

**74.** Прачытайце. Дакажыце, што гэта тэкст-разважанне.

У Петрыка не толькі галава была светлая, але і рукі залатыя. Ён мог адрамантаваць прас і рад**ыё**, веласіпед і матацыкл. Іграў на п**ія**ніна і на в**ія**ланчэлі, умеў прыгожа спяваць. Быў чэмп**іё**нам горада па плаванні. На школьным стад**ыё**не лепей за яго ніхто не гуляў у футбол і п**ія**нербол. Словам, усюды і ва ўсім Петрык паспяваў, паказваў спрыт, дасягаў поспехаў *(Паводле Б. Сачанкі)*.

Пракаменціруйце правапіс выдзеленых спалучэнняў літар.

Растлумачце сэнс выразаў *светлая галава, залатыя рукі*.



Правообладатель Национальный институт образования

**75.** Спішыце словы, устаўляючы прапушчаныя літары.

Глады..лус, мемары..л, бі..графія, тры.., калекцы..нер, пацы..нт, атракцы..н, ініцы..тыва, аві..цыя, вары..нт, сальфеджы.., клі..нт, пі..нер, пенсі..нер, серы..л.

Сярод прыведзеных слоў знайдзіце слова, якое мае значэнне 'паветраны флот'. Назавіце гукі і літары ў гэтым слове.

**76.** Разгадайце крыжаванку па тэме «Правапіс спалучэнняў ***іё (ыё), ія (ыя), іе (ые)*** у запазычаных словах».

**77.** Прачытайце тэкст. Паходжанне якога выразу раскрываецца ў ім? Растлумачце значэнне гэтага выразу.

У легендарнага цара вострава Крыта Мінаса была дачка Арыядна. Пакахаўшы афінскага героя Тэсея, яна выратавала яго ад смерці. Мінас перыядычна атрымліваў ад афінян жахлівую даніну — сем юнакоў і сем дзяўчат, якіх у падзямельным лабірынце знішчаў напаўбык-напаўчалавек Мінатаўр. Тэсей вырашыў забіць Мінатаўра. Каб каханы мог выбрацца з лабірынта, Арыядна спецыяльна дала яму з сабой клубок з ніткамі *(Паводле І. Шпадарука, В. Рудакоўскага)*.

Выпішыце з тэксту словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс спалучэнняў ***іё (ыё), ія (ыя), іе (ые)*** у запазычаных словах». Падкрэсліце гэтыя арфаграмы.

***лабіры́нт***

**78.** Прачытайце тэкст. Ці згодны вы з думкай, выказанай Цыцэронам?

«Самае галоўнае ўпрыгожанне — чыстае сумленне», — вучыў рымскі аратар* Цыцэрон. Гэта ўпрыгожанне нельга параўнаць з найкаштоўнейшымі брыльянтамі.

Цікавы прыклад пошуку сумленнага чалавека звязаны з біяграфіяй мудраца Дыягена. Ён хадзіў па Афінах сярод дня



Правообладатель Национальный институт образования

з запаленым ліхтаром і гаварыў, што шукае чалавека. Відаць, Дыяген добра ўсведамляў, што сапраўдная чалавечнасць кіруецца сумленнем.

В..лікі палкаводзец Ал..ксандр Мак..донскі аднойчы ўбачыў Дыягена, які адпачываў у бочцы: імкнуўся да прыроднай пр..статы́. Ал..ксандр прапанаваў мудр..цу выказаць любую просьбу. І пачуў у адказ: «Адыдзі, ты засл..няеш мне сонца». На гэтыя словы заваёўнік вым..віў: «Калі б я не быў Ал..ксандрам Мак..донскім, я х..цеў бы быць Ды..генам» *(Паводле Э. Збароўскага)*.

Спішыце апошні абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары.

● Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай.

## § 12. Зычныя гукі

**79.** Прачытайце тэкст. Сфармулюйце яго асноўную думку.

Зычныя гукі ўтвараюцца пры праходжанні паветра праз перашкоду ў поласці рота. Такой перашкодай могуць быць губы, зубы, язык. Удзел губ ва ўтварэнні гукаў своеасабліва адзначаны ў прыказках: «Выказанага слова да губы не вернеш», «Губа ні ў кога не замкнёна», «Няма тае хусты, каб завязаць людзям вусны». Зразумела, што сэнс гэтых выразаў больш шырокі. Але словы *язык, губы, рот* ужываюцца ў народных выслоўях таму, што яны абазначаюць органы моваўтварэння: «Жыве на канцы языка», «На чужы рот гузіка не нашыеш» *(Паводле Л. Выгоннай)*.

Як утвараюцца зычныя гукі?

Растлумачце сэнс прыведзеных у тэксце выслоўяў.

● Складзіце 2 словазлучэнні са словам *вусны*, каб у адным яно ўжывалася як назоўнік, а ў другім — як прыметнік.



Правообладатель Национальный институт образования

**80.** Прачытайце тэкст. З якой мэтай ён напісаны?

Па Лельчыцкім **раёне** працякае вялікая рака Убарць. Каб разгадаць яе назву, трэба ведаць слова **борць.**

Борць — гэта вулей для **дзікіх** пчол. Ён **уяўляў** сабой дупло ў дрэве або выдзеўбаную калоду. Была і **прафесія** — бортнік. Гэты чалавек рыхтаваў борці, вывешваў іх на дрэвах па берагах ракі. Казалі: «Рака ў борцяў». Значыць, каля борцяў. Вось і **пайшла** назва ракі Убарць *(Паводле У. Ліпскага)*.

Назавіце ў выдзеленых словах зычныя гукі і літары, якімі яны абазначаны.

***раён***

Падбярыце сінонім да слова *бортнік*.

**81.** Лічыцца, што ў параўнанні з галоснымі гукамі зычныя больш інфармацыйныя. Па іх лягчэй пазнаць слова: [п..др..чн’..к] — *падручнік*, [зв..н..ч..к] — *званочак*. Пазнайце словы па прыведзеных зычных гуках, запішыце.

[к..см..н..ўт], [кр..н’..ц..], [в’..р..б’..й], [п..д..р..жн’..к], [р..м..н..к], [п..ртф’..л’], [в’..л..с’..п’..т], [ст..д..й..н].

Якое з запісаных вамі слоў можа абазначаць і чалавека, і расліну?

**82.** Замяніце ў словах адзін зычны гук так, каб атрымалася новае слова. Запішыце словы парамі.

Дровы, раса, каліна, кефір, педаль, шоўк, паром, грэлка.

Якому правілу падпарадкоўваецца правапіс слоў *кефір, педаль*?

**83.** Прачытайце тэкст. Назавіце словы, з дапамогай якіх апісваюцца рухі птушак. Да якой часціны мовы адносяцца гэтыя словы?

На бярозе сядзелі дзве сарокі. Нібы на арэлях*, птушкі гойдаліся на доўгай галінцы. Адна з сарок узмахвала крыламі,



Правообладатель Национальный институт образования

губляла раўнавагу, рэзка сакатала і кулялася з галінкі. А на яе месца адразу ж садзілася і гойдалася на галінцы другая *(Паводле Я. Галубовіча).*

Выпішыце з тэксту словы, у якіх тры зычныя гукі. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць зычныя гукі.

Вусна перакажыце тэкст.

**84.** Запішыце па 3 назвы беларускіх гарадоў, якія пачынаюцца:
а) з зычнага гука *(Рагачоў, ...)*;
б) са спалучэння зычных гукаў *(Пружаны, ...)*.

## § 13. Глухія, звонкія і санорныя зычныя. Іх вымаўленне і правапіс

**85.** Прачытайце пары слоў.

Рыбка — рыба́к, снег — снегапад, жолуд — жалуды, указка — указваць, дождж — дажджлівы, дзядзька — дзядзечка, Нясвіж — у Нясвіжы.

Якія звонкія і глухія гукі абазначаюць выдзеленыя літары (спалучэнні літар)?




Узор адказу. *Літара **б** абазначае звонкі гук* [б] *(рыба́к), глухі гук* [п] *(рыбка).*

Паводле ўдзелу голасу і шуму зычныя гукі падзяляюцца на звонкія, глухія і санорныя.

Пры ўтварэнні **санорных** зычных пераважае голас, пры ўтварэнні **звонкіх** — шум. **Глухія** зычныя ўтвараюцца толькі з шуму, без удзелу голасу.



Правообладатель Национальный институт образования

Большасць звонкіх і глухіх зычных утварае пары:

| звонкія | [б] | [б’] | [г] | [г’] | [д] | [ж] | [з] | [з’] | [д͡ж] | [д͡з] | [д͡з’] |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| глухія | [п] | [п’] | [х] | [х’] | [т] | [ш] | [с] | [с’] | [ч] | [ц] | [ц’] |

Глухія зычныя [к], [к’], [ф], [ф’] не маюць парных звонкіх.

Санорныя зычныя [в], [в’], [л], [л’], [м], [м’], [н], [н’], [р], [ў], [й] не маюць парных глухіх.

**86.** Прачытайце тэкст. Назавіце словы, якія з’яўляюцца сродкамі сувязі сказаў.

**Беларусь** ма́е падземныя рэкі і ручаі. Ма́е **вялікія** азёры пад зямлёю. Гэта прыродныя сховішчы чыстай **пітной** вады. А мінеральныя крыніцы — невычарпальнае багацце нашага **здароўя** і сілы *(Паводле Я. Сіпакова)*.

Назавіце зычныя гукі ў выдзеленых словах. Вусна дайце характарыстыку зычных паводле ўдзелу голасу і шуму.

У з о р: *гук* [дз’] *звонкі, парны*.

**87.** Дапішыце па 2 назвы рэк або азёр Беларусі, якія пачынаюцца:
а) з санорнага зычнага гука *(Нёман, ...)*;
б) са звонкага зычнага гука *(Бярэзіна, ...)*;
в) з глухога зычнага гука *(Свіцязь, ...)*.

**88.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму.

Ч..рны хлеб робяць з жыта, таму ён і называецца жытні.

Жыта падобна да пш..ніцы, але ёсць і розніца. Кол..с пш..ніцы т..ўсцейшы, а жыта — т..нчэйшы. Пш..нічнае з..рнятка круглаватае, а жытняе — выц..гнутае.



Правообладатель Национальный институт образования

Жыта, як і пш..ніца, расце на полі. Увосень яго жнуць, вым..лочваюць з к..лосся зерне і мелюць на млыне. Толькі мука з жыта не такая белая, як пш..нічная *(Паводле С. Фядотавай)*.

Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары. У словах апошняга абзаца падкрэсліце літары, якія абазначаюць глухія зычныя гукі.

Знайдзіце ў тэксце антонімы. Да якой часціны мовы яны належаць?

**89.** Прачытайце прыказкі. Якая рыса характару беларусаў адлюстроўваецца ў іх?

1. Хто полю годзіць, у таго жыта родзіць. 2. Жнівень сее, жне і косіць — на сталах багацця досыць. 3. Хто ў жніўні гуляе, той узімку галадае. 4. Калі хочаш хлеба мець, трэба зямліцу глядзець. 5. Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы.

Спішыце сказы. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць звонкія зычныя гукі.

**90.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак, выкарыстаўшы словы з тэксту.

Таня прыехала на летнія канікулы да бабулі ў Беларусь з Вялікага Ноўгарада. Дзяўчына з задавальненнем памяняла душны горад на маляўнічы кут на Віцебшчыне.

Вёска Казакі, што стужкай раскінулася на беразе Дзісны, сіратліва сустрэла госцю. Ад былой школы тут застаўся толькі падмурак, які вылучаўся з нізкай травы ў цені кучаравых бяроз. Побач рос сад, ён яшчэ пладаносіў. На рэдкіх галінках віселі няспелыя яблыкі[сн] *(Паводле М. Кукуця)*.

Растлумачце правапіс выдзеленых літар.



Правообладатель Национальный институт образования

**91.** Вусна адкажыце на пытанні, прывядзіце прыклады.

Як вымаўляюцца звонкія зычныя перад глухімі ў сярэдзіне слова, на канцы слова?

Як вымаўляюцца глухія зычныя перад звонкімі ў сярэдзіне слова?

Як праверыць правапіс літар, што абазначаюць звонкія і глухія зычныя гукі?

Звонкія зычныя перад глухімі і на канцы слова вымаўляюцца глуха (аглушаюцца): *градка* — гра[т]ка, *хлеб* — хле[п].

Глухія зычныя перад звонкімі вымаўляюцца звонка (азванчаюцца): *просьба* — про[з’]ба, *малацьба* — мала[дз’]ба, *лічба* — лі[дж’]ба.

Каб праверыць правапіс літар, што абазначаюць звонкія і глухія зычныя гукі, трэба падабраць аднакаранёвае слова або змяніць слова так, каб пасля зычнага стаяў галосны ці санорны гук: *хлеб* — *хлебны*, *градка* — *градак*, *просьба* — *прасіць*, *малацьба* — *малаціць*, *лічба* — *лічыць*.

Правапіс слоў, у якіх напісанне звонкіх і глухіх зычных нельга праверыць, вызначаецца па слоўніку: *экзэмпляр, бейсбол, анекдот*.

**92.** У кожнай пары вызначце праверачнае слова. Запішыце пары слоў так, каб на першым месцы было праверачнае слова, на другім — слова з арфаграмай «Правапіс звонкіх і глухіх зычных».

У з о р: *жалуды* — *жолуд*.

Касьба — касіць, цяжар — цяжкі, выгрузіць — выгрузка, бяздоказны — доказ, закупка — закупіць, замазаць — замазка, мыш — мышаня.



Правообладатель Национальный институт образования

**93.** Пракаменціруйце правапіс слоў. Выпішыце, раскрываючы дужкі, словы, у якіх напісанне звонкіх і глухіх зычных нельга праверыць.

Перахо*(д/т)*, ай*(з/с)*берг, пля*(ж/ш)*, баске*(д/т)*бол, сце*(ш/ж)*ка, гола*(з/с)*, паро*(х/г)*, ва*(г/к)*зал, фу*(д/т)*бол, бера*(г/х)*, перака*(з/с)*, э*(к/г)*замен, лістапа*(д/т)*, мола*(дз/ц)*ь, ала*(т/д)*кі.

**94.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс звонкіх і глухіх зычных». Растлумачце іх напісанне.

## Няпрошаны госць

Дзед расказаў унуку пра адну нечаканую сустрэчу з касалапым.

Старога заспела залева, і ён схаваўся ў вялікае дубовае дупло. Ліў дождж, было цемнавата. Раптам у дупло сунулася нешта касматае. Дзед сцяўся. Цяжкі мядзведзь так яго прыціснуў, што немагчыма было дыхаць. Касалапы зручна ўмясціўся ў дупле. Але старому адпачываць не было як. Трэба было знайсці каня, які пасвіўся на лузе. Як вылезці і не патрывожыць няпрошанага госця?

Доўга дзед думаў, а тады як крыкне! І спалоханы мядзведзь рэзка выскачыў з дупла *(Паводле В. Быкава)*.

Знайдзіце ў тэксце слова, што мае значэнне ‘заліўны дождж, лівень’.

Якія словы выкарыстоўвае аўтар, каб пазбегнуць паўтарэння слоў *дзед, мядзведзь*?

Пісьмова перакажыце тэкст.

**95.** Прачытайце прыказкі. Якой тэмай яны аб’яднаны?

1. Госця вясною частуюць мя[т]ком, а ўвосень — малачком. 2. Няпрошанаму госцю лы[ш]кі няма. 3. Дарагі не абе[т],



Правообладатель Национальный институт образования

а прывет. 4. Госць першы дзень — золата, другі — серабро, а трэці — ме[ц’]ь, хоць і дадому е[ц’]ь. 5. Каб у хляве — парсюк гла[т]кі, а на стале — каб смачныя ала[т]кі. 6. За стол не спяшайся, з-за стала — не мару[ц’]ь.

Запішыце сказы згодна з арфаграфічнымі нормамі.

Падрыхтуйце вуснае выказванне на тэму «Дарагі не абед, а прывет».

## § 14. Свісцячыя і шыпячыя зычныя. Іх вымаўленне і правапіс

**96.** Прачытайце вершы. З дапамогай якіх гукаў у першым тэксце перадаецца скрып снегу, а ў другім — шум на шашы?

**I.**

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.

*М. Багдановіч.*

**II.**

Штохвіліны на шашы
Шумна, як на кірмашы.
Шоргат,
Шорах,
Шум птушыны.
За машынаю машына.

*Р. Барадулін.*

Зычныя гукі [з], [з’], [с], [с’], [д͡з], [д͡з’], [ц], [ц’] называюцца **свісцячымі**, а гукі [ж], [ш], [д͡ж], [ч] — **шыпячымі**.



Правообладатель Национальный институт образования

**97.** Прачытайце сказы. Параўнайце вымаўленне і напісанне выдзеленых слоў.

| | |
|---|---|
| 1. Па *дарожцы* да аэрадрома ішла жанчына *(Л. Арабей)*. | па даро[с]цы |
| 2. У спякотныя дні Таня з мясцовай дзятвой бавіла час на *рэчцы (М. Кукуць)*. | на рэ[ц]цы |
| 3. *Расчырванелая* дзятва бесперапынна бегала ў найбліжэйшую хату папіць вады *(Э. Збароўскі)*. | ра[ш]чырванелая |
| 4. Нямала палос ужо *зжата* зусім, на другіх жыта яшчэ млее маленькімі і большымі ку́памі *(І. Мележ)*. | [ж]жата |

Як вымаўляюцца шыпячыя гукі перад свісцячымі, свісцячыя — перад шыпячымі?

Шыпячыя зычныя гукі перад свісцячымі вымаўляюцца як свісцячыя: *у вёсачцы* — у вёса[ц]цы, *стараешся* — старае[с’]ся. Свісцячыя зычныя гукі перад шыпячымі вымаўляюцца як шыпячыя: *пясчаны* — пя[ш]чаны, *грузчык* — гру[ш]чык.

Каб праверыць правапіс літар, што абазначаюць шыпячыя і свісцячыя зычныя гукі, патрэбна падабраць аднакаранёвае слова або змяніць слова так, каб зычны вымаўляўся выразна: *у вёсачцы — вёсачак, пясчаны — пясок, грузчык — грузіць.*

**98.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тэму.

Хлеб рашчынялі ў дзежцы на вадзе, улівалі пару літраў хлебнага квасу, сыпалі крыху мукі і размешвалі. Калі на другі дзень рошчына* ўгрэецца, дадавалі яшчэ мукі і мясілі. З цеста, якое ўзыходзіла, рабілі буханкі, клалі на драўляную



Правообладатель Национальный институт образования

лапату, засланую капуснымі ці кляновымі лістамі, пяклі ў напаленай пе**ч**цы. Вымаць хлеб трэба было своечасова, каб не падгарэў. І вось вялікія буханкі ляжаць на лаве — стынуць. Нарэ**ш**це можна каштаваць *(Паводле У. Гніламёдава)*.

***нарэ́шце***

Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

Да дзеясловаў *рашчыняць, расчыняць* падбярыце назоўнікі, якія падыходзяць па сэнсе. Словазлучэнні запішыце.

У прыназоўніках ***з, без, праз, паўз, цераз*** гук, які перадаецца літарай ***з***, перад шыпячымі зычнымі вымаўляецца як шыпячы: *пірог з журавінамі* — пірог [ж] журавінамі; *без шапкі* — [б’аш] шапкі; *праз чатыры гадзіны* — [праш] чатыры гадзіны.

Спалучэнні ***шс, жс*** паміж галоснымі вымаўляюцца як падоўжаны мяккі гук [с̄’]: *клапоцішся* — клапоці[с̄’а], *не парэжся* — не парэ[с̄’а].

**99.** Прачытайце беларускія прыказкі згодна з нормамі літаратурнага вымаўлення. Устанавіце адпаведнасць паміж беларускімі і рускімі прыказкамі.

1. Здалёк мёду не наліжа..ся.
2. Паквапі..ся на вялікае, то і малое згубіш.
3. І печанае рэдзькі з’ясі, калі выгаладае..ся.
4. Розуму не набярэ..ся, калі з дурнем павядзе..ся.

---

а) За двумя зайцами погонишься, ни одного не поймаешь.
б) Голод не тётка, пирожка не подсунет.
в) С кем поведёшься, от того и наберёшься.
г) Без труда не вытащишь и рыбку из пруда.

Запішыце беларускія прыказкі, устаўляючы прапушчаныя літары.

**100.** Выканайце тэставыя заданні па тэме «Правапіс глухіх, звонкіх і санорных, свісцячых і шыпячых зычных».



Правообладатель Национальный институт образования

**101.** Запішыце назоўнікі ў форме давальнага склону адзіночнага ліку. Падкрэсліце спалучэнні літар, якія абазначаюць свісцячыя зычныя гукі. У квадратных дужках укажыце, якія гукі яны абазначаюць.

У з о р: *дарожка* — *дарожцы* [*сц*].

Хустачка, стужка, усмешка, грэчка, дошка, кніжка, ножка, сцежка, талерачка, крынічка.

- Да якога скланення — 1, 2 ці 3-га — адносяцца гэтыя назоўнікі?

## § 15. Цвёрдыя, мяккія і зацвярдзелыя зычныя. Іх вымаўленне і правапіс

**102.** Прачытайце пары слоў.

Зычны — зімовы, сэрца — серп, пульт — пюрэ, мост — мёд, васілёк — вясна, лыжка — льдзіна.

Чым адрозніваюцца першыя гукі кожнай пары слоў?
З дапамогай якіх літар абазначаецца мяккасць зычных на пісьме?

У беларускай мове адрозніваюць **цвёрдыя** і **мяккія** зычныя гукі. Большасць з іх утварае пары:

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| цвёрдыя | [б] | [в] | [г] | [д] | [з] | [к] | [л] |
| мяккія | [б’] | [в’] | [г’] | [д͡з’] | [з’] | [к’] | [л’] |
| цвёрдыя | [м] | [н] | [п] | [с] | [т] | [ф] | [х] |
| мяккія | [м’] | [н’] | [п’] | [с’] | [ц’] | [ф’] | [х’] |

Не маюць пар **зацвярдзелыя** зычныя [ж], [ш], [д͡ж], [ч], [р], [ц], цвёрды гук [ў] і мяккі [й].

Мяккасць зычных на пісьме абазначаецца з дапамогай літар ***е, ё, ю, я, і***, а таксама мяккага знака.



Правообладатель Национальный институт образования

**103.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго тып.

## Лесавік

Вельмі даўно людзі даведаліся, што Лесавік мае дзівосныя скарбы, і згаварыліся імі завалодаць. Усе лясы і пушчы перакапалі, шукаючы багацце. Не стала куды прытуліцца беднаму Лесавіку. Пашкадаваў яго куст чарнічніку, схаваў ляснога ўладара і яго скарбы пад сваімі галінкамі. Людзі не заўважылі маленькі чарнічнік побач з магутнымі ялінамі і соснамі.

З таго часу Лесавік клапоціцца пра чарніцы, рассяляе іх па лясных абшарах *(Паводле У. Ягоўдзіка)*.

Выпішыце з тэксту 5 слоў з зацвярдзелымі зычнымі гукамі. Падкрэсліце літары, якія іх абазначаюць.

- Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы да слова *Лесавік*.

Прачытайце назвы міфічных істот: *вадзянік, пушчавік, багнік, палявік, дамавік, хлеўнік, лазнік*. Дзе, згодна з народнымі вераваннямі, яны жывуць?

**104.** Прачытайце пары слоў, звяртаючы ўвагу на вымаўленне свісцячых зычных.

Зманіць [з] — змяніць [з'], разбагацець [з] — разбягацца [з'], слова [с] — сліва [с'], расцаніць [с] — расцягнуць [с'].

Як вымаўляюцца свісцячыя зычныя перад цвёрдымі зычнымі? Перад мяккімі зычнымі?

Свісцячыя зычныя перад мяккімі зычнымі вымаўляюцца мякка: *снег* [с'], *цвік* [ц'], *позні* [з'], *подзвіг* [дз'].

Але перад гукамі [г'], [к'], [х'] свісцячыя вымаўляюцца цвёрда: *скінуць* [с], *разгінаць* [з], *схема* [с].



Правообладатель Национальный институт образования

**105.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак, які перадаваў бы асноўную думку тэксту.

Сонца па**с**пела ўжо абцалаваць зямлю пасля зменлівай зімы, якая то заходзілася завірухамі, то **с**цякала капяжамі* са зледзянелых дахаў. Толькі цяпер гэта было ўжо ў мінулым. А зараз цёплы май млее ў сонечных промнях. Прастрэльвалі на бярозках першыя ня**с**мелыя лі**с**цікі. Яшчэ дзень-два — і зазелянеюць вершаліны беластволых дрэў.

Прырэчны лес, гаі патанулі ў птушыных **с**певах.[сн] Усё ажыло, усё жыло, усё хацела жыць *(Паводле А. Казлова)*.

Якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары?

Выпішыце з тэксту 3 дзеясловы, ужытыя ў пераносным значэнні. Падкрэсліце ў іх літары, якія абазначаюць мяккія зычныя гукі.

**106.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып.

Стол быў накрыты пад белы настольнік. Закускі гарэлі агнём. Ірдзелі познія ябл..кі і свежыя п..мідоры. Каля іх — смажаныя і марынаваныя гры..кі, у якіх таіўся лес. І не верылася, што гэтыя гры..кі на ст..ле, а не пад хвойкаю ці бяро..каю. Утыркні іх, здаецца, у л..сны п..сок — пачнуць расці *(Паводле В. Казько)*.

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары.

Падкрэсліце словы, у якіх свісцячыя зычныя перад мяккімі зычнымі вымаўляюцца мякка.

Знайдзіце ў тэксце сінонім да слова *абрус*.

**107.** Выпішыце словы, у якіх усе зычныя гукі мяккія.

Сінявокі, кіпень, ускіпець, цвісці, зелянець, няспелы, песня, свістаць, здзівіць, пацвердзіць, здзейсніць, схіліць, лісце, мясціна.



Правообладатель Национальный институт образования

# § 16. Мяккі знак і апостраф

## Змякчальны мяккі знак

**108.** Прачытайце словы. Як вымаўляюцца апошнія зычныя гукі ў гэтых словах?

Гомель, Лепель, Свіцязь, Любань, Капыль, Смаргонь, Скідзель.

Чаму мяккі знак на канцы гэтых слоў называецца змякчальным? Выходзячы з сэнсу слоў, знайдзіце сярод іх лішняе.

**Змякчальны мяккі знак** п і ш а ц ц а для абазначэння мяккасці зычных гукаў [з’], [с’], [дз’], [ц’], [л’], [н’]:

- на канцы слова: *далон**ь**, чытац**ь**, кавал**ь***;
- пасля мяккага зычнага перад цвёрдым: *бац**ь**ка, кас**ь**ба, дз**ь**мухавец*;
- перад мяккім зычным, які пры змене слова або падборы аднакаранёвага слова чаргуецца з цвёрдым: *ц**ь**мяны — ц**ь**ма, піс**ь**меннік — піс**ь**мо*;
- пасля мяккага [л’] перад цвёрдым або мяккім зычным: *бул**ь**ба, тол**ь**кі, бол**ь**ш*.

**109.** Прачытайце тэкст. Раскрыццю якой думкі ён падпарадкаваны?

### Летняя раніца

Напачатку жніўня, пад раніцу, Лявон колькі разоў выходзіў у поле паслухаць, як у мяккай цішыні спее, наліваецца сокам і цвярдзее жытні колас. Якая гэта прыгожая пара́! Цьмянеюць і гаснуць зоркі, хаваючыся ў зіхоткіх промнях ранішняга сонца. Падаю́ць галасы світальныя птушкі, рыхтуючыся да дзённых клопатаў. Белаватае сонца павольна ўзнімаецца над даляглядам.



Правообладатель Национальный институт образования

Летняя раніца заўсёды падымала настрой, і дадому Лявон прыходзіў бадзёры і ўраўнаважаны *(Паводле У. Гніламёдава)*.

Пракаменціруйце правапіс слоў са змякчальным мяккім знакам.

● Выпішыце з тэксту клічны сказ. Падкрэсліце ў ім словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае.

**Змякчальны мяккі знак** н е  п і ш а ц ц а:

● пасля літар, якія абазначаюць зацвярдзелыя зычныя: *дож**дж**, но**ч**, мы**ш***;

● пасля літар ***б, м, п, в, ф, д, т***: *голу**б**, стэ**п**, жолу**д***;

● пасля ***з, с, дз, ц*** перад мяккімі зычнымі, калі пры змяненні слова або падборы аднакаранёвага слова абодва зычныя застаюцца мяккімі або становяцца цвёрдымі: *свята — святочны, дзве — два, лазня — у лазні*;

● паміж падоўжанымі зычнымі: *карэнне, Купалле, двукоссе*.

**110.** З апорай на схему растлумачце, як праверыць напісанне мяккага знака ў сярэдзіне слова перад мяккім зычным.

ЦІ ПІШАЦЦА МЯККІ ЗНАК У СЯРЭДЗІНЕ СЛОВА ПЕРАД МЯККІМ ЗЫЧНЫМ?

↓

змяніць слова або падабраць аднакаранёвае слова

↓ / ↓

наступны мяккі зычны змяніўся на цвёрды, а папярэдні — застаўся мяккім → мяккі знак пішацца

абодва зычныя засталіся мяккімі або сталі цвёрдымі → мяккі знак не пішацца



Правообладатель Национальный институт образования

**111.** Напішыце зрокавы слоўнікавы дыктант па тэме «Правапіс мяккага знака».

**112.** Прачытайце верш. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку тэксту?

## Лета

Сонейкам багата лета,
Морам кветак, муравы.
Лета — казка! Лета — гэта
Свята неба, сінявы.

Лета — звон жамчужных росаў,
Свежасць ягад і грыбоў,
Водар чэрвеньскіх пакосаў,
Водар ліпеньскіх стагоў.

*В. Жуковіч.*

Знайдзіце ў вершы словы, у якіх літара ***с*** абазначае мяккі гук [с’].

Вывучыце на памяць другую страфу* верша. Запішыце па памяці, выканайце самаправерку.

Вусна прадоўжыце рад прыметнікаў, якімі можна ахарактарызаваць водар лета: *духмяны, мядовы, смалісты, сунічны, хваёвы...*

**113.** Прачытайце тэкст, вызначце яго тэму. Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы.



Хлопец разв..заў мех і высыпаў на падлогу бурштын. Карычн..вай віл..гаццю мя..ка ўдарыла ў вочы. Быў тут і м..довы колер, і чырв..настаты, і агністы, як кл..новае ліс..це восен..ню.

Кн..зёўна ас..цярожна ўзяла з..лацістую г..рошыну, паднесла да в..чэй.



Правообладатель Национальный институт образования

У самай с..рцавіне схаваўся вусаценькі жучок. Падалося, блішчыць ягонае вочка — малюсен..кая кропел..ка, іскрынка сон..чнага с..вятла.

Кол..кі людскіх пакален..няў знікла ў полымі часу! А мален..кі жучок, схаваўшыся ў кавалак бурштыну, гл..дзіць адтуль на людзей і як бы нешта хоча сказаць ім *(Паводле Л. Дайнекі)*.

Спішыце, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

Падкрэсліце прыметнікі — назвы колераў. Выкарыстоўваючы іх, падрыхтуйце пісьмовае выказванне на тэму «Колеры бурштыну».

**114.** Спішыце прыказкі, устаўляючы, дзе трэба, мяккі знак.

1. З твару белен..кі, але розум беднен..кі.
2. Золата і ў балоце с..веціцца.
3. Верасок і ў цян..ку зац..вітае.
4. Па адзен..ні пан, а па розуму баран.
5. Хоць кашуля чорная, але сумлен..не чыстае.

Вусна аб'яднайце блізкія па значэнні прыказкі ў пары.

## Раздзяляльны мяккі знак і апостраф

**115.** Прачытайце словы. Які гук вымаўляецца пасля выдзеленых літар?

| | |
|---|---|
| паві**л**ьён | надво**р**'е |
| І**л**ьіч | а**б**'ява |
| **л**ьюцца | **п**'юць |

Пасля якіх зычных — цвёрдых ці мяккіх — пішацца раздзяляльны мяккі знак? Апостраф?

Якія гукі абазначаюць літары ***е, ё, ю, я, і*** пасля раздзяляльнага мяккага знака і апострафа?



Правообладатель Национальный институт образования

**Раздзяляльны мяккі знак** п і ш а ц ц а пасля мяккіх зычных перад літарамі ***е, ё, ю, я, і***, калі яны абазначаюць два гукі: [йэ], [йо], [йу], [йа], [йі]: *льецца, шампіньён, Ілья, Ульяна*; але: *булён*.

**Апостраф** п і ш а ц ц а перад літарамі ***е, ё, ю, я, і***:

- пасля прыставак, якія заканчваюцца на зычны: ***пад’**ехаць, **аб’**яднанне, **аб’**і́нец*;
- у сярэдзіне слова пасля зычных, акрамя ***з, л, н, с, ц, дз***: *вера**б’**і, ся**м’**я, ба**р’**ер*.

Пасля ***ў*** (*у* нескладовага) **апостраф** н е п і ш а ц ц а: *здаро**ў**е, сала**ў**і, шча**ў**е*.

**116.** Прачытайце тэкст, дайце яму загаловак, выкарыстоўваючы словы з тэксту.

За куп’істым лугам расла векавая ліпа. На самай яе вярша́ліне сям’я буслоў змайстравала гняздо. Ужо каторы год птушкі жывуць тут, выводзяць буслянят.

Знізу ў буслянцы знайшлі прытулак крыклівыя вераб’і. Прысуседзіліся, зладзілі гнёзды ў галлі, што нанасілі буслы. І ўтульна вераб’ям, і адчуваюць сябе ў поўнай бяспецы. А буслоў нікольկі не турбуе вераб’інае самавольства, быццам і не заўважаюць шумных кватарантаў (*Паводле М. Зарэмбы*).

Пракаменціруйце правапіс слоў з апострафам.

Растлумачце лексічнае значэнне слова *прысуседзіліся*.

- Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы да слова *бусел*.

**117.** Запішыце словы, якія адпавядаюць наступным лексічным значэнням.

1. Артыст, які аб’яўляе нумары праграмы на эстрадным прадстаўленні, канцэрце і займае гледачоў у перапынках па-



Правообладатель Национальный институт образования

між нумарамі. 2. Пасыльны ва ўстанове, які разносіць дзелавыя паперы. 3. Мадэльер вельмі высокага класа, які вызначае стыль у модзе і стварае высокамастацкія мадэлі адзення. 4. Шыйнае ўпрыгожанне з каштоўных камянёў з падвескамі спераду. 5. Глыбокая вузкая даліна з вельмі крутымі берагамі, размытая ракой. 6. Абгароджаная пляцоўка для ўтрымання жывёлы, птушак (у заапарку і пад.).

Для даведкі: *кур..ер, канферанс..е, вал..ера, кал..е, куцюр..е, кан..ён.*

Складзіце і запішыце сказы з 2 словамі (на выбар).

**118.** Выканайце інтэрактыўныя заданні па тэме «Правапіс мяккага знака і апострафа» (інтэрактыўная прэзентацыя).

**119.** З прыведзеных слоў утварыце выразы, якія маюць наступныя значэнні.

1. Надакучліва прыставаць з размовамі пра адно і тое ж.
2. Ма́е вялікі вопыт, навыкі ў чым-небудзь; майстар на што-небудзь.
3. Моцна схуднець.

| | |
|---|---|
| з..ехаць | вушы |
| з..еў | на мыла |
| аб..ядаць | зубы |

Запішыце выразы, устаўляючы замест кропак мяккі знак або апостраф.

Складзіце і запішыце сказ з адным выразам (на выбар).



Правообладатель Национальный институт образования

**120.** Прачытайце тэкст. Колькі ў ім частак? Складзіце план тэксту. Вусна пракаменціруйце правапіс слоў з прапушчанымі літарамі.

Старшы с..ржант Мар..ян Знавец убачыў, як з б..рэзніку выхапіліся раз..юшаныя с..бакі. Яны гналі наперадзе сябе штосьці шэрае.

Шэры клубок падк..ціўся да ног Мар..яна і скочыў яму на грудзі. Мар..ян ледзь паспеў падтрымаць рукой мя..кі к..мячок. Гэта быў зайчык, адны тол..кі вушкі, зусім маладзен..кі. Мар..ян прыціснуў зв..рка да грудзей. Зайчык даверліва тыцнуўся зу..камі ў кіцель* з м..далямі, нібы х..цеў прале..ці да сэрца, што тр..вожна пастуквала яму ў вушы.

І Мар..ян з зайцам на кіцелі, як з сур..ёзнай узнагародай, выструніўся, знерухомеў. Потым расшпіліў кіцель і асц..рожна пусціў зайчыка за пазуху. Той нейкі час пачмыхаў там, уладкаваўся. Мар..ян адчуў, як целу зрабілася козытна ад дотыку мя..кай шэрсткі, але перац..рпеў. І стала яму хораша, не верылася нават, што можа быць так хораша ч..лавеку! *(Паводле В. Казько)*.

**што́сьці**

Растлумачце сэнс слоў *выструніўся, знерухомеў*. Падбярыце да іх аднакаранёвыя словы.

Пісьмова перакажыце частку тэксту, якой можна даць назву «Нечаканая схованка».

**121.** Запішыце словы па-беларуску, размяркоўваючы іх у два слупкі: 1) словы з раздзяляльным мяккім знакам; 2) словы з апострафам.

Компьютер, портьера, объектив, грильяж, отъезд, копьё, рельеф, ателье, серьёзный, интервью, бьют, медальон, Илья, Ульянов, Вьетнам.

Падкрэсліце арфаграмы ў слове *камп'ютар*.


Правообладатель Национальный институт образования

# § 17. Зычныя [д] — [дз’], [т] — [ц’], іх вымаўленне і правапіс

**122.** Прачытайце верш. Пра якія сузор’і ідзе ў ім гаворка?

У сцямнелых нябёсах, што свецяцца,
як мільён светлячкоў над зямлёй,
заблукала малеча-мядзведзіца
у трох зорках ад маткі сваёй.

Памігцела і вочкі заплюшчыла —
усё роўна не бачна — ані!
І сузор’ем завісла над пушчаю —
хоць малыя, а ўсё-ткі агні.

А матуля за дзетку спужалася —
не прапала б у цемры такой!
І, як толькі дагнаць атрымалася,
учапілася ўладна рукой.

*Т. Дзям’янава.*

Знайдзіце ў вершы словы з літарамі (спалучэннем літар) ***дз, ц***. Перад якімі літарамі пішуцца ***дз*** і ***ц***?

***Дз*** і ***ц*** пішуцца:

- перад літарамі ***е, ё, ю, я, і***, а таксама перад мяккім знакам: ***у паходзе, глядзім, медзь, цёплы, сцюжа, пяць***;
- перад літарай ***в***, калі яна абазначае мяккі гук [в’]: ***дзверы, цвёрды, чацвер***.

Літары ***д*** у складзе прыстаўкі і ***т*** у складзе суфікса перад [в’] захоўваюцца: ***адвязаць, падвезці, у грамадстве, у бітве***.



Правообладатель Национальный институт образования

**123.** Спішыце словы, раскрываючы дужкі.

Па*(д/дз)*веска, па*(д/дз)*ея, по*(д/дз)*віг, у агаро*(д/дз)*е, сту*(д/дз)*ень, мя*(д/дз)*ведзь, а*(д/дз)*вязаць, па*(д/дз)*везці, ты*(д/дз)*ень, ня*(д/дз)*еля, паня*(д/дз)*елак, на*(д/дз)*вячорак, *(д/дз)*весце, на пара*(д/дз)*е.

Падкрэсліце ўсе арфаграмы ў слове *мядзведзь*.

Растлумачце лексічнае значэнне беларускага слова *нядзеля* і рускага *неделя*.

**124.** Прачытайце словы, прыведзеныя ў табліцы.

| З лацінскай мовы | З грэчаскай мовы | З польскай мовы |
|---|---|---|
| ***т***ыгр<br>***д***эпутат | с***т***ыхія<br>ідэя | ква***т***эра<br>сту***д***энт |

Чаму ў гэтых словах захоўваюцца літары ***д, т***?

У большасці іншамоўных слоў у адпаведнасці з вымаўленнем пішуцца ***д*** і ***т***: ***радыё, дыск, аптэка, фестываль.***

У некаторых іншамоўных словах у адпаведнасці з традыцыяй і літаратурным вымаўленнем пішуцца ***дз, ц***: ***цір, цюльпан, касцюм, дзюдо.***

Перад суфіксамі ***-ін-, -ір-, -ік-, -ёр-, -еец-, -ейск-*** пішуцца ***дз*** і ***ц***: ***бландзін, камандзір, рулецік, шахцёр, індзеец, гвардзейскі.***

**125.** Прачытайце тэкст. Раскрыццю якой думкі ён падпарадкаваны? Дакажыце, што гэта тэкст-разважанне.

Пя**ці**класнік Ві**ця** Шпак не быў **ці**хі ды сарамлівы. Наадварот, з усіх хлопцаў-равеснікаў ён вызначаўся шустрас**цю** і рэзкас**цю**. Ві**ця** меў добрую памя**ць**, кемнас**ць*** — вучоба давалася яму лёгка. На ўроках фізкультуры ён быў першы, бо спрыт, сіла дапамагалі хутчэй за ўсіх бега**ць**, скака**ць** ды



Правообладатель Национальный институт образования

ўвішна* рабіць гімнастыку. Карацей, усё гэта ды яшчэ кампанейскі характар рабілі Віцю душой класа *(Паводле Г. Далідовіча)*.

Пракаменціруйце правапіс выдзеленых літар.

Як вы разумееце выраз *душа класа*?

Вусна складзіце невялікі тэкст — характарыстыку аднакласніка, які з'яўляецца душой вашага класа.

**126.** Запішыце сказы, раскрываючы дужкі.

1. *(Д/дз)*ед вывеў мяне на *(це/тэ)*расу*, якая спускалася ў парк *(З. Бядуля)*. 2. Павел і Вольга ся*(д/дз)*елі на адной з доўгіх драўляных лавак ста*(ды/дзі)*ёна непадалёк ад бальніцы *(Т. Пяшко)*. 3. Міхась зрабіў некалькі бу*(тэ/це)*рбродаў са шпротамі, узяў а*(д/дз)*ін *(Д. Пятровіч)*. 4. Мікіта ўсё час*(т/ц)*ей прападаў у экспе*(дзі/ды)*цыях і розных каман*(дзі/ды)*роўках *(А. Ветах)*. 5. Той рэччу, пра якую я ўспомніў, быў кампакт-*(дзі/ды)*ск *(Р. Баравікова)*.

**127.** Якое слова прапушчана ў выразах?

адчыняць ілбом ...

нагой адчыняць ...

стукацца ў ...

паказваць на ...

?

'свабодна, беспераШкодна заходзіць куды-небудзь'

'быць выгнанаму'

'прапаноўваць каму-небудзь выйсці'

'часта звяртацца з просьбамі да каго-небудзь'

Запішыце выразы. Вусна растлумачце іх сэнс. Складзіце з імі сказы.



Правообладатель Национальный институт образования

**128.** Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Правапіс ***д*** і ***дз***».

**129.** Прачытайце тэкст. У якім сказе сфармулявана яго асноўная думка?

Вусна пракаменціруйце правапіс слоў з літарамі (спалучэннямі літар) ***д, дз, т, ц***.

## Рукі *(ды/дзі)*рыжора



Калі пачало знікаць святло, гледачы за*(т/ц)*іхлі, а ў прахо*(д/дз)*е аркестравай ямы з'явіўся чалавек. Ён стаў за пульт, узняў рукі.

Узмах *(ды/дзі)*рыжорскай палачкі — і пяшчотная мелодыя палілася ў гля*(д/дз)*ельную залу. Музыка была розная: усхваляваная, с*(т/ц)*ішаная, прасякнутая радас*(т/ц)*ю.

Рукі *(ды/дзі)*рыжора прасілі, малілі, чакалі, спа*(д/дз)*яваліся. Яны ўзляталі ўверх, патрабуючы ад музыкантаў яшчэ большай вышыні. А потым, калі гукі запоўнілі залу, а*(д/дз)*іным узмахам супакойвалі іх магутную с*(ты/ці)*хію. І тады было чуваць, як у напружанай *(т/ц)*ішыні самотна спявала скрыпка.

*(Ды/дзі)*рыжор — бог аркестра, яго вочы, душа і сэрца. Ён здатны ператварыць гукі ў музыку, бу*(д/дз)*ённасць — у паэзію *(Паводле Т. Мушынскай)*.

Выпішыце з тэксту дзеясловы, якія характарызуюць рукі дырыжора. Выкарыстоўваючы гэтыя словы як апорныя, падрыхтуйце вуснае выказванне на тэму «Дырыжор — душа і сэрца аркестра».



Правообладатель Национальный институт образования

**130.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

Движение на велосипеде должно осуществляться по велосипедной дорожке, а при её отсутствии — по обочине, тротуару или пешеходной дорожке. При движении по дороге в тёмное время суток и (или) при её недостаточной видимости на велосипеде должны быть включены: спереди — фара (фонарь), излучающая белый свет, сзади — фонарь, излучающий красный свет. При пересечении проезжей части дороги по пешеходному переходу велосипедист должен вести велосипед рядом с собой *(«Правила дорожного движения»)*.

## Слоўнік

обочина — *абочына*
излучающий — *які выпраменьвае*
пересечение — *перасячэнне*
проезжая часть дороги — *праезная частка дарогі*

**131.** Прачытайце верш. Якое ўражанне ствараецца паўторам шыпячых зычных у апошніх чатырох радках?

Люблю на беразе азёрным
у ціхі вечар пастаяць,
калі ў **ваду** з нябёсаў зоры
ў мройным* одуме* **глядзяць,**
а **ветрык** гойдае-калыша
ў прыбярэжжы **чараты,**
і навакол — такая ціша,
што свет увесь пачуеш ты.

*А. Зэкаў.*

Да выдзеленых слоў падбярыце і запішыце аднакаранёвыя словы або формы слова, каб чаргаваліся гукі [д] — [$\widehat{дз}$’], [т] — [ц’].



Правообладатель Национальный институт образования

## § 18. Правапіс *у, ў*

**132.** Прачытайце тэкст. Раскрыццю якой думкі ён падпарадкаваны? У якім сказе яна сфармулявана?

Таццяна **ў**важліва разглядала кветкі, што раслі на клумбе. Белыя, ружовыя, жоўтыя, бэзавыя астры. Ім бы расцвісці **ў** жніўні. Але, захінутыя ад вятроў шматпавярховым домам, яны распанелі тут **у** ліпені і цешылі цяпер позірк. А куст гартэнзіі! Белыя суквецці звісалі з галінак вялізнымі шарамі. **У**прыгожаны імі, куст сам нагадваў дзівосны шар, **у**весь нібы абвіты ліхтарыкамі. Позірку нельга было адарваць ад гэтай клумбы! *(Паводле Р. Баравіковай).*

Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

Як вы разумееце сэнс слова *распане́ць*?

Літара ***ў*** (*у* нескладовае) п і ш а ц ц а пасля галосных:
- у пачатку слоў: *на **ў**згорку, каля **ў**нівермага*;
- у сярэдзіне слоў: *за**ў**тра, ка**ў**нер*;
- у канцы слоў: *сказа**ў**, ле**ў***;
- пасля злучка і двукосся, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны: *пайднёва-**ў**сходні, гучнае «**ў**ра»*.

**133.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс літары ***ў***.

1. Увесь час дз..мулі па..ночна-..сходнія в..тры́ *(А. Казлоў).* 2. Увесь той час, пакуль Нічыпар стаяў ля дошкі, у а..дыторыі панавала по..ная цішыня *(Г. Аўласенка).* 3. У залах і фондах Мірскага замка беражліва захо..ваюцца ..нікальныя экспанаты *(А. Лойка).* 4. Пустое «..ра» нікога не парадуе *(А. Сербантовіч).* 5. Праз год ва ..ніверсітэт зноў прыехалі н..мецкія сту*(дэ/дзе)*нты *(А. Ветах).*



Правообладатель Национальный институт образования

**134.** Прачытайце словы, прыведзеныя ў табліцы.

| З лацінскай мовы | З нямецкай мовы | З англійскай мовы |
|---|---|---|
| радыу*ус*<br>акварыу*ум* | стра*ус*<br>фра*у** | шо*у*<br>но*у*-ха*у** |

Чаму ў гэтых словах пасля галосных пішацца літара ***у***?

Літара ***у*** п і ш а ц ц а:

• у іншамоўных словах, якія заканчваюцца на -***ум***, -***ус***: *прэзіды**ум****, *поды**ум**, со**ус***;

• на канцы іншамоўных слоў не пад націскам: *фра́**у**, шо́**у***;

• у словах з націскным [у]: *ау́л**, *бау́л, трыу́мф**;

• у пачатку ўласных назваў: *да **У**льяны, ва **У**ладзівастоку*;

• пасля знакаў прыпынку: *Іра маўчала, **у**важліва слухала.*

**135.** Запішыце словы (спалучэнні слоў) у два слупкі ў залежнасці ад таго, якая літара пішацца на месцы пропуску — ***у*** ці ***ў***.

Ліноле..м, нака..т, са..на, рады..с, Святлана ..ладзіміраўна, ва ..ніверсаме, тры..мф, бо..лінг, па-..чарашняму, натары..с, ручка-..казка, кло..н, ва ..збекістане, Брэсцкая ..нія.

Падкрэсліце арфаграмы ў слове *радыус*.

**136.** Выпішыце словы (спалучэнні слоў), у якіх прапушчана літара ***у***.

Ра..нд, ба..л, да ..ладзіміра, а..торак, прэзіды..м, бацькі́ ..льяны, паўночна-..сходні, ла..рэат*, фра.., ва ..ніверсітэце, а..кцыён, аквары..м, каля ..рны, касмана..т, со..с, пра..нук, стра..с, ток-шо.., фа..на.

Падкрэсліце слова, якое нельга падзяліць для пераносу.



Правообладатель Национальный институт образования

**137.** Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Правапіс ***у, ў***».

**138.** Прачытайце верш. Якія моўныя сродкі выкарыстоўвае паэт, каб пераканаць чытача ў тым, што «бульба лепшая са страў»?

## Бульба

Каб толькі мог, дык я б, няйначай,
Даў бульбе лепшую з адзнак —
Ах, бульба, бульба, што за ўдача,
Што за выгода, што за смак!
І са стала, з вялізнай міскі,
Па ранніях, поўднях, вечарах
Малому мне яшчэ ў калыску
Ляцеў яе прывабны пах.

А давялося добра вызнаць,
Што бульба лепшая са страў,
Калі я сеў за стол вялізны,
Тады ўвесь смак яе пазнаў —
Пячонай, з сокам журавінным,
З капустай, з квасам, з агурком;
Варонай, чыстай ад лушпіння,
Найлепей — з кіслым малаком...

*П. Броўка.*

Якія вы ведаеце стравы з бульбы?

Знайдзіце ў вершы прыклады, якія ілюструюць розныя выпадкі правапісу літары ***ў*** (у пачатку, у сярэдзіне, у канцы слоў).

Падбярыце да слова *бульба* аднакаранёвыя словы, якім адпавядаюць наступныя лексічныя значэнні:

а) ‘адзін клубень бульбы’;

б) ‘кафэ, у меню якога пераважаюць стравы з бульбы’;

в) ‘блін з дранай бульбы, дранік’;



Правообладатель Национальный институт образования

г) ‘поле, з якога сабраны ўраджай бульбы, на якім папярэдняй культурай была бульба’.

Д л я  д а в е д к і: *бульбянік, бульбіна, бульбяная, бульбянішча.*

**139.** Устанавіце адпаведнасць паміж прыказкамі і іх сэнсавымі характарыстыкамі. Запішыце прыказкі, раскрываючы дужкі.

1. Слова — серабро, ма*(л/ў)*чанне — золата.
2. Хто парася *(у/ў)*краў, *(у/ў)* таго *(у/ў)* вушах пішчыць.
3. Яму раніцаю росна, *(у/ў)* по*(л/ў)*дзень млосна, а *(у/ў)*вечары камары кусаюць.

---

а) Пра гультая, які шукае апраўданне сваёй ляноты.

б) Гаворыцца як парада абдумваць сваё выказванне і лепш прамаўчаць, чым сказаць лішняе.

в) Той, хто правінаваціўся ў чым-небудзь, сам міжвольна выдае сябе сваімі паводзінамі.

У апошняй прыказцы падкрэсліце словы, у якіх колькасць гукаў і літар не супадае.

**140.** Прачытайце тэкст. Якая частка з’яўляецца ўводнай? Ці ёсць у тэксце канцоўка?

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі.

## Шпако*(у/ў)*ня

Ціха і цёпла на прызбе з па*(у/ў)*днёва-*(у/ў)*сходняга боку, хаця ля платоў яшчэ л..жыць пач..рнелы сне.. . Заліваюцца *(у/ў)* небе жаваранкі. Але іх не бачыць Міколка *(у/ў)* б..здонным блакіце. Затое шпакі свішчуць на в..рбе *(у/ў)* суседнім панадворку. Там *(у/ў)*жо ёсць і шпако*(у/ў)*ня. Ёсць і стрэшка, і круглая, як разя*(у/ў)*лены рот, дзірачка-*(у/ў)*лётка.



Правообладатель Национальный институт образования



Міколка зайздросціць Л..вону і *(У/Ў)*ладу, што яны зр..білі такую шпако*(у/ў)*ню. Хлопчык марыць хутчэй падр..сці, пасадзіць в..рбу, каб яна выр..сла высокай і то*(у/ў)*стай. Тады ён зробіць і *(у/ў)*знясе на яе яшчэ лепшую шпако*(у/ў)*ню. І *(у/ў)* яго будуць св..е шпакі *(Паводле І. Стадольніка)*.

- Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў першым сказе апошняга абзаца.



Вусна дапоўніце тэкст апісаннем «яшчэ лепшай» шпакоўні, якую марыць зрабіць Міколка.

**141.** Спішыце сказы, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс літар ***у***, ***ў***.

1. Зацягва..ся змрокам пераез*(д/т)* з бу*(д/т)*кай і паламаным шлагба..мам *(В. Быкаў)*. 2. А*(д/т)*шумела апла*(дзі/ды)*сментамі заключнае шо.., цэлую гад*(д/дз)*íну яго трансліравала *(тэ/це)*лебачанне *(А. Кудласевіч)*. 3. Тры..мф належаў ім абодвум *(А. Мальдзіс)*. 4. Пачу..шы пах сырадою, прыбег аднекуль з-за хлява рыжаваты кот, падня.. кароткі хвост, замя..каў *(Г. Далідовіч)*. 5. Дубадзел рушыў да ст..ла прэзіды..ма *(І. Мележ)*. 6. Сёмага верасня дзве тысячы трэцяга года ў геаграфічным ц..нтры Е..ропы — горадзе Полацку — быў устаноўлены помнік літары ***ў*** *(В. Іўчанкаў)*.

Разгледзьце фотаздымак помніка літары ***ў***, змешчаны на вокладцы вучэбнага дапаможніка (скульптар І. Куржалаў). Як вы лічыце, чаму менавіта гэтай літары беларускага алфавіта ўстаноўлены помнік? Чаму гэты помнік зроблены ў выглядзе вокладкі кнігі?

- У другім сказе падкрэсліце граматычныя асновы.



Правообладатель Национальный институт образования

## § 19. Падоўжаныя зычныя, іх вымаўленне і правапіс

**142.** Прачытайце тэкст. Растлумачце паходжанне слова *кладнік*.

### Кладнікі

Кладнікі — гаспадары над схаванымі ў зямлі скарбамі. Адзенне кладнікаў — сярэбраныя світкі, паясы — залатыя ланцугі.

Хаты кладнікаў блішчаць золатам і срэбрам. Каштоўнае каменне выкарыстоўваюць яны для асвятлення дома і ў дарозе.

Пры сваім незлічоным багацці кладнікі — беднякі, таму што са свайго велізарнага дабра яны нічога не выкарыстоўваюць на патрэбы харчавання *(Паводле А. Шамака)*.

Выпішыце з тэксту словы з падоўжанымі зычнымі гукамі. Падкрэсліце літары, якія абазначаюць падоўжаныя зычныя.

Паміж якімі гукамі зычныя могуць вымаўляцца падоўжана?

У беларускай мове ў становішчы паміж галоснымі зычныя гукі [л’], [н’], [з’], [с’], [дз’], [ц’], [ж], [ш], [ч] могуць вымаўляцца падоўжана. Такое іх вымаўленне на пісьме перадаецца падвоеным напісаннем адпаведных літар: ***Купалле, жыццё, падарожжа, печчу***.

Падоўжаны гук [дз’] перадаецца на пісьме спалучэннем літар ***ддз***: ***суддзя, разводдзе***.

**143.** Прачытайце словы, прыведзеныя ў табліцы.

| З лацінскай мовы | З грэчаскай мовы | З французскай мовы |
|---|---|---|
| кла**с**<br>інтэ**л**ект | прагра**м**а<br>а**л**ергія | па**с**ажыр<br>а**к**ардэон |

Чаму ў гэтых словах падаўжэнне зычных не адбываецца?



Правообладатель Национальный институт образования

Падаўжэння зычных не адбываецца:

● у запазычаных словах: *алея, група, Ала, Іна.* В ы к л ю ч э н н е: *ванна, мадонна*, манна, панна*, саванна, Жанна, Ганна, Сюзанна*;

● у словах *Ілья, Ульяна, Касьян, Емяльян, Юльян* і словах, утвораных ад іх: *Ільіч, Ульянаў, Касьянавіч.*

**144.** Прачытайце тэкст, дайце яму загаловак. Да якога тыпу належыць тэкст?

Майстэрня мастака — гэта не проста асобны свет, а цэлая галактыка. Усё памяшка**нн**е загрувашчана карцінамі ў рознай стадыі выкана**нн**я. Паўсюль і прадметы для аздабле**нн**я нацюрмортаў, партрэтаў: геаметрычныя фігуры, штучная садавіна і агароднiна, кало**н**ы, розныя дэкаратыўныя «цацкі» для стварэ**нн**я шэдэўраў. А пасярэдзіне — мальберт, за якім сядзіць сам мэтр мастацтва з пэндзлямі і палітрай *(Паводле Д. Пятровіча).*

***шэдэ́ўр***

Растлумачце правапіс выдзеленых арфаграм.

Знайдзіце ў тэксце слова, што мае значэнне ‘настаўнік, майстар у якой-небудзь галіне’.

**145.** Спішыце сказы, раскрываючы дужкі. Растлумачце правапіс слоў з падоўжанымі зычнымі.

1. У Кацінага бацькі была цэлая ка*(лл/л)*екцыя самых розных манет *(А. Федарэнка).* 2. Жы*(цц/ц)*ё бывае горкім і мядовым *(М. Башлакоў).* 3. Нашым любімым святам было Купа*(лл/л)*е *(С. Умец).* 4. Той вясной сады на Слу*(чч/ч)*ыне цвілі нібыта ў апошні раз *(А. Бутэвіч).* 5. Па*(нн/н)*а Ядвіга зашпіліла каўнер свайго прыталенага кажушка *(А. Аляшкевіч).*



Правообладатель Национальный институт образования

6. Тра*(лл/л)*ейбус спыніўся, па*(сс/с)*ажыры пачалі выходзіць *(Р. Баравікова)*.

- Растлумачце пастаноўку коскі ў апошнім сказе.

**146.** Да прапанаваных слоў падбярыце аднакаранёвыя словы з падоўжанымі зычнымі. Запішыце словы парамі.

У з о р: *камень* — *каменне*.

Вясёлы, разважаць, колас, прамень, лес, снедаць, крыло, дарога.

Ад падаўжэння зычных трэба адрозніваць падваенне, якое ўзнікае на стыку прыстаўкі і кораня, кораня і суфікса: *раз-злаваць*, *ад-даць*; *кон-ны*, *асен-ні*.

**147.** Утварыце словы з падваеннем зычных паводле прапанаваных схем.






Правообладатель Национальный институт образования

**148.** Запішыце прыказкі, падбіраючы да слоў у дужках аднакаранёвыя назоўнікі з падоўжанымі зычнымі і ўжываючы гэтыя назоўнікі ў патрэбнай склонавай форме.

У з о р. *Вялікага дуба з малым (корань) не бывае. — Вялікага дуба з малым карэннем не бывае.*

1. Не тады сабак кормяць, як на *(паляваць)* ісці. 2. Без сала куса няма *(жыць)* у беларуса. 3. За *(багаты)* розуму не купіш. 4. Золата і ў *(сметнік)* блішчыць. 5. Каб *(свіны)* рогі, не сапуціла б дарогі.

Падрыхтуйце вуснае выказванне на тэму «За багацце розуму не купіш» (тып тэксту — разважанне).

**149.** Выканайце тэставыя заданні па тэме «Правапіс падоўжаных зычных».

**150.** Падбярыце да рускамоўных словазлучэнняў беларускія аднаслоўныя адпаведнікі.

У з о р: *место за углом дома, за домом — завуголле.*

Пребывание в гостях; наступление сумерек; местность, прилегающая к берегу реки; место за забором; место под нижним краем крыши какого-либо строения.

Д л я д а в е д к і: *падстрэшша, надрэчча, гасцяванне, заплоцце, змярканне.*

**151.** Прачытайце тэкст. У якім сказе сфармулявана яго асноўная думка?

Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі.

Добра прыпарвае сонца. Каля грушы гойдае*(цц/ц)*а жоўтасіні чмель. Прыпадае да сукве*(цц/ц)*яў і ад асалоды аж сці-


Правообладатель Национальный институт образования

нае*(цц/ц)*а ўсім св..ім калматым *(т/ц)*ельцам. Адрывае*(цц/ц)*а, адвальвае*(цц/ц)*а ад кветкі. А потым, каб м..цней адчуць смак таго, што высмактаў з яе, высоўвае*(цц/ц)*а з ценю на сонца. Надоўга завісае, др..жыць, гойдае*(цц/ц)*а на сонечным прыпёку. Радасна, сола*(д/т)*ка чм..лю, трапіў у мё*(д/т)* і пануе *(Паводле В. Казько)*.



Якое значэнне мае дзеяслоў *пануе*, ужыты ў апошнім сказе тэксту: а) ‘мае ўладу над кім-небудзь’; б) ‘мае пераважнае распаўсюджванне; в) ‘узвышаецца над чым-небудзь’; г) ‘з’яўляецца галоўным’; д) ‘жыве ў раскошы’?

Выпішыце з тэксту дзеясловы. Карыстаючыся імі як апорнымі словамі, вусна перакажыце тэкст.

## § 20. Прыстаўныя зычныя і галосныя, іх правапіс

**152.** Прачытайце пары слоў.

| Па-руску | Па-беларуску |
|---|---|
| осень | восень |
| облако | воблака |
| улей | вулей |
| улица | вуліца |
| этот | гэты |

Якімі пачатковымі гукамі адрозніваюцца словы ў рускай і беларускай мовах?

Чаму гэтыя гукі атрымалі назву «прыстаўныя»?

Перад якімі галоснымі вымаўляецца прыстаўны гук [в]?



Правообладатель Национальный институт образования

Прыстаўная літара ***в*** п і ш а ц ц а:

● у пачатку слова перад націскнымі ***о, у***: ***во́страў, во́зера, ву́чань, ву́гал***;

● пасля прыставак перад каранёвымі ***о, у***: ***завоблачны, навучыцца***;

● у сярэдзіне некаторых слоў перад ***о, у***: ***навобмацак, Лявон, павук, каравул***;

● у словах ***вока, востры, вакол*** і словах, утвораных ад іх, незалежна ад націску: ***вачаняты, навастрыць, навако́лле***.

Прыстаўная літара ***в*** н е п і ш а ц ц а:

● перад ненаціскным ***а***: *во́страў — астравы́, во́зера — азёрны*;

● у пачатку іншамоўных слоў перад націскнымі ***о, у***: *о́пера, о́фіс, у́рна*; а л е: *во́хра, во́цат, ву́стрыца*;

● у пачатку імён, прозвішчаў, геаграфічных назваў: *Улья́на, О́сіпаў, О́рша*; а л е: ***Во́льга***;

● у словах *о́каць, о́дум, нао́гул*.

Прыстаўная літара ***г*** пішацца ў словах ***гэты, гэтак, дагэтуль, гэй*** і інш.

***нао́гул***

**153.** Прачытайце прыказкі, выбіраючы з дужак правільны варыянт.

1. У сваёй хаце і *(углы/вуглы)* памагаюць. 2. Пажар *(агнём/вагнём)* не тушаць. 3. Адной рукой і *(узла/вузла)* не завяжаш. 4. Не *(учы/вучы)* рыбу плаваць. 5. Скажы курыцы, дык яна па ўсёй *(уліцы/вуліцы)*.

Якую з прыказак ужываюць, калі гаворка ідзе пра майстра сваёй справы, якому не патрэбны чые-небудзь парады?

**154.** Запішыце словы, размяркоўваючы іх у два слупкі ў залежнасці ад таго, пішацца ці не пішацца на месцы пропуску літара ***в***.



Правообладатель Национальный институт образования

..оперны, ..опыт, ..азёрны, ..ольха, ..асенні, ..абласны, ..ордэн, за..очны, ..опратка, аб..астраны, ..урна, ..аколіца, ..ушы, ..Урал, ..Омск.

У пачатку слоў перад спалучэннямі зычных, дзе першыя гукі [м], [л], [р], могуць узнікаць прыстаўныя галосныя [і], [а].

Прыстаўныя літары ***і, а*** п і ш у ц ц а:

- перад спалучэннем зычных, дзе першы гук [л] або [р], калі слова з гэтым спалучэннем стаіць:

  пасля знака прыпынку: *цёмная, **і**ржавая вада*;

  пасля слова, якое заканчваецца на зычны: *фартух **і**льняны, хлеб **а**ржаны*;

- перад спалучэннем зычных, дзе першы гук [м], незалежна ад таго, на які гук заканчваецца папярэдняе слова: *думкі **і**мклівыя, конь **і**мчыцца*.

Прыстаўныя галосныя н е п і ш у ц ц а:

- перад спалучэннем зычных, дзе першы гук [л] або [р], калі слова з гэтым спалучэннем стаіць пасля слова, якое заканчваецца на галосны: *кашуля льняная, хлеба ржанога*;
- пасля прыставак і першай часткі складанага слова, якія заканчваюцца на галосны, перад спалучэннем зычных, дзе першы гук [л], [р] або [м]: *заржавець, прымчацца, **вока**мгненны*.

**155.** Прачытайце тэкст. Дакажыце, што ён адпавядае тыповай схеме апісання.

На мальберце стаяла няскончаная карціна. На фоне ахутанага начной **і**мглой зімовага пейзажу **і**мчаліся паляўнічыя. Да́мы ў сукенках з доўгімі вузкімі шлейфамі, у механых шапачках, з сокаламі на пальчатках. Мужчыны з пёрамі на



Правообладатель Национальный институт образования

шапках, узброеныя даўжэзнымі стрэльбамі. Коні **ржалі**, **імк**ліва слізгалі па паветры.[сн] Гэта было захапляльнае, вясёлае і трывожнае відовішча *(Паводле Л. Рублеўскай)*.

Пракаменціруйце правапіс выдзеленых спалучэнняў літар.

**156.** Спішыце спалучэнні слоў, устаўляючы, дзе трэба, літару ***і***. Растлумачце яе наяўнасць або адсутнасць.

Пад ..льдзінай, за..мшэлы валун, знікла ..мгненна, без ..льгот, па ..ржышчы, абяцанні ..лжывыя, па..рваныя кеды, апетыт ..львіны, пры..мчаўся вока..мгненна, раптам ..рвануўся.

**157.** Спішыце сказы, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары. Растлумачце правапіс прыстаўных галосных.

1. На пунсовых пялёстках яшчэ ..рдзелі кроплі дажджу *(М. Прохар)*. 2. Журботныя вочы хворага на ..мгненне асвятліліся *(А. Аляшкевіч)*. 3. Пад страхою шастаў, ..рваў салому вецер[сн] *(В. Адамчык)*. 4. Машына завуркатала і па..мчалася назад[сн] *(В. Гурскі)*. 5. Сцежкі і газоны шмат дзе былі размытыя ..мклівымі струменямі вады ў час дажджу *(З. Дудзюк)*.

## § 21. Правапіс некаторых спалучэнняў зычных

**158.** Прачытайце пары слоў.

| Па-руску | Па-беларуску |
|---|---|
| по**здн**ий | по**зн**і |
| обла**стн**ой | абла**сн**ы |
| сча**стл**ивый | шча**сл**івы |
| се**рдц**е | сэ**рц**а |

Ці адпавядае вымаўленню напісанне выдзеленых спалучэнняў літар у рускай і беларускай мовах?



Правообладатель Национальный институт образования

У беларускай мове гістарычныя спалучэнні ***здн, стн, стл, рдн, рдц*** у адпаведнасці з вымаўленнем перадаюцца на пісьме як ***зн, сн, сл, рн, рц***: *праязны, кантрасны, жаласлівы, міласэрны, сэрца*.

**159.** Прачытайце тэкст, дайце яму загаловак. Назавіце сродкі сувязі сказаў у тэксце. Пракаменціруйце правапіс выдзеленых спалучэнняў літар.

З заміраннем сэ**рц**а згадваю ціхую рэчку майго маленства. І ў гэтай рэчцы, у павольнай вадзе рада**сн**а плыве наша кабыла Каштанка, хуткая красуня. А побач з Каштанкай плыве яе сынок. Такі нясмелы, што мне прыйшлося падштурхнуць яго з пясчанага берага ў ваду.

З павадамі ў руцэ я плыву побач з маткай і сынам. Так-сама шча**сл**івы *(Паводле Я. Брыля)*.

*шчаслі́вы*

**160.** Якое слова прапушчана ў выразах?




Запішыце выразы. Вусна растлумачце іх сэнс. Складзіце з імі сказы.



Правообладатель Национальный институт образования

**161.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак, які перадаваў бы тэму тэксту.

Спішыце тэкст, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі.

Канцэрт фартэпі..ннай музыкі павінен быў адбыцца ў ябл..невым са*(д/дз)*е. Слухачы звычайна рассаджваюцца на дв..ры пад дрэвамі. Крэслы выносяць у са*(д/т)*. У расчыненае ..акно л..ецца музыка.

Пі..ністка пакл..нілася публіцы і ўзяла першы а*(кк/к)*орд. Дз..ўчына іграла бліскуча, забіраючы ў палон сэр..цы слухачоў. Поз..нія промні со..нца нібы пат..нулі ў нетрах з..млі. Гучаў р..яль, і рытм сэр..ца зліваўся з рытмам музыкі *(Паводле Л. Кебіч)*.

**162.** Запішыце словазлучэнні па-беларуску.

Опоздать на поезд, счастливый день, скоростной интернет, одноместный номер, областная поликлиника, радостное событие, сидеть безвыездно, контрастные цвета, капустный лист.

**163.** У словах кожнага радка вызначце агульную арфаграму. Сфармулюйце правілы, якім падпарадкоўваецца правапіс гэтых слоў.

1. Калоссе, вяселле, узвышша, збожжа, ноччу.
2. Секунда, балерына, педаль, вазелін, бензін.
3. Бібліятэка, піянер, біяграфія, авіяцыя, піяніна.
4. Радыус, страус, лінолеум, соус, акварыум.

**164.** Прачытайце тэкст. У якім сказе заключаецца яго асноўная думка?

Спішыце тэкст, устаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі.


Правообладатель Национальный институт образования

## Сімфонія лета

У пачатку мая гучыць в..сёлая музыка дз..мухаўцоў, якія нагадваюць пырскі со..нца. Іх м..довыя карагоды — уверцюра* да сімфоніі кол..раў і гукаў.



Потым з..яўляюцца на л..сных п..лянах і пя..чаных адхонах даро*(х/г)* с..рамлівыя зв..ночкі і сінія вало*(ж/ш)*кі. Ля в..сковых хат і г..радскіх кам..ніц рас..цвітае ч..ромха, падобная да дз..ўчынкі ў белай сукена..цы. Гэта яшчэ адна п..шчотная м..лодыя.

У кожнай квета..цы схавана асобная музычная тэма ў сімфоніі лета. І кожная гучыць па-р..знаму. Адна — як та..мнічыя гукі арфы, другая — як празрыстая м..лодыя струнных, трэцяя — як урачыстыя а*(кк/к)*орды *(Паводле Т. Мушынскай)*.

Напішыце міні-сачыненне (3-5 сказаў) на тэму «Музычная тэма званочкаў (валошак, рамонкаў...) у сімфоніі лета».

**165.** Прачытайце тэкст. Абгрунтуйце яго падзел на абзацы.
Растлумачце правапіс выдзеленых літар. Запішыце тэкст пад дыктоўку.

Пас**я**рэдзіне сажалкі разышо**ў**ся шырокі кру**г**. **Дз**імка яшчэ не **ў**мее закідваць **в**удачку, каб не патр**ы**вожыць в**а**ду. Хлопец с**я**дзіць і не дыхае, бо рыба не любіць шуму. Зроблены з гусінага п**я**ра паплавок* не варухнецца. **Дз**імка не зво**дз**іць **в**ачэй з белага п**я**ра.

Вось паплавок падскочыў, пры**ў**зняўся, лё**г**. Прайшла яшчэ с**е**кунда, і раптам п**я**ро к**а**лыхнулася і схавалася ў в**а**дзе.



Правообладатель Национальный институт образования

Дзімка рвануў вудзільна, і над сажалкай бліснула серабрыстая маланка.

Дзімку хацелася скакаць ад вялікай радасці, крычаць на ўсю ваколіцу *(Паводле В. Гардзея)*.

Выканайце самаправерку.

**166.** Прачытайце верш. Раскрыццю якой думкі ён падпарадкаваны? У якім сказе яна сфармулявана?

## Калядная вячэра

Гэткай смачнае **куцці**
вы не **елі** ў жыцці.
І блінцы калядныя
дужа-дужа ладныя.
А кісель, ды аўсяны,
яшчэ лепшы за бліны.
А згатуеце гароху —
**з'ясце** многа й яшчэ троху.
Селядцы ёсць і **грыбкі** —
пах ідзе ва ўсе бакі.
Пернікі ды булкі з макам
будуць, пэўна, усім да смаку.
Журавінавы напітак
будзе піцца з апетытам.
Усе стравы сытныя,
надта апетытныя!

*В. Жуковіч.*

Зрабіце фанетычны разбор выдзеленых слоў (парадак і ўзор разбору змешчаны на форзацы).

Знайдзіце ў выдзеленых словах арфаграмы. Пракаменціруйце іх правапіс.



Правообладатель Национальный институт образования

**167.** Прачытайце тэкст. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку тэксту?
Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

### Колизей

Колизей — грандиозный амфитеатр, построенный в Риме в 72—80 годах нашей эры. Здание вмещало около 50 тысяч зрителей. Долгое время Колизей был для жителей Рима любимым местом увеселительных зрелищ. Тут проходили бои гладиаторов, травля зверей. Император Гоно́рий запретил гладиаторские бои как несоответствующие духу христианства. Несмотря на все невзгоды, испытанные Колизеем, его развалины до сей поры производят сильное впечатление (*«Величайшие чудеса света»*).



**Слоўнік**

увеселительные зрелища — *забаўныя (пацешныя) відовішчы*
травля — *цкаванне*
испытанный — *зазнаны, зведаны, перажыты*
производить впечатление — *выклікаць уражанне*

## Кантрольныя пытанні і заданні

1. Калі літары ***е, ё, ю, я, і*** абазначаюць два гукі?
2. Спалучэнні якіх літар беларускага алфавіта абазначаюць гукі [$\widehat{дж}$], [$\widehat{дз}$], [$\widehat{дз}$’]?
3. Раскажыце на памяць беларускі алфавіт. Для чаго яго трэба ведаць?
4. Як вызначыць колькасць складоў у слове?
5. У якіх выпадках спалучэнні літар ***дж, дз*** можна раздзяляць пры пераносе слова?
6. Што такое арфаграма?



Правообладатель Национальный институт образования

**168.** Устанавіце адпаведнасць паміж раздзеламі навукі аб мове і іх характарыстыкамі.

| | |
|---|---|
| 1. фанетыка<br>2. арфаэпія<br>3. графіка<br>4. арфаграфія | а) вывучае правілы вымаўлення гукаў і іх спалучэнняў;<br>б) вывучае правілы напісання слоў і іх частак;<br>в) вывучае пісьмовыя знакі, суадносіны паміж гукамі і літарамі;<br>г) вывучае гукі мовы |

**169.** Прачытайце верш.

**Лазня**

Ад сяла
І да сяла
Лазні ўзносіцца хвала.
Здыме стому,
Здыме пот —
Любіць **лазню** наш народ.
Хоць
Які б ты брудны быў,—
Ра́жку* **цёплай** захапіў...
Глянеш:
Бруду ні сляда,
Паздымае ўсё вада.
Возьмеш
Венік у руку
Ды пабудзеш на палку́* —
**Палягчэе**
Шмат плячам.
— З лёгкай парай! — кажуць нам.

*П. Броўка.*



Правообладатель Национальный институт образования

1. Выпішыце радок, у якім перадаецца асноўная думка тэксту.

2. Зрабіце гукавы запіс выдзеленых слоў.

3. Выпішыце з тэксту 3 словы, у якіх літар больш, чым гукаў.

4. Выпішыце з тэксту 3 словы, у якіх літары ***е, я*** абазначаюць два гукі.

5. Слова *паздымае* падзяліце на склады і для пераносу. Выпішыце з тэксту 3 словы, якія нельга падзяліць для пераносу.

6. Выпішыце з тэксту 3 словы, у якіх адбываецца аглушэнне звонкіх зычных.

7. Да слоў *стома, пот* падбярыце і запішыце аднакаранёвыя дзеясловы, каб назіралася чаргаванне галосных [о] — [а].

8. Якому правілу адпавядае правапіс слоў *(ад) сяла, палягчэе, плячам*? Запішыце 3-4 словы з гэтай арфаграмай.

9. Да слова *вада* падбярыце і запішыце 2 аднакаранёвыя словы, каб чаргаваліся гукі [д] — [дз’].

10. Устанавіце адпаведнасць паміж выразамі і іх сэнсам.

| | |
|---|---|
| 1. З лёгкай парай! | а) без трывогі і апаскі; |
| 2. З лёгкай душой. | б) пасля чыйго-небудзь пачынання, прыкладу; |
| 3. З лёгкай рукі. | в) прывітанне і пажаданне добрага здароўя таму, хто толькі што памыўся ў лазні |

Правообладатель Национальный институт образования

# Лексіка. Фразеалогія

## § 22. Лексічнае значэнне слова

**170.** Прачытайце тэкст. Як пра непаўторнасць роднай мовы гаворыць паэт?

Мова,
Родная мова
У марах, у песнях, у снах.
Мае ў ёй кожнае слова
Свой колер, і смак, і пах.
*А. Грачанікаў.*

Паразважайце, ці можа мець слова *«свой колер, і смак, і пах»*.

**171.** Складзіце і запішыце словазлучэнні. Вызначце ў кожным словазлучэнні галоўнае слова. Падкрэсліце словы, якія паказваюць адметнасць беларускай мовы.

Мова (я к а я?) ...; мары (я к і я?) ...; песні (я к і я?) ...; сны (я к і я?) ...; слова (ч ы ё?) ...; колер (я к і?) ...; смак (ч а г о?) ...; пах (я к і?) ...; верш (п р а ш т о?) ... .

Растлумачце сэнс слова *самабытная**. Якія словы ў ім «схаваліся»?

Словы называюць усё, што ёсць на свеце: прадметы, колькасць прадметаў, дзеянні, прыметы. Слова — адна з галоўных адзінак мовы.



Правообладатель Национальный институт образования

Кожнае слова што-небудзь абазначае, гэта значыць, яно мае **лексічнае значэнне.** Лексічнае значэнне — сэнс слова: ***мара*** — *тое, што створана ўяўленнем, фантазіяй.*

Некаторыя словы не называюць, а толькі злучаюць іншыя словы ў словазлучэннях і сказах: *сёння* ***ці*** *заўтра, ісці* ***ў*** *кіно.*

Усе словы мовы — гэта яе слоўнікавы склад, ці **лексіка** (з грэчаскай мовы ***лексіс*** — слова).

**172.** Прачытайце тэкст. Пра што ідзе гаворка ў ім? Як чалавек вучыцца мове? Якога слова не хапае ў апошнім сказе?

Спішыце, устаўце патрэбныя літары, раскрыйце дужкі.

З вуснаў маці яно ўвайшло ў наша жы*(ц/цц)*ё. У ціхіх матчыных песнях, у яе **п..шчоце**[ф] мы адчулі яго прыг..жосць. Як чар..ўны ключ, яно адкрывае нам разнастайныя **цуды** і **та..мніцы** жы*(ц/цц)*я. Яно ўводзіць нас у велічны палац навукі. Незвычайнае хараство чуецца нам у гучанні ... *(Паводле А. Крывіцкага)*.

***хараство́***

Як вы разумееце лексічныя значэнні выдзеленых слоў? Растлумачце выраз *Слова ўводзіць нас у велічны палац навукі.*

Выпішыце з тэксту дзеясловы, якія раскрываюць ролю слова ў жыцці чалавека. Выкарыстоўваючы гэтыя дзеясловы як апорныя, падрыхтуйце вуснае выказванне на тэму «Над намі словы ўладараць» (С. Грахоўскі).

**173.** Спішыце прыказкі, растлумачце іх сэнс.

1. Слова як птушка: выпусціў — не зловіш.
2. Ласкавае слова што дзень ясны.
3. Рана загоіцца, а злое слова — ніколі.
4. Трэба ведаць, калі казаць, а калі памаўчаць.
5. Слухай многа, а гавары мала.



Правообладатель Национальный институт образования

Растлумачыць лексічнае значэнне слова можна наступнымі спосабамі:

● апісаць, пералічыць галоўныя прыметы прадмета, намаляваць словамі прадмет: *дзюны — пясчаныя пагоркі, нанесеныя ветрам*;

● падабраць аднакаранёвае слова: *бярэзнік — бяроза*;

● падабраць блізкае па значэнні слова: *адвага — геройства*;

● раскрыць значэнне частак слова: *дабрадушны — добрая душа (пра чалавека)*.

Лексічнае значэнне слова раскрываецца ў тлумачальным слоўніку і падаецца ў слоўнікавым артыкуле*:

**Баравíна**, -ы, *мн.* -ы, -ін, *ж.* Малады сасновы лес. *Грыбныя баравіны.*

**174.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып.

## Двое над морам

Увосень Стары Журавель вёў клін на поўдзень. У дарозе ён адчуў: сталі здаваць сілы. А ноччу, калі пераляталі мора, сустрэла птушак навальніца. Раз-пораз бліскалі маланкі, не сціхаючы, ракатаў гром. Хмара апусцілася нізка, а хвалі ўздымаліся так высока, нібы выпрабоўвалі на моц крылы птушак. «Не, ніколі мне не перамагчы гэтай навальніцы», — падумаў Стары Журавель, калі ўбачыў, што застаўся адзін. Ён быў гатовы скласці крылы, каб упасці ў бездань, як нехта маленькі, трапяткі прысеў на яго спíну. Гэта была Маладзенькая Ластавачка. «Я адстала ад сябровак. Дапамажыце мне пераляцець мора!» Яшчэ хвіліну назад Жураўлю здавалася, што ён стары, нікому не патрэбны. Ды не, і ад яго



Правообладатель Национальный институт образования

чакаюць дапамогі! Крылы быццам акрэплі. Далей яны паляцелі ўдваіх, перамагаючы дождж і свіст ветру.



Навальніца, нагуляўшыся, сціхла. За морам пачало ўзыходзіць сонца. Неўзабаве паказаўся бераг. «Дзякуй табе, Маладзенькая Ластавачка! Кожны з нас мог загінуць, а разам мы перамаглі ўсё!» — сказаў на развітанне Стары Журавель *(Паводле Р. Бензерука)*.

Раскрыйце лексічныя значэнні слоў *клін, бездань, моц* рознымі спосабамі. Пры неабходнасці карыстайцеся тлумачальным слоўнікам.

Падбярыце да тэксту свой загаловак. Вусна перакажыце тэкст, развіўшы часткі, у якіх апісваецца навальнічнае і спакойнае мора.

**175.** Адгадайце, пра якія кветкі гаворыцца ў вершы. Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі. Дапішыце патрэбнае слова.



Пасля кар..ткай ночкі
Пры..шоў в..сёлы дзень.
Ліловыя __________
Пазвоньваюць — *(д/дз)*інь-*(д/дз)*ень!

*Х. Гурыновіч.*

На аснове якой прыметы ўзнікла назва кветак — *званочкі*?

Успомніце гаваркія назвы кветак, у якіх перадаюцца асаблівасці іх выгляду, лекавыя ўласцівасці і інш. Складзіце загадкі пра гэтыя кветкі.

**176.** Паўтарыце правілы правапісу галосных ***о, э, а***. Выканайце інтэрактыўнае заданне.



Правообладатель Национальный институт образования

## § 23. Адназначныя і мнагазначныя словы

**177.** Прачытайце верш. Колькі лексічных значэнняў маюць словы *кот, мышка*?



**Камп’ютарная мышка**

Ля камп’ютара кот ходзіць,
Толькі мышку не знаходзіць.
Потым стогне ад пакут:
«Нежывая мышка тут!»

*У. Мазго.*



Параўнайце прадмет і істоту, якія называюцца аднолькавымі словамі. Пералічыце іх найбольш важныя і другарадныя прыметы. Складзіце слоўнікавыя артыкулы да слова *мышка*.

Словы, якія маюць адно лексічнае значэнне, называюцца **адназначнымі:** ***водар*** — *прыемны пах, духмянасць.*

Словы, якія маюць некалькі лексічных значэнняў, называюцца **мнагазначнымі:** ***крыніца*** — 1. *Натуральны выхад падземных вод на паверхню зямлі.* 2. *Тое, што дае пачатак чаму-небудзь.* 3. *Пісьмовыя помнікі, дакументы.*

Мнагазначныя словы называюць розныя прадметы, прыметы, дзеянні, аднак яны хоць чым-небудзь падобныя паміж сабой.

**178.** Прачытайце тэкст. Вызначце стыль тэксту. Дайце яму загаловак.

«Ах, якая я прыгожая! — усклікнула **свечка**, гледзячы на сябе ў люстэрка. — Я ўсім падабаюся!» І на самай справе яна ўсім падабалася. Калісьці яе запальвалі ў беднай хаціне, калі сям’я збіралася вячэраць. Яна была прымацавана да **капелюша** мастака, які нават ноччу не мог адарвацца ад кар-



Правообладатель Национальный институт образования

ціны. З ёю скважны стары адчыняў свой **куфар** і пералічваў чырвонцы. Калі расхваляваная дзяўчына пісала ліст, то слёзы капалі ў іх абедзвюх. Жыццё свечкі было напоўнена прыгодамі, таямніцамі і радасцямі.



Але на **свет** з'явілася шкляная **лямпачка**. Лямпачкі асвятлялі пакоі, вуліцы, дарогі. Яны паўсюль ззялі рознымі колерамі, выпісвалі цэлыя рэкламы. Свечку ўсе закінулі. Аднойчы паэт дастаў яе, абцёр пыл, запаліў і паставіў на стол. «Лямпачка, канечне, зручней, — падумаў ён. — Але чарадзейнае святло жывога полымя нясе фантазію, абуджае маю думку». Таму паэт пісаў толькі са свечкаю. І яна была яму ўдзячная *(Паводле У. Бутрамеева)*.

Колькі значэнняў маюць выдзеленыя словы? Складзіце і запішыце словазлучэнні з выдзеленымі словамі «прыметнік + назоўнік». Калі слова мнагазначнае, падбярыце прыметнікі, каб яны дапамаглі зразумець сэнс мнагазначных слоў.

***ззяць***

**179.** Знайдзіце ў правым слупку патрэбную частку, якая зробіць прыказку закончанай. Растлумачце сэнс прыказак. Запішыце іх.

| | |
|---|---|
| А..клад не ідзе... | не зробіцца. |
| Аб..цанкамі сыты... | не будзеш. |
| Нічога само... | *(у/ў)* лад. |
| Чужым розумам... | не наносіць. |
| Адна пч..ла мёду... | не пражывеш. |

Падкрэсліце назоўнікі. Вызначце, якія з іх з'яўляюцца адназначнымі, а якія — мнагазначнымі.

- У словах з прапушчанымі літарамі растлумачце арфаграмы.



Правообладатель Национальный институт образования

**180.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак.



Паляна заслана шырокім лісцем, падобным да ласіных **вушак**. Нездарма ў перакладзе са старапольскай мовы слова «ландыш» азначае ‘вушкі лані’. Быццам **завушніцы**, пазвоньваюць у гэтых «вушках» срэбраныя ланцужкі пахкіх кветак.

**Корань** у ландыша жыве больш за дваццаць гадоў. Першы раз ён цвіце ў сямігадовым узросце, а ў дзесяць-дванаццаць гадоў страчвае гэту здольнасць. Штогод з каранёў імкнецца на свет дружнае лісце, а кветкі з’яўляюцца толькі два-тры разы. Вось і выходзіць, што за кароткі век ландыш цвіце ўсяго толькі два ці тры разы *(Паводле Х. Гурыновіча)*.

У якіх значэннях могуць ужывацца выдзеленыя словы? Складзіце з імі словазлучэнні, каб былі зразумелымі лексічныя значэнні мнагазначных слоў. Раскажыце, чым падобныя гэтыя прадметы.

Складзіце выказванне з элементамі разважання «Беражыце ландышы!». Выкажыце ў звароце да аднакласнікаў заклапочанасць абыякавым стаўленнем некаторых людзей да прыроды і перакanайце іх не знішчаць яе прыгажосць дзеля ўцехі.

## § 24. Прамое і пераноснае значэнне слова

**181.** Прачытайце ўрывак з казкі «Музы́ка-чарадзей».

Ідзе аднаго разу музы́ка лесам, насустрач — дванаццаць галодных ваўкоў. Няма ў музыкі нічога ў руках, толькі пад пахаю скрыпка ў мяшэчку. Дастаў музыка скрыпку, прыхінуўся да дрэва ды і павёў смычком па струнах. Як жывая загаварыла скрыпка. Замерлі кусты і дрэвы — лісткомне варухнуць. А ваўкі як стаялі, так і скамянелі.



Правообладатель Национальный институт образования

Пайшоў музыка далей. Сеў на беразе ракі ды зайграў так прыгожа, што заслухаліся і неба, і зямля. А калі **ўрэзаў** полечку, дык усё вакол давай **скакаць.** Зоркі **мітусяцца**, хмаркі плаваюць па небе, а рыба так узгулялася ў рацэ, што вада **кіпіць**, як вада ў гаршку.

Спішыце другі абзац тэксту, замяняючы выдзеленыя словы адпаведнымі па сэнсе дзеясловамі. Які тэкст, на вашу думку, больш прыгожы?

Для даведкі: *танцаваць, зайграць, бурліць, мігцець.*

Знайдзіце ў тэксце і падкрэсліце іншыя дзеясловы, якія ўжыты ў пераносным значэнні.

Слова можа мець прамое і пераноснае значэнне. **Прамое значэнне** — гэта асноўнае лексічнае значэнне слова: ***возера*** *— вялікі прыродны вадаём.*

**Пераноснае значэнне слова** — гэта лексічнае значэнне слова, якое ўзнікла на аснове падабенства. Перанос адбываецца, калі паміж прадметамі, прыметамі, дзеяннямі ёсць штосьці падобнае: ***кропля*** — 1. Маленькая круглая часцінка: *кропля расы.* 2. *перан.* Нязначная колькасць чаго-небудзь: *кропля цукру* (зусім мала).

**182.** Спішыце тэкст. Устаўце патрэбныя словы ў пераносным значэнні.

У адным горадзе жылі сем мастакоў. Горад гэты быў вельмі змрочны. Над ім увесь час ... *(віселі, ішлі)* чорныя хмары. Ад іх на ўвесь горад ... *(падаў, клаўся)* шэры цень. З-за хмар не ... *(выглядвала, паказвалася)* аранжавае сонейка. Не ... *(трымцела, шалясцела)* на дрэвах зялёная[ф] лістота. Не *(разліваліся, відНеліся)* у вышыні блакітныя нябёсы. І ўсё, што малявалі мастакі, было шэрым і непрыгожым. Але аднойчы



Правообладатель Национальный институт образования

ў горад прыляцеў вецер і ... *(разагнаў, развеяў)* чорныя хмары.[сн] Мастакі не паверылі сваім вачам... *(Паводле А. Кобец-Філімонавай).*

Як вы разумееце выраз *не паверыць сваім вачам*? Вусна складзіце з гэтым выразам сказ.

Прыдумайце працяг апавядання. Падбярыце да тэксту загаловак. Вусна перакажыце ўвесь тэкст.

**183.** Спішыце тэкст. Падкрэсліце словы ў пераносным значэнні.



У каробцы спяць алоўкі —
каляровыя галоўкі.
Іх буджу я на зары:
— Прачынайцеся, сябры!

Нас чакае спраў бясконца...
Сем алоўкаў — сем братоў,
маляваць усё на свеце
кожны з вас заўжды гатоў!

*П. Макаль.*

Са словамі, ужытымі ў пераносным значэнні, складзіце словазлучэнні, у якіх яны будуць ужывацца ў прамым значэнні.

- Знайдзіце словы з арфаграмамі-зычнымі, растлумачце іх правапіс.

**184.** Са слоў, што ў дужках, выберыце тыя, у спалучэнні з якімі прыметнікі будуць ужывацца ў пераносным значэнні.

Гарачы *(чай, характар)*, калючы *(вожык, погляд)*, балючая *(размова, рана)*, светлыя *(валасы, успаміны)*, сонечная *(усмешка, раніца)*, жалезная *(рыдлёўка, воля)*, чэрствы *(хлеб, чалавек)*.

- Запішыце словазлучэнні, абазначце ў іх галоўнае слова.

З двума словазлучэннямі на выбар складзіце і запішыце сказы.



Правообладатель Национальный институт образования

**185.** Разгледзьце малюнак. Складзіце сказы, у якіх пра *дзень, сонца, вясёлку, дождж, кветкі, дрэва і лісточкі на дрэве* гаварылася б як пра адушаўлёныя прадметы. Размясціце сказы так, каб у вас атрымаўся тэкст. Дайце яму загаловак. Падкрэсліце словы, ужытыя ў пераносным значэнні.



**186.** Паўтарыце правілы правапісу галосных ***е, ё, я***. Выканайце інтэрактыўнае заданне.

## § 25. Сінонімы

**187.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Падумайце, аднолькавыя ці розныя па сэнсе выдзеленыя словы.

Мы сустрэлі маму яшчэ на парозе. Тут жа ўзялі ў яе з рук цяжкую сумку, дапамаглі распрануцца і ўрачыста павялі ў пакой. Там на самым відным месцы, як на **выстаўцы**, віселі нашы малюнкі — Наташын голуб і мой зімовы лес.

— Ого! — здзіўлена сказала мама і спынілася ля нашай **выставы**. — Ого! — паўтарыла яна. — Дык я трапіла на **вернісаж**!

Мы ніколі не чулі гэтага слова — вернісаж. І не ведалі, што яно азначае.

— Віншуем цябе са святам, мамачка! — няўпэўнена прамовілі мы.



Правообладатель Национальный институт образования

— Дзякуй, дзякуй, мае залатыя мастакі! І калі ў нас сёння вернісаж, то на вернісажы звычайна мастакам гавораць цёплыя, шчырыя словы, хваляць іх, захапляюцца іх талентам. Вось і я... — мама пацалавала нас па чарзе, дастала са сваёй сумкі дзве каробкі цукерак і дала іх нам.

Вось што, аказваецца, азначала тое дзіўнае слова — вернісаж. Нам з сястрой яно спадабалася *(Паводле А. Васілевіч)*.

Ці правільна зразумелі дзеці значэнне слова *вернісаж*? Растлумачце яго лексічнае значэнне.

Выпішыце з тэксту дзеясловы маўлення *(сказала...)*. Што падобнага і рознага заўважылі вы ў сэнсе слоў?

***та́лент***

Словы, якія называюць адзін і той жа прадмет, з'яву, дзеянне ці прымету, адносяцца да адной часціны мовы, але па-рознаму вымаўляюцца і пішуцца, называюцца **сінонімамі**: *гаворка, гутарка, размова*.

Сінонімы паміж сабой адрозніваюцца адценнямі значэнняў: *голасна, гучна, аглушальна; ісці, ступаць, крочыць, маршыраваць, плесціся*.

**188.** Прачытайце тэкст. Замяніце выдзеленыя словы сінонімамі. Пры спісванні дапішыце канчаткі прыметнікаў.

У трамвай праз пярэдн.. дзверы[ф] па прыступках **падымаўся** старэньк.. дзядок. Хлопчык убачыў, як цяжка **падымацца** стар.. чалавеку з нізк.. прыступкі. Ён **падняўся** з месца, падаў сів.. дзядулю руку і тут жа прапанаваў сесці. Дзядуля падзякаваў клапатлів.. хлопчыку, сеў і прыхінуў яго да сябе *(Паводле А. Пальчэўскага)*.

- У апошнім сказе падкрэсліце галоўныя і дададзеныя члены сказа.



Правообладатель Национальный институт образования

**189.** Прачытайце тэкст, дайце яму загаловак.

Ці думалі вы, што звычайна людзі пра чалавека рэдка гавораць: прыгожы? Гавораць: харошы. Харошы — значыць добры, шчыры, душэўны, сардэчны, чулы, уважлівы, спагадлівы, праўдзівы, цікавы. Такі чалавек неабходны ўсім, з кім ён жыве, сябруе, вучыцца, працуе.

Такіх людзей скрозь любяць, паважаюць і шануюць. Нездарма кажуць: добрая душа. Гэтыя простыя словы вельмі многа значаць! Харошы, добры, праўдзівы — ён усім відзён, бо і на абліччы відаць уся яго прыгажосць. Вось самае дарагое багацце і шчасце чалавека *(Паводле В. Віткі)*.

Вызначце агульнае значэнне, якое аб’ядноўвае прыметнікі, ужытыя ў тэксце. Запішыце гэтыя прыметнікі-сінонімы.

Знайдзіце ў тэксце рад дзеясловаў-сінонімаў.

Растлумачце значэнне выразу *добрая душа*. Ці ёсць сярод вашых блізкіх і знаёмых чалавек, пра якога можна сказаць *добрая душа*? Раскажыце пра яго, выкарыстоўваючы сінонімы.

Сінонімы даюць магчымасць пазбягаць паўтораў слоў і служаць сродкам сувязі сказаў у тэксце.

Сінанімічнымі могуць быць не толькі словы, але і ўстойлівыя спалучэнні слоў: *блізка — рукой падаць, за два крокі*.

**190.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце ў ім словы, якія маюць аднолькавы сэнс, але адрозніваюцца адценнямі значэнняў. Пабудуйце сінанімічны рад: запішыце сінонімы ў той паслядоўнасці, у якой узмацняецца ступень прыметы.

## Слова пра мужнасць

Прырода надзяліла чалавека цудоўным дарам — рашучасцю аддаваць сябе высокай мэце. Гэты дар мы называем мужнасцю. Без яе само жыццё было б іншым. Смеласць жыла ў людскім



Правообладатель Национальный институт образования

імкненні скарыць агонь, ваду і маланку. Адвага адкрывала мацерыкі, абжывала пустыні, праз ільды, сцюжу праклала Паўночны шлях. Гераізм прыводзіў чалавека і чалавецтва да перамог у вайне і міры — у працы, барацьбе, навуцы *(Паводле У. Карпава)*.

● Знайдзіце ў тэксце слова, якое мае значэнне ‘гатоўнасць прыняць і ажыццявіць сваё рашэнне’. Зрабіце яго фанетычны разбор.

**191.** Якія з сінонімаў-прыметнікаў могуць дапасоўвацца да прыведзеных назоўнікаў? Складзіце і запішыце ўсе магчымыя словазлучэнні.

Мокр.., вільготн.. *(зямля, паветра)*, легкадумны, б..стурботны *(дзень, чалавек)*, г..ройскі, храбры *(чалавек, учынак)*, в..домы, знакаміты *(твор, чалавек)*, дарагі, шаноўны *(госць, падарунак)*.

● Якім правілам падпарадкоўваецца правапіс ***е, я*** ў словах з прапушчанымі літарамі?

З двума словазлучэннямі (на выбар) запішыце складаны сказ са злучнікам ***а***.

**192.** Прачытайце верш. Выпішыце з яго выдзеленыя дзеясловы і падбярыце да іх сінонімы.



І вядуць, вядуць сцяжынкі
нас па цераме лясным.
То **гамонім** з арабінкай,
то з асінкаю **шумім**,
то **цікуем** за ваверкай,
то ля дзятла пастаім.

*Н. Галіноўская.*

Д л я д а в е д к і: *падглядаць, балбатаць, шалясцець, сачыць, шапацець, размаўляць, балабоніць, гаварыць, назіраць.*



Правообладатель Национальный институт образования

У якіх дзеясловах выражаецца дадатковае сэнсавае адценне? Якую б памету вы паставілі да слоў з утвораных сінанімічных радоў — *нейтральнае* (ужываецца ва ўсіх стылях маўлення), *кніжнае* (ужываецца ў навуковых, публіцыстычных тэкстах, афіцыйных дакументах), *размоўнае* (ужываецца толькі ў гутарковым стылі)? Складзіце сказы з двума сінонімамі, каб адно слова адносілася да нейтральнай лексікі, а другое — да размоўнай.

**193.** Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Правапіс галосных (падагульненне)».

## § 26. Антонімы

**194.** Якія з прыведзеных слоў з'яўляюцца антонімамі? Якое слова лішняе ў кожным радзе? Запішыце антанімічныя пары.

1. Блізкі, далёкі, добры. 2. Радасць, сум, адзінота. 3. Выліць, наліць, даліць. 4. Адважны, баязлівы, страшны. 5. Актыўнасць, бадзёрасць, пасіўнасць. 6. Горача, светла, холадна.

• Знайдзіце словы, у якіх свісцячыя зычныя перад мяккімі зычнымі вымаўляюцца мякка.

**Антонімы** — словы адной і той жа часціны мовы з супрацьлеглым значэннем: *радасць — сум, чысты — брудны.*

Словы-антонімы характарызуюць прадметы, прыметы, з'явы, дзеянні па якой-небудзь адной іх асаблівасці, але з супрацьлеглых бакоў. Таму антанімічныя пары ўтвараюць словы адной часціны мовы.

**195.** Спішыце прыказкі і прымаўкі. Падкрэсліце ў іх антонімы.

1. Свая хатка — родная матка, а чужая — мачаха. 2. Згодаю дом збудуеш, а нязгодаю — гатовае разбурыш. 3. Лёгка



Правообладатель Национальный институт образования

пасварыцца, цяжка памірыцца. 4. Ліха перамелецца, дабро наступіць. 5. Новых сяброў набывай, а старых не забывай. 6. Сыты галоднага не разумее. 7. Калі ёсць пачатак, то будзе і канчатак.

У якім значэнні ўжыта слова *канчатак* у апошняй прыказцы? Якое значэнне гэтага слова вы ведаеце?

**196.** Падбярыце да слоў антонімы ў адпаведнасці са значэннем.

**мяккі**
- пра хлеб
- пра матэрыял
- пра клімат

**стары**
- пра дом
- пра чалавека

**лёгкі**
- пра ўрок
- пра мароз
- пра характар

**сухое**
- пра малако
- пра паветра

Запішыце словазлучэнні з антонімамі паводле адной са схем (на выбар).

**197.** Разгледзьце малюнак. Якая пара года на ім адлюстравана?





Правообладатель Национальный институт образования

Па малюнку складзіце сказы, выкарыстоўваючы антонімы.

Д л я  д а в е д к і: *холад — цяпло, вечар — раніца, сонечны — пахмурны, старэйшы — малодшы, адлятаць — прылятаць, маўчаць — спяваць.*

Як выкарыстанне слоў з супрацьлеглым значэннем дапамагае перадаць думкі?

- Да якіх часцін мовы адносяцца прыведзеныя пары слоў?

**198.** Прачытайце тэкст, дайце яму загаловак.

**нізаво́шта**

Ні пра кога з лясных жыхароў не складзена столькі казак, як пра лісіцу-сястрыцу. Успомніце, як рыжая параіла галоднаму ваўку налавіць рыбкі хвастом. Не кажучы ўжо пра птушак і зайцоў.

Любіць ліса наведацца ў вёску ў госці да курэй, гусей і качак.[сн] Схопіць пеўня і нізавошта не а..пусціць — толькі хвост мільгне. Зімою лісу можна *(у/ў)*бачыць на заснежаным полі ці лузе. І паводзіць яна сябе нібы акрабатка: то замрэ на месцы, то раптам па..скочыць угору. Праз імгненне зар..ецца *(у/ў)* снег, а адкапаецца толькі тады, як мыш *(у/ў)*палюе. Паляўнічыя кажуць: ліса мышкуе, што значыць — ловіць мышэй *(Паводле У. Ягоўдзіка)*.

Спішыце другі абзац тэксту, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце дзеясловы-антонімы. З якой мэтай яны ўжываюцца пры апісанні лісы? Якія якасці лісы раскрываюцца праз стварэнне кантрасту? Раскажыце пра ролю антонімаў у тэксце.

Ці можна падабраць антонімы да назваў звяроў, птушак? Чаму?

Успомніце казкі пра лісу. Сцісла перакажыце адну з іх. З дапамогай прыметнікаў-антонімаў ахарактарызуйце герояў казкі.



Правообладатель Национальный институт образования

**199.** Спішыце верш. Падкрэсліце антонімы, якія ўжыў аўтар верша.

Сяброўства бывае featured рознае —
і цёплае, і марознае,
і вечнае, і да пары,
бо розныя нашы сябры.

*Р. Тармола.*

У якім значэнні — прамым ці пераносным — ужыты ў вершы прыметнікі *цёплы, марозны, вечны*? Падбярыце антонімы да гэтых мнагазначных слоў у розных значэннях. Дакажыце, што мнагазначныя словы не ва ўсіх значэннях могуць мець антонімы.

## § 27. Амонімы (азнаямленне)

**200.** Прачытайце верш. Якое з выдзеленых слоў з'яўляецца мнагазначным?



Ірка ў студню* зазірнула.
**Зорка** ў студні патанула.
**Журавель** дастаў вядзерца —
зорка ў воблаках смяецца.

*У. Мазго.*



Які малюнак раскрывае значэнне выдзеленага слова *журавель*?

Прачытайце слоўнікавыя артыкулы да выдзеленых слоў.

Паразважайце, чым падобныя паміж сабой прадметы і з'явы, якія абазначае мнагазначнае слова *зорка*.

**Зорка** — 1. Нябеснае цела, якое можна бачыць, у форме ззяючай кропкі. 2. *перан.* Пра дзеяча мастацтва, навукі. 3. Фігура з трохвугольнымі выступамі па акружнасці.

Ці ёсць агульнае ў лексічных значэннях слова *журавель*?

**Журавель**[1] — вялікая балотная птушка з доўгімі нагамі і доўгай шыяй.

**Журавель**[2] — прыстасаванне пры калодзежы, якое служыць для дставання вады.



Правообладатель Национальный институт образования

**Амонімы** — словы адной і той жа часціны мовы, аднолькавыя па гучанні і напісанні, але розныя па значэнні.

Лексічныя значэнні слоў-амонімаў не маюць нічога агульнага паміж сабой. Таму ў тлумачальным слоўніку амонімы падаюцца як розныя словы з асобнымі слоўнікавымі артыкуламі.

***Бор*** $^{1}$ — *хімічны элемент, які ўваходзіць у састаў многіх мінералаў.*

***Бор*** $^{2}$ — *стары сасновы лес.*

***Бор*** $^{3}$ — *свердзел, які выкарыстоўваецца ў зубалячэбнай справе.*

**201.** Прачытайце верш-скорагаворку. Якое слова ў ім мае амонім? Растлумачце лексічныя значэнні аманімічных слоў. Якой часцінай мовы яны з'яўляюцца?

Сёння досвіткам Аўсей
Знайшоў аўсянку ў аўсе.
Быў авёс расяны зранку —
У расе ўся аўсянка.

*К. Камейша.*

Знайдзіце ў тэксце слова, што мае лексічнае значэнне 'пара́, калі яшчэ толькі пачынае світаць'.

Вывучыце скорагаворку на памяць. Паспаборнічайце з сябрамі на хуткасць і правільнасць чытання.

**202.** Дапоўніце сказы так, каб стала зразумела, пра што ідзе гаворка. Запішыце.

1. Кран не працуе. 2. Я забыўся, дзе той гасцінец. 3. Дзеці ўбачылі норку. 4. Любуюся берасцянкай.



Правообладатель Национальный институт образования

**203.** Прачытайце табліцу. Дапоўніце яе прыкладамі з практыкавання 202.

| Прыметы амонімаў | Прыклады | |
|---|---|---|
| Не маюць нічога агульнага ў лексічным значэнні | *ласка*[1] — *пяшчотныя, цёплыя адносіны* | *ласка*[2] — *невялікая драпежная жывёліна* |
| Маюць розныя роднасныя словы | *ласкавы, лашчыць* | *ласачка* |
| Спалучаюцца з рознымі словамі | *мацярынская ласка* | *жвавая ласка* |
| Маюць розныя сінонімы, антонімы | *пяшчота* *грубасць* | — |

Чаму да некаторых слоў-амонімаў нельга падабраць сінонімы і антонімы?

**204.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль і тып.

## Крылаты рыбак

**Чайка*** — усім **вядомы*** рыбак. Але не кожны задумваецца, чаму яна заўсёды мае ўлоў.

Паназіраем за чайкай. Вось чайка пакалыхваецца на хвалях, быццам белы **паплавок***. Нібы не рыбачыць, а задумалася пра нешта. Раптам узлёт — і чайка бясшумна падае ў ваду. Глядзіш, у дзюбе бліскучая, як лядзяш[ф], рыбка. Задумлівая чайка не дрэмле на вадзе. Яна рашае, на якую вышыню ўзляцець, каб потым нырнуць у ваду. Умела рыбачыць чайка! Чайка не толькі зоркая, але і разумная птушка. Таму яна заўсёды з уловам *(Паводле В. Кастручына)*.

Вызначце лексічныя значэнні выдзеленых слоў. Складзіце з амонімамі сказы.



Правообладатель Национальный институт образования

● Знайдзіце ў тэксце аднакаранёвыя словы да слоў *рыба, лавіць*. Дапоўніце рады аднакаранёвых слоў уласнымі прыкладамі.

Выпішыце з тэксту дзеясловы, якія дапамагаюць уявіць, як рыбачыць чайка. Выкарыстоўваючы іх, складзіце выказванне «Незвычайны рыбак».

**205.** Адгадайце загадкі М. Пазнякова і растлумачце, чаму адгадкі з’яўляюцца амонімамі.

I. Адзін **паспеў** на **поўдні**,
Барвовым сокам поўны.
Набіта ў ім бітком
За сотню больш браткоў.

Другі наш добры госць
Падорыць прыгажосць.
Кулоны і пярсцёнкі
Аздобіць густам тонкім.

II. Ён прыйшоў уночы,
Нам заплюшчыў вочы.
І на крылах нас панёс
У краіну ўсіх дзівос.

На палянцы лясной
Паказаў мне ўлетку
І назваў сабой
Прыгажуню кветку.

У першым чатырохрадкоўі выдзелены словы, якія маюць амонімы. Складзіце загадкі з гэтымі словамі.

**206.** Спішыце верш. Падкрэсліце амонімы. Растлумачце лексічныя значэнні аманімічных слоў.

Пара коней цягне воз,
Гэта ўсё ж не паравоз.
Паравоз бяжыць, гудзе,
Сто вазоў адзін вязе.
А ў катле клякоча пара.
Паравоз каню — не пара.

*І. Муравейка.*

У другім сказе падкрэсліце граматычную аснову.

**207.** Паўтарыце правілы вымаўлення звонкіх і глухіх, свісцячых і шыпячых зычных. Выканайце інтэрактыўнае заданне.



Правообладатель Национальный институт образования

## § 28. Агульнаўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку

**208.** Прачытайце тэкст.

Даведаўшыся, што Ангелінка захварэла, прыехаў дзед Юзік яе праведаць. Узрадаваўся, калі ўбачыў малую вясёлай, жвавай, шчабятлівай. Сядзіць, толькі паспявае на яе пытанні адказваць.

— Дзядулечка, а чаму баба Уладзя не прыехала? — раптам запыталася Ангелінка.

— Бабулі цяжка хадзіць, ногі баляць, а на вуліцы снег ест, многа снегу, — адказаў дзед Юзік на сваёй вясковай гаворцы.

Не магла здагадацца Ангелінка, што «ест» — гэта «ёсць», перапытала:

— Бабуля есць снег? Скажы ёй, што снег есці нельга. Калі бабуля будзе есці снег, то хутка захварэе *(З часопіса «Вясёлка»)*.

Ці здагадаліся вы, чаму захварэла Ангелінка?

Хто ўдзельнікі гутаркі? Якімі рысамі характарызуецца іх маўленне? Якія словы пацвярджаюць гэта?

Знайдзіце слова, якое не ўжываецца ў беларускай літаратурнай мове.

Лексіка беларускай мовы паводле ўжывання падзяляецца на словы агульнаўжывальныя і словы абмежаванага ўжытку.

**Агульнаўжывальныя словы** — аснова лексікі беларускай мовы. Іх ужываюць і разумеюць усе носьбіты беларускай мовы: *дарога, вясёлы, ісці, пяць* і інш.

**Словы абмежаванага ўжытку** выкарыстоўваюцца жыхарамі пэўнай мясцовасці, людзьмі пэўнай прафесіі.



Правообладатель Национальный институт образования

**209.** Прачытайце тэкст. Выпішыце з яго 10 агульнаўжывальных слоў.

У Беларусі жывуць два віды зайцоў — бяляк і русак. Бяляк атрымаў сваю назву ад белага футра, якое апранае зімой. Русак увесь год у шэранькім ходзіць. Жывуць яны па-рознаму. Палі, пералескі, узлескі — уладанні русака, а бяляк — жыхар глухіх лясоў.

У сакавіку ў зайца-русака з'яўляюцца зайчаняты. Накарміўшы дзіцянят малачком, зайчыха-маці ўцякае, пакідае іх адных. Чаму не застаецца пры зайчанятах? Справа ў тым, што сляды нованароджаных зайчанят не маюць паху. Лісіца ці іншы драпежнік пройдзе і не заўважыць іх. А калі б зайчыха-маці была побач, то гэта наваляло б на іх згубу. Вось і выходзіць, што зайчыха не такая і дрэнная маці *(Паводле А. Курскага)*.

- Знайдзіце ў тэксце роднасныя словы да слова *заяц*.

Як вы думаеце, ці можна назваць зайчыху клапатлівай маці? Вусна перакажыце тэкст, уключыце ў пераказ свае разважанні.

**Дыялектныя словы** — гэта словы, якія ўжываюцца на абмежаванай тэрыторыі і выкарыстоўваюцца ў мясцовых гаворках: *забіжа́ць* (крыўдзіць), *шу́ма* (смецце), *няге́глы* (няздольны), *лацве́й* (лепш).

**210.** Прачытайце народныя прыкметы. Знайдзіце адпаведнікі дыялектным словам. Растлумачце, чым адрозніваюцца агульнаўжывальныя і дыялектныя назвы.

1. Снег наліпае на дрэвы — чакай адле́гі. 2. Мала зорак на небе — на непаго́дзь. 3. У студзені мяце́ль — у ліпені будзе заліве́нь. 4. Студзень пагодны — год будзе пло́дны. 5. Сена



Правообладатель Национальный институт образования

моцна пахне — ноччу дождж а́хне. 6. Ясны веташо́к — на сцюжу. 7. Зімою частая бразго́та — жыта не ўродзіць.

Спішыце, замяняючы дыялектныя словы агульнаўжывальнымі.

Д л я д а в е д к і: *непагадзь, адліга, мяцеліца, заліўны (моцны) дождж, месяц, мокры снег, нечакана пачацца (пра дождж), ураджайны.*

Якія народныя прыкметы вы ведаеце?

● Знайдзіце ў сказах беларускія назвы месяцаў. Чаму яны так названыя?

**211.** Прачытайце ліст, які даслаў хлопчык у рэдакцыю часопіса. Да якога стылю адносіцца тэкст? Што вы параіце хлопчыку?

З малых гадоў я зацікавіўся кам..нямі і каменьчыкамі. Дома ў маёй калекц..і ёсць кам..нь — бохан хлеба, кам..нь — чортаў палец, кам..нь-капыт, розныя каменьчыкі-сэрцайкі. Не так даўно мы з брацікам Максімам знайшлі кам..нь, які нагадвае **ступа́к** нейкага в..лікана. Знайшлі мы яго на пл..цоўцы каля новай бібліі..тэкі, недалёка ад музея валуноў. І ўявілі: жыў недзе каменны в..лікан. Дачуўся ён, што будуюць новую біблі..тэку, і пабег паглядзець на яе. Бег, бег, спатыкнуўся і згубіў свой ступак. Але так сп..шаўся, што не прымеціў гэтага і пабег далей.

Цяпер мы думаем, што з гэтым ступаком рабіць: у музей аддаць ці дома пакінуць *(З часопіса «Лесавік»)*.

Як вы разумееце значэнне выдзеленага слова? Якім спосабам можна яго растлумачыць? Да якога разраду лексікі паводле ўжывання адносіцца слова *ступак*?

Выпішыце словы з прапушчанымі літарамі, растлумачце іх правапіс. Да якога разраду лексікі паводле ўжывання яны адносяцца?

Знайдзіце ў тэксце слова, што мае значэнне ‘вялікі камень — абломак горнай пароды’. Складзіце з гэтым словам сказ.



Правообладатель Национальный институт образования

**212.** Прачытайце верш. Выпішыце з яго два сказы: пытанне, якое задае аўтар, і адказ на яго.

## Галоўныя словы

Я слоўнік гартаю,
Прачытваю зноў —
Якіх там, якіх там
Няма толькі слоў!
Чытаю і думаю,
Хмурачы бровы:
Якія з іх будуць
Галоўныя словы?
Якія? Гадаю,
А думкі — што вір*.
А словы галоўныя —
МАМА і МІР.

*М. Дукса.*

Вывучыце верш на памяць.

***спартсме́н***

**213.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце назвы прадстаўнікоў розных прафесій і заняткаў. Выпішыце з тэксту гэтыя назоўнікі, паставіўшы іх у форму назоўнага склону адзіночнага ліку.

Па тым, як апрануты чалавек, мы пазнаём салдата, матроса, міліцыянера, шахцёра, лесніка, пажарнага, доктара, прадаўца, спартсмена і іншых людзей самых розных прафесій.

І цябе пазнаюць, калі ты ідзеш у школу і са школы. Па чым пазнаюць? Па знешнім выглядзе, па рэчах, якія ты нясеш. Ты павінен быць акуратным у абыходжанні з адзеннем, абуткам, сачыць, каб яны заўсёды былі чыстыя, шанаваць рэчы, за якія ты адказваеш *(Паводле В. Віткі)*.

Ці ведаеце вы спецыяльныя словы, што выкарыстоўваюцца людзьмі якой-небудзь з пералічаных прафесій?


Правообладатель Национальный институт образования

Акрамя дыялектных слоў, да слоў абмежаванага ўжытку адносяцца прафесійныя словы і тэрміны.

**Прафесійныя словы** — гэта словы, якія выкарыстоўваюцца людзьмі пэўнай прафесіі ці спецыяльнасці: *про́паліс, дыма́р, пчальні́к* (мова пчаляроў).

**Тэрміны** — гэта словы, якія абазначаюць навуковыя і тэхнічныя паняцці: *а́там, су́фікс, трохвуго́льнік, эква́тар, ба́йка* і інш.

**214.** Прачытайце тэкст. Выпішыце з тэксту словы, якія выкарыстоўвае ў сваім прафесійным маўленні Пецева мама.

### Маміна работа

Пецева мама была тынкоўшчыцай. Яна тынкавала* дамы. Даўно хацелася Пецю паглядзець, як гэта робіцца, ды ўсё не ўдавалася.

Неяк раніцай выбег Пеця на балкон, глядзіць, а побач яшчэ адзін балкон з'явіўся. Ды не просты, а вісячы. Хочаш — падымеш яго, хочаш — апусціш. А ў люльцы* стаіць мама са сваёй памочніцай. З вялізнага карыта дзяўчына брала шэрае цеста кельмай* і накідвала на сцяну дома. А Пецева мама разгладжвала яго роўна-раўнюсенька. Шэрае цеста станавілася цвёрдым і белым. Паступова дом апранаўся ў новую прыгожую вопратку.

Зразумеў Пеця, якая добрая ў мамы работа. Патрэбная (*Паводле Я. Пермяка*).

**памо́чнік**

З дапамогай тлумачальнага слоўніка растлумачце лексічныя значэнні слоў *тынкаваць, люлька, кельма*.

Што вы ведаеце аб прафесіях сваіх бацькоў? Падрыхтуйце паведамленне «Маміна работа» або «Татава работа», ужываючы прафесійныя словы.



Правообладатель Национальный институт образования

**215.** Вызначце, у якой прафесіі ці галіне навукі ўжываюцца прыведзеныя прафесійныя словы і тэрміны.

Верш, эпітэт, байка, апавяданне, ідэя.
Ін’екцыя, эпідэмія, прафілактыка, кардыяграма.
Нотны стан, партытура, скрыпічны ключ, гама.
Пялёстак, чашалісцік, песцік, сцябло.

- Выпішыце словы з літарай ***я*** ў першым складзе перад націскам.

**216.** Прачытайце тэкст. Да якога стылю ён адносіцца? Якія словы з тэксту пацвярджаюць ваш адказ? Выпішыце з тэксту тэрміны.

Маланка — гіганцкі электрычны разрад у атмасферы. Ён звычайна праяўляецца яркай успышкай святла, што суправаджаецца громам. Звычайна маланка ўтрымлівае некалькі паўторных разрадаў, іх лік можа даходзіць да некалькіх дзясяткаў. Асобы характар маюць плоская і шаравая маланкі. Яны могуць суправаджацца моцнымі разбурэннямі, быць прычынай гібелі людзей *(Геаграфічны энцыклапедычны слоўнік)*.

- Знайдзіце ў тэксце словы з падоўжанымі зычнымі.

**217.** Прачытайце тэкст, дайце яму загаловак, выкарыстоўваючы словы з тэксту. Вызначце яго стыль. Спішыце першы абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары і раскрываючы дужкі.

У згодзе жылі калісьці Маланка і Гром. Любіла Маланка, калі хмары *(у/ў)*крывалі неба і ч..рным рабілася *(у/ў)*сё навокал. Гром гл..дзеў на Маланку і радаваўся. Ды неяк гарачая Маланка запаліла дрэва. Гром разгневаўся на Маланку, пачаў сварыцца на яе.[сн] Але Маланка не паслухалася, пачала іншыя дрэвы і будынкі паліць, людзей крыўдзіць.

З той пары толькі блісне Маланка, Гром ужо злуецца, сварыцца на яе. Маланка яшчэ больш разыходзіцца — Гром


Правообладатель Национальный институт образования

голас павышае. Перастане яна сваволіць, тады і Гром сціхае. А новая навальніца пачынаецца — усё паўтараецца. Кароткая памяць у ліхой Маланкі! *(Паводле Ю. Ярмыша)*.

Выпішыце з тэксту спалучэнні слоў, у якіх дзеясловы ўжыты ў пераносным значэнні.

Чым падобныя і чым адрозніваюцца тэксты практыкаванняў 216 і 217? Які тэкст вызначаецца дакладнасцю і сцісласцю апісання, а які — маляўнічасцю ў перадачы падзей? Якая лексіка дапамагае раскрыццю задумы аўтараў? Перакажыце адзін з тэкстаў, захоўваючы лексічныя асаблівасці стылю.

**218.** Прачытайце верш. Пра якую прафесію гаворыцца ў ім? Выпішыце прафесійныя словы сталяроў.

## Сталяры

Мы са Слаўкам — сталяры:
робім лаўку на двары.
Жоўтыя апілкі
сыплюцца з-пад пілкі.
Стружкі з-пад рубанкаў —
вязкай абаранкаў.
Мы для лаўкі дошкі
падгаблюем трошкі.
Вось гатова спінка,
вось гатовы ножкі...
Мы да стомы працавалі,
але лаўку змайстравалі!

*А. Вольскі.*

● Выпішыце з тэксту клічны сказ. Падкрэсліце ў ім галоўныя і даданыя члены сказа.

**219.** Паўтарыце правілы правапісу раздзяляльнага мяккага знака і апострафа. Выканайце тэставыя заданні.



Правообладатель Национальный институт образования

## § 29. Устарэлыя словы

**220.** Прачытайце верш. Якія словы, ужытыя аўтарам, не выкарыстоўваюцца ў сучаснай беларускай мове? З якой мэтай яны выкарыстаны аўтарам?

У Рагвалода меч харалу́жны,  
сыны — два воі, ён з імі разам  
вадзіў дружыну, і вояў мужных  
міналі стрэлы, дзі́ды не бралі.

*Т. Бондар.*

Д л я   д а в е д к і: *вой — воін, дружына — узброены атрад пры князю ў старажытнай Русі, харалужны — сталёвы, дзіда — піка.*

Лексіка беларускай мовы пастаянна змяняецца, што звязана з развіццём грамадства. Адны словы знікаюць, іншыя — з’яўляюцца. Ёсць словы, якія мяняюць сваё значэнне.

**Устарэлыя словы** — гэта словы, якія выйшлі з актыўнага ўжытку і ў наш час становяцца малавядомымі: *аршы́н* (мера даўжыні), *ла́пці* (плецены абутак), *сярмя́га* (верхняе адзенне), *леманта́р* (буквар). Устарэлая лексіка адлюстроўвае мінулае нашага народа, таму сустракаецца ў навуковай і мастацкай літаратуры для апісання гістарычных падзей.

**221.** Прачытайце верш. Якія адпаведнікі маюць у сучаснай беларускай мове выдзеленыя ўстарэлыя словы?

Хутка сонца засвеціць[ф] ясней,  
Хутка **тра́вень** прыйдзе на паляны  
І зашэпчуць лісты аб вясне,  
Маладой, зялёнай, **буя́най.**

*А. Куляшоў.*

Д л я   д а в е д к і: *травень — май; буяны — пышны, квітнеючы.*



Правообладатель Национальный институт образования

**222.** Прачытайце тэкст. Да якога тыпу ён адносіцца? Якая ўстарэлая лексіка выкарыстоўваецца для апісання сялянскай хаты?

## Беларуская хата

Хата — традыцыйны тып жылля сельскіх жыхароў. У Беларусі хаты будавалі з хвоі і елкі. Крылі хаты саломай, чаротам, драні́цай, гонтамі.



Інтэр’ер хаты трад..цыйна строгі. Кут каля дзв..рэй займала печ, кут насупраць печы называўся покуццю. Там стаялі стол, услоны. Уздоўж глухой сц..ны рабіліся палаці, палок, на якіх спалі. Каля сц..ны з вокнамі — ш..рокія лавы *(Паводле Беларускай энцыклапедыі)*.

Спішыце частку тэксту, у якой апісваецца інтэр’ер хаты. Устаўце прапушчаныя літары. Падкрэсліце ўстарэлыя словы.

***інтэр’е́р***

**223.** Прачытайце тэкст. Як вы разумееце, у чым каштоўнасць «Гістарычнага слоўніка беларускай мовы»?

«Гістарычны слоўнік беларускай мовы» — першы і адзіны даведнік, які адлюстроўвае лексічнае багацце беларускай мовы XIV—XVIII стагоддзяў. Праца беларускіх навукоўцаў над укладаннем слоўніка працягвалася 35 гадоў. Ён складаецца з 37 тамоў. У слоўніку больш за 75 тысяч старажытных беларускіх і запазычаных слоў, зафіксаваных у дагаворах і граматах, стату́тах і летапісах, воінскіх аповесцях і рыцарскіх раманах. Старабеларуская лексіка характарызуе чалавека ў розных адносінах, выяўляе асаблівасці яго паўсядзённага жыцця.

«Гістарычны слоўнік беларускай мовы» — надзейная крыніца звестак пра мінулае Беларусі. Ён утрымлівае каштоўную



Правообладатель Национальный институт образования

інфармацыю пра жыццё беларускага народа, яго матэрыяльную і духоўную культуру на працягу 500 гадоў *(Паводле А. Дзядовай)*.

Знайдзіце ў тэксце слова, што мае лексічнае значэнне ‘напісанне навуковай працы праз падбор і аб’яднанне якіх-небудзь матэрыялаў’.

**224.** Падбярыце да ўстарэлых слоў *сеча, чало, пілігрым, кляса, краса* сінонімы, якія ўжываюцца ў сучаснай беларускай мове.

Для даведкі: *лоб, бой, вандроўнік, клас, прыгажосць.*

- Зрабіце фанетычны разбор слова *прыгажосць*.

## § 30. Неалагізмы

**225.** Разгледзьце малюнкі. Запішыце словы — назвы транспартных сродкаў. Паразважайце, у сувязі з чым узнікаюць новыя словы.



Для даведкі: *конка, карэта, скутар, квадрацыкл.*

**226.** З прапанаваных частак «пабудуйце» новае слова. Запішыце яго.

| | | |
|---|---|---|
| **neos** (ад грэч.) — новы | **logos** (ад грэч.) — слова | **-ізм-** |



Правообладатель Национальный институт образования

**Неалагізмы** — гэта словы, якія ўзніклі ў мове як назвы новых прадметаў ці з'яў і маюць адценне навізны: *спонсар, дызайнер, брэнд, блогер, сайт*.

Неалагізмы ўзніклі ў выніку змен у жыцці грамадства, развіцця навукі і тэхнікі.

**227.** Якія словы мы ўжываем, калі гаворым:

1) пра тонкія хрумсткія шматкі бульбы, смажаныя ў алеі;
2) пра запечанае тонкае цеста з кавалачкамі каўбасы, грыбоў ці агародніны;
3) пра смажаную гарачую катлету ў разрэзанай напалову круглай булцы;
4) пра персанальны камп'ютар у выглядзе кнігі, якая вертыкальна адкрываецца?

Д л я  д а в е д к і: *піца, чыпсы, ноўтбук, гамбургер*.

**228.** Знайдзіце ў кожным радку лішняе слова. Успомніце, як называюцца разрады лексікі, якія прадстаўляюць гэтыя словы.

1) Прынтар, інтэрнэт, патэфон, плэер;
2) рубанак, фуганак, долата, залівень;
3) акваланг, цунамі, бадмінтон, андарак;
4) сказ, лексіка, словазлучэнне, арфаграма, горад.

***інтэрнэ́т***

**229.** Прачытайце тэкст. Сфармулюйце па-беларуску асноўную думку тэксту. Як вы разумееце значэнне выдзеленага ў тэксце слова?

## Советы Астрономуса

На календарной странице уже весна, а за окном хмурое небо. Как же так? Эти хмурые деньки указывают на то, что мы должны взять себя в руки и быть радушными и трудолю-


Правообладатель Национальный институт образования

бивыми, готовыми протянуть руку помощи своим **ближним.** Будьте прилежны в учёбе. Не давайте себе возможности стать ленивыми и невнимательными. Пусть в вашем сердце живёт надежда и уверенность в завтрашнем дне *(Из журнала «Незнайка»).*

Вусна перакладзіце тэкст на беларускую мову. На аснове звестак з тэксту складзіце выказванне «Што нам раіць Астраномус», адрасаванае сваім сябрам.

## Слоўнік

радушный — *ветлівы, сардэчны*
помощь — *дапамога*
прилежный — *старанны*
возможность — *магчымасць*

**230.** Спішыце тэкст. Знайдзіце і падкрэсліце неалагізмы, якія ўтварыла аўтар верша.

Ёсць **касмадром, аэрадром,**
і ёсць цікавы **іпадром.**
Мы ж пабудуем смехадром.
Яшчэ нам трэба жартадром.
Прыходзьце разам будаваць
і весяліцца, жартаваць.
*Н. Галіноўская.*

Растлумачце значэнні выдзеленых слоў. Што абазначае агульная частка слоў *-дром*? Як вы разумееце значэнні слоў *жартадром, смехадром*?

Прыдумайце жартаўлівыя неалагізмы з агульнай часткай *-дром*, якія будуць мець наступныя значэнні: 1) месца, дзе ўсім весела; 2) месца, дзе заўсёды свята.


Правообладатель Национальный институт образования

## § 31. Запазычаныя словы ў беларускай мове

**231.** Параўнайце словы ў левым і правым слупках. Ці адрозніваюцца лексічныя значэнні слоў?

| | |
|---|---|
| марка | брэнд |
| абмеркаванне | дыскусія |
| краявід | пейзаж |
| гутарка | інтэрв'ю |

Большую частку лексікі складаюць **спрадвечна беларускія словы.** Яны вызначаюць нацыянальную адметнасць і самабытнасць беларускай мовы: *дождж, вопратка, красавік, асілак.*

**Запазычаныя словы** — гэта словы, якія прыйшлі ў беларускую мову з іншых моў: *ракета* (з нямецкай), *цукаты* (з польскай), *адукацыя* (з лацінскай), *паліто* (з французскай).

Многія запазычаныя словы маюць беларускія адпаведнікі: *мантаж* (фр.) — *зборка*, *рубрыка* (лац.) — *раздзел*, *фальш* (польск.) — *падман.*

**232.** Прачытайце тэкст. Растлумачце паходжанне слова *клоўн.*

Клаўнада як цыркавы жанр складаецца з цыркавых сцэнак, выкананых клоўнамі. Слова *клоўн* у перакладзе з лацінскай мовы азначае 'чалавек з народа'.

Далёкімі папярэднікамі клоўнаў з'яўляюцца скамарохі. Яны выконвалі гімнастычныя, акрабатычныя трукі, спявалі, ігралі на розных інструментах. Ад вандроўных камедыянтаў гэта традыцыя перайшла на цыркавы манеж. Клоўны цырка



Правообладатель Национальный институт образования

сталі спалучаць музіцыраванне з камічнымі дзеяннямі. Клоўнаў падзяляюць на сола-артыстаў і тых, хто працуе ўдвух, утрох ці групай *(Паводле А. Радзікевіч)*.

Спішыце другі абзац. Падкрэсліце запазычаныя словы.

Знайдзіце ў тэксце сінонімы да слова *клоўн*.

**233.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак.

Беларус — гэта перш за ўсё заўзяты працаўнік. Спакон вякоў прывык ён жыць сваёй працай і спадзявацца толькі на сябе. Паўсядзённыя клопаты рабілі яго руплівым гаспадаром. Жыццё вымушала беларуса быць надзвычай ашчадным*. Свае мары пра шчасце, дастатак і багацце нашы таленавітыя продкі выказвалі ў казках, прыказках і прымаўках, якія яны ўмелі складаць.

Бывала, жыццё гнула беларуса. Але з усіх сіл ён стараўся пакінуць у спадчыну дзецям штосьці большае, чым атрымаў сам ад сваіх бацькоў. Беларусы былі людзьмі разважлівымі. Яны былі добрымі змагарамі, але войны прыносілі нашым продкам шмат шкоды і пакут *(З падручніка «Гісторыя Беларусі»)*.

Выпішыце з тэксту спрадвечна беларускія словы — назоўнікі і прыметнікі, якія характарызуюць беларуса:

*Беларус — працаўнік, ...*

*Беларус ашчадны, ...*

Знайдзіце ў тэксце слова, што мае лексічнае значэнне ‘пашкоджанне, урон, страта’.

Падрыхтуйце паведамленне «Такія мы, беларусы», пашыраючы змест тэксту дадатковымі звесткамі з гісторыі Беларусі, беларускай літаратуры, і самастойна зрабіце заключэнне.



Правообладатель Национальный институт образования

**234.** Запішыце вершаваныя радкі, уставіўшы патрэбныя запазычаныя словы.

Паміж красуючых садоў,
Як рой маленькіх матылькоў,
... гнёзды дзеткам уюць,
... лёгкія жывуць.

*К. Буйло.*

Для даведкі: *калібры (з іспанскай мовы) — вельмі маленькая птушка з прыгожым яркім апярэннем; газель (з французскай мовы) — невялікая горная жывёліна з пароды антылоп, лёгкая і імклівая.*

- Растлумачце правапіс выдзеленых літар.

Запазычаныя словы маюць свае прыметы. Слова запазычанае, калі:

- у слове ёсць літара ***ф***: *фармат, фабрыка, форма*;
- у пачатку слова цвёрдыя ***д, т***: *дэталь, тэма, тэрмін*;
- у корані слова ёсць спалучэнне дзвюх літар ***іё (ыё), ія(ыя), эа***: *чэмпіён, акіян, тэарэма*;
- у корані слова ёсць спалучэнні ***бю, пю, вю, ге, ке, хе, кю, шт, шп, хт***: *бюро, капюшон, гравюра, герой, кефір, хек, кювет, штаб, шпіль, вахта*;
- слова заканчваецца на ***-ум, -ус, -ант, -ізм (-ызм), -ент (-энт), -ура***: *акварыум, вірус, дэсант, рэалізм, студэнт, партытура*;
- у словы ўваходзяць часткі ***аква-, аўта-, інтэр-, -фон, бія-, геа-***: *аквапарк, аўтадром, мікрафон, геалогія.*

**235.** Запішыце запазычаныя словы паводле прыведзеных значэнняў. Падкрэсліце прыметы запазычаных слоў.

1) Урачыстае адкрыццё мастацкай выставы і адначасовае спатканне з аўтарам (фр.);



Правообладатель Национальный институт образования

2) драматычны твор з вясёлым зместам (лац.);
3) агульнадаступны, зразумелы ўсім (лац.);
4) бліскучы поспех, урачыстасць з выпадку перамогі (лац.).

Д л я  д а в е д к і: *папулярны, трыумф, вернісаж, камедыя.*

Складзіце сказы з запісанымі словамі.

***футбо́л***

**236.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак.

У вольны час мы любілі гуляць у футбол. Любілі — нават не тое слова. Лепш сказаць, мы самаахвярна, забыўшыся пра іншыя захапленні і ўцехі, ганялі мяч. Мы адчувалі велізарную радасць у гульні, забітых галах, у перамозе, а таксама моцнае гора ад прапушчаных галоў і прыкрых паражэнняў. Усё часцей і часцей мы абыгрывалі іншыя футбольныя каманды. Мы не толькі загартоўваліся, але і добра навучыліся гуляць у футбол *(Паводле Г. Далідовіча).*

Выпішыце з тэксту спартыўныя тэрміны.

Назавіце іншыя запазычаныя словы на спартыўную тэму.

- Знайдзіце ў тэксце словы, у якіх літара ***с*** абазначае мяккі гук [с’].

**237.** Спішыце тэкст, раскрываючы дужкі. Да якога стылю ён адносіцца?

Дзяўчынка іграла на *(раяль)*. Яе пальчыкі шпарка бегалі па *(клавішы)*. Нот набралася многа-многа! Стала ім цесна. Яны звонкімі[л] гарошынамі рассыпаліся па *(падлога)*, пакаціліся на адчынены балкон, а з *(балкон)* — на тратуар. Па *(тратуар)* ішлі людзі. Яны лавілі ноты і з добрай *(усмешка)* неслі іх з сабой.

А ноты ўсё падалі і падалі... Іх было так многа, звонкіх, радасных, пявучых! І не маглі людзі іх сабраць. Тады



Правообладатель Национальный институт образования

прыляцелі птушкі, падхапілі ўсе ноты да адзінай і паляцелі з імі па ўсёй *(зямля)*. Так разнеслася песня пра мір! *(А. Кобец-Філімонава)*.

Падкрэсліце запазычаныя словы і назавіце іх прыметы.

● Знайдзіце ў тэксце словы, ужытыя ў пераносным значэнні. Складзіце словазлучэнні, у якіх гэтыя словы ўжываліся б у прамым значэнні.

**238.** Прачытайце верш.

## Піяністка

Просіць Маша несупынна,
каб купілі піяніна[ф].
— Хочаш музыцы вучыцца,
піяністкай быць у нас?
— Не, на зэдліку круціцца, —
кажа Маша ў адказ.

*С. Грахоўскі.*

Як вы думаеце, чаму большасць музычных назваў запазычана з італьянскай мовы, марскіх — з галандскай, прадметаў побыту — з польскай, спартыўных тэрмінаў — з англійскай?

Складзіце слоўнікавыя артыкулы наступных слоў з указаннем паходжання: *піяніна, піяністка*.

У з о р: *зэдлік (польск.) — пераносная лавачка для сядзення.*

● Растлумачце правапіс галосных у запазычаных словах.

**239.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

## Мелодия

В переводе с греческого языка слово «мелодия» означает ‘пение’, ‘песня’. Самая первая в мире была, наверное, колыбельная. С той поры люди сочинили много мелодий.



Правообладатель Национальный институт образования



Мелодия создаётся по определённым законам. Их устанавливает музыкальный слух человека. Звуки в мелодии должны ладить между собой.

Мелодии песен и танцев нам всегда понятны. Но серьёзная музыка может показаться нам немелодичной. А знатоки слушают её с удовольствием. В чём тут дело? Если мы будем почаще встречаться с самой разной музыкой, наш слух станет гибким. Постепенно мы научимся её понимать *(По А. Клёпову)*.

**Слоўнік**

создаваться — *ствараццa*
определённые законы — *пэўныя (вызначаныя) законы*
знатоки — *знаўцы*
удовольствие — *задавальненне*
гибкий — *гнуткі*

Як вы разумееце выраз *мова музыкі*?

Раскажыце, якую музыку любіце і слухаеце вы.

**240.** Паўтарыце правілы правапісу спалучэнняў галосных у запазычаных словах. Выканайце тэставыя заданні.

## § 32. Паняцце пра фразеалагізмы. Роля фразеалагізмаў у маўленні

**241.** Вусна адкажыце на пытанні, прывядзіце прыклады.

Якое значэнне слова называецца прамым?
Якое значэнне слова называецца пераносным?
На аснове чаго ўзнікаюць пераносныя значэнні слоў?


Правообладатель Национальный институт образования

**242.** Разгледзьце малюнкі. Складзіце словазлучэнні па кожным з іх.



У якой сітуацыі маўлення ўжываецца выраз *ліць кракадзілавы слёзы*?

Калі ў маўленні будзе дарэчным выказванне *жывуць як кошка з сабакам*?

У якім выпадку можна ўжыць выраз *як кот наплакаў*?

**243.** Прачытайце верш.

Мама кажа: «Наш Пятрок
мае востры язычок».
«Дык чаму ж, — спытала Люба, —
не парэжа Пеця губы?»

*А. Дзеружынскі.*

Як вы разумееце выраз *востры язык (востры на язык)*? Якому слову паводле значэння адпавядае гэты выраз?

Д л я  д а в е д к і: *востры на язык — пра чалавека, які валодае ўменнем ярка (смешна або з'едліва) выказаць сваю думку.*

**Фразеалагізм** — гэта непадзельнае, устойлівае спалучэнне слоў, якое мае адзінае, цэласнае значэнне: *ламаць галаву* (доўга думаць), *непачаты край* (многа), *мазоліць вочы* (дакучаць), *светлая галава* (разумны).



Правообладатель Национальный институт образования

Фразеалагізмы з’яўляюцца адным членам сказа: *Ён заўсёды меў галаву на плячах.*

Фразеалагізмы ажыўляюць маўленне, надаюць яму вобразнасць, выразнасць.

**244.** Прачытайце табліцу і падрыхтуйце паведамленне на тэму «Як адрозніць свабоднае словазлучэнне ад фразеалагізма». У якасці прыкладу выкарыстайце спалучэнне слоў *правая рука*.

| Свабоднае словазлучэнне | Фразеалагізм |
|---|---|
| ***Склаўшы рукі*** *на грудзях, ён глядзеў удалеч.* | *Ён не можа сядзець* ***склаўшы рукі****.* |
| Кожнае слова ў словазлучэнні мае сваё значэнне: *склаўшы* — ‘размясціўшы перад сабой’; *рукі* — ‘верхнія канечнасці чалавека’. | Сэнс не вынікае са значэння асобных слоў. Усё спалучэнне мае адно значэнне: *склаўшы рукі* — ‘без справы’. |
| Магчыма замена слоў: ***Перакрыжаваўшы рукі*** *на грудзях, ён глядзеў удалеч.* | Немагчыма замена слоў. |
| Утвараецца ў працэсе маўлення. | Ужываецца ў маўленні як гатовая адзінка мовы. |

**245.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго асноўную думку.

## Асцярожна: слова!

Колькі разоў на дзень людзі раздражнёна кідаюць: *настрою няма, усё з рук валіцца, вочы мае цябе не бачылі б, ногі не трымаюць, галава кругам ідзе* і інш. У кожным з такіх выпадкаў закладзена праграма, якую наша падсвядомасць успрымае як загад да дзеяння. Такія фразы, як кроплі камень,


Правообладатель Национальный институт образования

точаць нас знутры. Мы самі праграмуем свой дрэнны фізічны і псіхічны стан.

Дык ці не лепей думаць і гаварыць станоўчымі катэгорыямі? Яны ж таксама ўрэшце стануць яваю — здароўем, ураўнаважанасцю, добрым настроем, добразычлівасцю! *(Паводле А. Міхневіча)*.

Знайдзіце ў тэксце фразеалагізмы. Растлумачце іх значэнне. Да чаго заклікае аўтар нас, чытачоў? Паразважайце, чаму са словам трэба абыходзіцца асцярожна.

**246.** Утварыце спалучэнні з прапанаванымі словамі. Вызначце, якія з іх з’яўляюцца фразеалагізмамі, а якія — свабоднымі словазлучэннямі.

Назавіце спалучэнні слоў, якія могуць быць і свабоднымі словазлучэннямі, і фразеалагізмамі.

| | | |
|---|---|---|
| акунацца з … | | … баліць |
| павесіць … | | з … да ног |
| садовая … | **галава** | … ідзе кругам |
| хлопчыкава … | | на … хадзіць |

З двума фразеалагізмамі на выбар складзіце і запішыце сказы.

**247.** Прачытайце тэкст. Перакажыце звесткі пра паходжанне фразеалагізмаў.

За..ц — часты п..рсанаж б..ларускіх народных казак пра жывёлу.[сн] Даверлівы і крыху хлуслівы, задавака і гультай, а галоўнае — вельмі ба..злівы[л]. Ён заўсёды выклікае сімпат..ю



Правообладатель Национальный институт образования

і спачуванне. У беларускай мове выкарыстоўваюцца фраз..а-лагізмы *зайцаў хлеб, злавіць зайца*.

*Зайцаў хлеб* — хлеб незвычайны. Так называюць рэшткі ежы, прывезенай дадому з лесу, з поля, якую даюць з'есці дзецям. Згодна з народнымі ўяўленнямі, ад зайца разам з хлебам павінны перадацца дзецям жыццяздольнасць, спрыт, жвавасць. Гэты чароўны хлеб будзе дабратворна ўплываць на рост, развіццё і здароўе дзіцяці.

Фразеалагізм *злавіць зайца* мае значэнне 'ўпасці'. Аднак злавіць такога спрытнага, жвавага звярка няпроста, практычна немагчыма. Таму і фразеалагізм ужываецца ў гаворцы звычайна тады, калі па́дае дзіця, спалохаўшыся ад нечаканасці *(Паводле У. Коваля)*.

Спішыце першы абзац тэксту, устаўляючы прапушчаныя літары, растлумачце іх правапіс.

У якіх сітуацыях будзе дарэчным выкарыстанне прыведзеных фразеалагізмаў? *(Гутарка з сябрам, апавяданне для кнігі, размова з маці ці бабуляй, выступленне на «Вечары гумару».)*

Складзіце апавяданне «Як я злавіў зайца» ў мастацкім ці гутарковым стылі.

**248.** Знайдзіце фразеалагізмы, якія «схаваліся» ў прыказках. Запішыце іх. Вусна растлумачце значэнне.

1. Вуснамі мёд разлівае, а за пазухай камень трымае.
2. Лепш на волі[л] на голай ветцы, чым у няволі ў залатой клетцы.
3. Ката ў мяшку не купляюць.
4. У сабакі заўсёды кошкі на душы скрабуць.
5. Сляпой курыцы і жвір пшаніца.
6. Языком не мялі — багацейшым не станеш.

**249.** Паўтарыце правілы правапісу ***д*** і ***дз***, ***т*** і ***ц***. Напішыце зрокавы слоўнікавы дыктант.


Правообладатель Национальный институт образования

## Кантрольныя пытанні і заданні

1. Што такое лексіка?

2. Якія значэнні слова называюцца пераноснымі? Прывядзіце прыклады.

3. У чым асаблівасць лексічнага значэння сінонімаў, антонімаў, амонімаў? Пакажыце гэта на прыкладах.

**250.** Адгадайце словы па прыведзеных лексічных значэннях. Запішыце па ўзоры.

У з о р. *Змест — гэта тое, што складае сутнасць чаго-небудзь.*

1. Кніга, з якой можна даведацца пра нешта. 2. Тое, што пабудавана. 3. Рознакаляровая паласа на небе, якая звычайна з'яўляецца пасля дажджу. 4. Рух вады ў рэках. 5. Зорка, якая хутка падае і знікае.

Д л я д а в е д к і: *плынь, пабудова, знічка, даведнік, вясёлка.*

**251.** Падбярыце патрэбныя словы-антонімы і дапішыце радкі верша.

Які сёння дзень[л] і якая дата?
Для каго — будзень,
Для каго — … .
Для каго — засуха,
Для каго — … .
Аднаму — разлука,
Другому — …

*А. Грачанікаў.*

Д л я д а в е д к і: *сустрэча, свята, макрэча.*

**252.** Выпішыце амонімы. Якой часцінай мовы яны з'яўляюцца?

Высокая нота — дыпламатычная нота.
Сабака пароды баксёр — знакаміты баксёр.
Навуковы тэрмін — тэрмін здаваць працу.


Правообладатель Национальный институт образования

Дорага каштаваць — каштаваць цукерку.
Паўночны вецер — паўночны час.

**253.** Прачытайце тэкст. Дайце яму загаловак.

Тата купіў нам з братам кні..ку пра аквары..м. Там было сказана, што куплены аквары..м трэба памыць растворам марганцоўкі і заліць на двое сутак вадой. Добра б было за гэты час ваду ў аквары..ме некал..кі разоў пам..няць. З замазкі вымакнуць усе шкодныя рэчывы: не будуць атручваць рыбак. На дно аквары..ма насыпаць буйнога і добра прамытага жвіру. Яшчэ лепш прамыты п..сок ракіп..ціць — знішчацца ўсе заразныя мікробы. Рыбак не проста трымаць! *(Паводле П. Місько).*

Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце запазычаныя словы. Па якіх прыметах вы вызначылі гэтыя словы?

Паразважайце, што трэба зрабіць, перш чым узяць на сябе адказнасць за жывых істот, якіх мы хочам трымаць дома.

**254.** Прачытайце тэкст. Знайдзіце прыказку. Як вы разумееце яе сэнс?

Хлопчык так разгуляўся, што маці мусіла сказаць:
— Не шумі, тата хворы.
Сын не паслухаўся, нават крыўднае[л] слова сказаў.
Заплакала маці ад знявагі. А хлопчыку сорамна зрабілася. Стаў ён прасіць:
— Мама, забудзьце крыўднае слова, даруйце.
— Я дарую, сынок, але не забуду. Лягчэй ластаўку злавіць, чым знявагу забыць *(В. Сухамлінскі).*

Як магла развівацца далей размова паміж маці і сынам? Які дыялог мог адбыцца паміж імі? Прыдумайце працяг тэксту. Уключыце ў выказванне тлумачэнне сэнсу прыказкі, якая ўжываецца ў тэксце, і свае разважанні.


Правообладатель Национальный институт образования

**255.** Запішыце фразеалагізмы па малюнках. Растлумачце іх значэнні. У якіх сітуацыях маўлення ўжываюцца гэтыя фразеалагізмы? Складзіце з імі сказы.



а) Вісець на валаску;
б) вешаць лапшу на вушы;
в) як курыца лапай;
г) як снег на галаву.



**256.** Прыдумайце гумарыстычнае апавяданне пра незвычайны выпадак, каб асноўнай думкай стала прыказка «Мякка сцеле, ды мулка спаць». У канцы зрабіце павучальны вывад.

Правообладатель Национальный институт образования

# Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год

**257.** Прачытайце. Што ў тэксце парушана?

Вось а*(д/дз)*ін слоічак мама паставіла *(у/ў)* буфет на самую верхнюю паліцу і паклікала Віцю ў в..лікі пакой стол накрываць. Як толькі мама выйшла з кухні, хлопчык ху*(т/ц)*енька залазіць на табурэтку, здымае з паліцы слоічак, ч..рпае лы*(ж/ш)*кай — і ў рот.

Сёння маміна свята, Вос..мага сакавіка, і да Віцевай мамы прыйдуць госці. Мама рыхтуецца, а Віця ёй дапамагае.[сн] Але больш за ўсё ён каштуе стравы. Да чаго ж усё смачнае!

Калі мама в..рнулася на кухню, Віця стаяў каля самага крана[л] і старанна паласкаў рот. На вачах былі слёзы.

— Ну што, паласаваўся гарчыцай! — вес..ла засм..ялася мама *(Паводле К. Каліны)*.

Размясціце часткі тэксту так, каб атрымаўся тэкст-апавяданне. Запішыце яго, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары.

**258.** Прачытайце верш. Які адказ дае аўтар на пастаўленае ў загалоўку пытанне? Вызначце тып маўлення.

### Чаму птушкі лётаюць?

Уся зямля гарыць у майскай квецені.
Колькі год я па ёй вандраваў!



Правообладатель Национальный институт образования



А сёння спыніўся:
Як жа ісці
Па вуснах пявучых траў,
Па жывых, раскрытых вачах лотаці?
Дык вось чаму птушкі лётаюць[ф]!

*М. Танк.*

Пра што гаворыць першы радок верша? У якім значэнні ўжыты ў ім выраз *зямля гарыць*? Калі ён можа ўжывацца ў прамым значэнні?

Прывядзіце прыклады ўжывання слоў у прамым і пераносным значэнні. Запішыце спалучэнні слоў парамі: *дровы гараць* — ..., *чалавек ідзе* — ..., *агонь успыхнуў* — ..., *маці ўсміхнулася* — ..., *дзяўчынка заплакала* — ... .

Як вы разумееце радкі: *Па вуснах пявучых траў, па жывых, раскрытых вачах лотаці*?

Разгледзьце малюнак лотаці і адкажыце, вачыма якога колеру глядзіць кветка на нас. Якімі вачыма глядзяць у блакітнае неба рамонкі, васількі, пралескі?

Як бы вы адказалі на пытанне «Чаму птушкі лётаюць?» Пашукайце ў энцыклапедыі ці ў інтэрнэце адказ на гэта пытанне.

**259.** Устанавіце адпаведнасць паміж беларускімі і рускімі прыказкамі.

1. Кожн.. кравец сваім кроем кроіць.
2. Зычлів.. прыяцеля ў ня..часці пазнаюць.
3. Грош маленьк.., ды в..лікія справы робіць.
4. Галодн.. каню авёс сніцца.

---

а) Голодной куме хлеб на уме.
б) Мал золотник, да дорог.
в) Всяк молодец на свой образец.
г) Друзья познаются в беде.


Правообладатель Национальный институт образования

Запішыце беларускія прыказкі, устаўляючы прапушчаныя літары.

Якое слова мае значэнне ‘даўнейшая медная манета’? У якіх краінах Еўропы выкарыстоўваецца грош як сучасная разменная манета?

**260.** Напішыце самадыктант.

**261.** Напішыце тлумачальны зрокавы дыктант.

**262.** Прачытайце тэкст, выкарыстоўваючы замест пытанняў патрэбныя словы з рубрыкі «Для даведкі». Чаму тэкст так называецца? Колькі частак у ім можна вылучыць?

## Заслужаны адпачынак

Большую частку свайго жыцця чалавек аддае працы. Дзякуючы гэтаму будуюцца новыя дамы, (д з е?) імчацца новыя аўтамабілі, якія (к а л і?) сышлі з канвеера. А паліцы магазінаў (д з е?  і  д з е?) (к а л і?) не пусцеюць.

Але (я к?) бяжыць час. Чалавек дасягае сталага ўзросту. Яму становіцца ўсё цяжэй працаваць (я к?). (К а л і?) узнікаюць праблемы са здароўем. Як правіла, пажылыя людзі ідуць на заслужаны адпачынак. Мы так называем адпачынак, бо чалавек сваёй шматгадовай працай яго (я к?) заслужыў.








Правообладатель Национальный институт образования

А яшчэ ён заслужыў, каб да яго ставіліся (я к?) *(Паводле А. Бадака).*

Для даведкі: *сапраўды, з павагай, з гадамі, па дарогах, хутка, фізічна, нядаўна, ніколі, у гарадах і вёсках.*

Калі ў нашай краіне адзначаецца Дзень пажылых людзей?

Запішыце другі абзац тэксту, пашыраючы сказы акалічнасцямі. Вызначце, ад якога члена сказа залежаць акалічнасці. Абгрунтуйце сваю думку.

- Напісанне якіх слоў з тэксту адпавядае правілу «Правапіс ***у*** і ***ў***»?

Разгледзьце малюнкі. Складзіце некалькі сказаў пра тое, як вы дапамагаеце сваім бабулям і дзядулям. Як вы ставіцеся да іншых людзей сталага ўзросту?

**263.** Прачытайце верш. Адгадайце загадку з тэксту. Які адказ на пытанне дае аўтар верша? Пры якой умове будзе даспяваць хлеб, пячы сонца і цвісці ліпа?

З даўняй школьнай
Чытанкі яшчэ
Тую загадку
Не раз прыгадаю:
«Ліпа цвіце.
Сонца пячэ.
Хлеб даспявае…
Калі так бывае?»

Калі не задымлена
Даль палявая,
Калі з неба вецер
Свінцом не мяце,
Так і бывае —
Хлеб даспявае…
Сонца пячэ…
Ліпа цвіце…

*В. Гардзей.*

Выпішыце з тэксту неразвітыя сказы. Якую ролю яны адыгрываюць у тэксце? Перабудуйце неразвітыя сказы ў развітыя. Падкрэсліце ў іх галоўныя і даданыя члены сказа.

Падбярыце сінонімы да слова *прыгадаць.*

Знайдзіце ў тэксце словы, напісанне якіх адпавядае правілу «Правапіс галосных ***е, ё, я***».



Правообладатель Национальный институт образования

**264.** Прачытайце тэкст, пашыраючы сказы аднароднымі членамі. Падбярыце да тэксту загаловак у адпаведнасці з тэмай.

Мая Беларусь — зялёны лісток на карце[л] Еўропы. Куды б ні паехаў, цябе сустракаюць непаўторныя краявіды: лясы, пералескі, ... . Мая Беларусь — гэта і векавыя дубы, і ліпы, ... . Мая Беларусь — гэта звяры: зубры, мядзведзі, ... .

Б..ларусы славяц..а сваімі рамёствамі: і ганчарствам, і ткацтвам, ... .[сн] Наша з..мля падарыла ўс..му свету славутых людзей: асветніцу *(Е/е)*фрасінню, першадрукара *(Ф/ф)*ранцыска *(С/с)*карыну, ... .

Вакол нас — карагод краін[ф]: Расія, Літва, ... . Лёс даў нам цудоўныя чалавечыя якасці: мірны характар, чулае сэрца, ... . Усё гэта дазваляе нам і нашай краіне жыць і развівацца ў свеце *(Паводле інтэрнэт-рэсурсаў)*.

У першым сказе вызначце граматычную аснову. Растлумачце пастаноўку працяжніка.

Спішыце другі абзац тэксту, раскрываючы дужкі, устаўляючы прапушчаныя літары і дапаўняючы сказы аднароднымі членамі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Пабудуйце схему першага сказа другога абзаца.

**265.** Прачытайце верш. Якія дзеянні чалавека прыпісваюцца з'явам прыроды? Прамое ці пераноснае значэнне маюць словы, якія называюць гэтыя дзеянні?

### Я малюю...

Краю роднага прасторы
Маляваць люблю я.
Ранак, поўдзень, адвячорак,
Нават ноч малюю.

Ясны месяц, што з-за хмары
Зазірае ў хаты.
— А чаму чырвонай фарбай? —
Запытаўся тата.



Правообладатель Национальный институт образования

— А таму, што ярка гэтак
Радуюцца зоркі.
І суніцы цёплым летам
Спеюць на пагорках.
Не хачу я хмару злую
Маляваць над нівай.
А таму заўжды малюю
Фарбаю шчаслівай.
*П. Прыходзька.*

У спалучэнні *суніцы спеюць* замяніце дзеяслоў іншым дзеясловам у пераносным значэнні. Запішыце сказ.

Да слова *зазіраць* падбярыце сінонімы і запішыце сінанімічны рад.

**266.** Прачытайце тэкст. Растлумачце лексічныя значэнні выдзеленых слоў.

## Дзве скрыпкі

**У антыкварную краму** трапілі дзве[ф] скрыпкі. Адна — замежная. На ёй стаяла адзнака вядомага італьянскага майстра. Другая — ад вясковага хлопца. Скрыпка засталася яму ад **вандроўнага** музы́кі, а іграць хлопец не ўмеў. Выразаная дата на скрыпцы гаварыла, што ёй сто гадоў. Скрыпкі павесілі побач.

Прайшло некалькі дзён. Аднойчы ў краму зайшоў славуты скрыпач. Антыквар падаў яму першую скрыпку. Прайшоўся смычок па струнах. «Скрыпка фальшывіць!» — здзіўлена сказаў скрыпач. Ён узяў другую скрыпку і зайграў. Скрыпка ўспомніла свайго гаспадара-ўмельца, сяброўку балалайку, вясёлыя святы. Скрыпач не выпусціў скрыпкі з рук і забраў яе з сабою.

Скрыпка з простай беларускай грушы іграла ў Парыжы і Лондане, Рыме і Берліне. Яна і сёння прыносіць людзям радасць *(Паводле У. Бутрамеева)*.


Правообладатель Национальный институт образования

Падрыхтуйцеся да пісьмовага пераказу тэксту.

1. Вызначце тэму тэксту.
2. Вызначце тып тэксту.
3. Выдзеліце і зачытайце часткі, якія адпавядаюць будове апавядання.
4. Вызначце стыль тэксту. Якія словы і выразы пацвярджаюць гэта?
5. Вызначце ў кожнай частцы апорныя словы, якія перадаюць паслядоўнасць падзей.
6. Складзіце план пераказу.
7. Прачытайце тэкст яшчэ раз.
8. Напішыце чарнавы варыянт пераказу.
9. Перачытайце свой варыянт пераказу, прааналізуйце тэкст:
   а) Наколькі поўна раскрыта тэма апавядання?
   б) Ці перадалі асноўную думку тэксту?
10. Праверце правапіс слоў і пастаноўку знакаў прыпынку.

Правообладатель Национальный институт образования

## Тлумачальны слоўнік

*Ара́тар*, -а, *мн.* -ы, -аў, *м.* Той, хто гаворыць прамову, прамоўца; той, хто валодае красамоўствам, майстэрствам слова.

*Арты́кул*, -а, *мн.* -ы, -аў, *м.* 1. Невялікі навуковы або публіцыстычны твор у часопісе, газеце, зборніку. 2. Самастойны раздзел, параграф у юрыдычным дакуменце, слоўніку і пад.

*Арэ́лі*, -яў. Устройства, на якім гушкаюцца для забавы.

*Аўл*, -а, *мн.* -ы, -аў, *м.* Паселішча (на Каўказе і ў Сярэдняй Азіі).

*Ашча́дны*, -ая, -ае. Беражлівы, эканомны.

*Вір*, -у, *М* віры, *мн.* віры, -оў, *м.* 1. Кругавы, лейкападобны рух вады на рацэ, які ўзнікае ад сутыкнення сустрэчных плыней. 2. Глыбокае месца ў рацэ, з ямай, дзе адбываецца завіхрэнне плыні.

*Вядо́мы*[1], -ая, -ае. Такі, пра якога ведаюць, маюць звесткі.

*Вядо́мы*[2], -ага, *м.* Такі, які ідзе пад чыёй-небудзь камандай.

*Капе́ж*, капяжу *і* капяжа, *м.* 1. капяжу. Падзенне кропель талага снегу са стрэх, дрэў, а таксама самі гэтыя кроплі. 2. капяжа, *мн.* капяжы, -оў, *м.* Ніжні край страхі, даху, які выдаецца над сцяной.

*Каўта́ць*, -аю, -аеш, -ае. *(абл.)*. Глытаць.

*Ке́льма*, -ы, *мн.* -ы, -льм і -льмаў, *ж.* Прылада муляра, тынкоўшчыка ў выглядзе трохвугольнай лапаткі для набірання і нанясення раствору на цэглу.

*Ке́мнасць*, -і, *ж. (разм.)*. Здольнасць хутка разумець што-небудзь, разабрацца ў чым-небудзь; здагадлівасць.

*Кіцель*, -я, *мн.* -і, -яў, *м.* Форменная аднабортная куртка са стаячым каўняром.

*Лаўрэа́т*, -а, *М* -аце, *мн.* -ы, -аў, *м.* Званне, якое прысуджаецца за выдатныя заслугі ў галіне навукі, мастацтва і пад., а таксама асоба, якая мае такое званне.

*Лю́лька*, -і, *ДМ* -льцы, *мн.* -і, -лек, *ж.* Вісячы памост з бартамі для падымання на вышыню рабочых, будаўнічых матэрыялаў, інструментаў для работы на вышыні.

*Мадо́нна*, -ы, *мн.* -ы, -аў, *ж.* Назва Багародзіцы ў католікаў.

*Маладзі́к*, -а, *м.* Месяц у першай квадры.

*Мро́йны*, -ая, -ае. Тут: летуценны, створаны марай; фантастычны.

*Но́у-ха́у*, *нескл.*, *н. (спец.)*. Дакументальна афармленая інфармацыя пра сучасныя тэхналогіі, навукова-тэхнічныя дасягненні, камерцыю, сэрвіс.


Правообладатель Национальный институт образования

*О́дум*, -у, *м. (разм.)*. Стан разважання, засяроджанасці, паглыблення ў сябе, у свае думкі.

*Пало́к*, -лка, *мн.* -лкі, -лкоў, *м.* 1. Нары паміж печчу і супрацьлеглай сцяной уздоўж глухой сцяны ў сялянскай хаце. 2. Узвышэнне ў выглядзе шырокай паліцы ў лазні, на якім парацца.

*Па́нна*, -ы, *мн.* -ы, -аў, *ж.* 1. Незамужняя дачка пана. 2. Маладая дзяўчына, якая належала да прывілеяваных пластоў грамадства ў дарэвалюцыйны час.

*Паплаво́к*[1], -а, *м.* Лёгкі плаваючы прадмет, які прымацоўваецца да лёскі.

*Паплаво́к*[2], -а, *м.* Невялікі луг у пойме ракі.

*Прэзі́дыум*, -а, *мн.* -ы, -аў, *м.* Назва кіруючага органа сходу, нарады, выбарнай або навуковай установы.

*Ра́жка*, -і, *ДМ* -жцы, *мн.* -і, -жак, *ж.* Драўляная пасудзіна ў выглядзе цэбрыка з ручкай для розных гаспадарчых патрэб.

*Ро́шчына*, -ы, *ж.* Негустое цеста на дражджах або з закваскай, якое пасля замешваюць.

*Самабы́тны*, -ая, -ае. Арыгінальны, не падобны да іншых; своеасаблівы.

*Страфа́*, -ы, *мн.* строфы *і (з ліч. 2, 3, 4)* страфы, строф, *ж.* У вершаваным творы: частка тэксту з паўтаральнай арганізацыяй рытму і рыфмы, якая змястоўна аб'ядноўвае некалькі радкоў верша.

*Стрымгало́ў*, *прысл.* Вельмі хутка, імкліва, кулём.

*Сту́дня*, -і, *мн.* -і, -яў. *ж*, Калодзеж.

*Трыу́мф*, -у, *мн.* -ы, -аў, *м.* Выдатны поспех, бліскучая перамога ў чым-небудзь.

*Тынкава́ць*, -кую, -куеш, -куе. Пакрываць сцены або столь растворам з вапны, цэменту, гліны, каб зрабіць гладкай паверхню.

*Тэра́са*, -ы, *мн.* -ы, -рас, *ж.* Летняя адкрытая (без сцен) прыбудова да дома.

*Уверцю́ра*, -ы, *мн.* -ы, -цюр, *ж.* Музычны ўступ да оперы, балета, драмы і пад.

*Уві́шна*, *прысл.* Жвава, спрытна.

*Фра́у*, *нескл.*, *ж.* Ветлівы зварот да замужняй жанчыны або форма ветлівага ўпамінання пра яе ў Германіі.

*Ча́йка*[1], -і, *ДМ* чайцы, *мн.* -і, чаек, *ж.* Вадаплаўная пералётная птушка.

*Ча́йка*[2], -і, *ДМ* чайцы, *мн.* -і, чаек, *ж.* Пласкадонная лодка.

*Шкарпэ́ткі*, -так, *адз.* шкарпэтка, -і, *ДМ* -тцы, *ж.* Кароткія панчохі, якія не даходзяць да калена.



Правообладатель Национальный институт образования

# Слоўнікавыя словы

до́світак
ззя́ць
іеро́гліф
інтэр’е́р
інтэрнэ́т
клавіяту́ра
лабіры́нт
нао́гул
нарэ́шце
насу́страч
нізаво́шта
па-белару́ску
памо́чнік
раён
расцвісці́
спартсме́н
та́лент
усміха́цца
футбо́л
хараство́
што́сьці
шчаслі́вы
шэдэ́ўр

Правообладатель Национальный институт образования

## Спіс выкарыстаных крыніц

*Аўласенка, Г. П.* Казкі дзядулі Дняпра / Г. П. Аўласенка. — Мінск : Звязда, 2012. — 136 с.

*Броўка, П.* Крыніца з-пад Вушачы : вершы і паэмы / П. Броўка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — 366 с.

*Брыль, Я.* Сёння і памяць : апавяданні, мініяцюры, эсэ / Я. Брыль. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1985. — 317 с.

*Брыль, Я.* Цуды ў хаціне : апавяданні / Я. Брыль. — Мінск : Юнацтва, 1998. — 111 с.

*Бусько, М. І.* Бабрыная навука : скорагаворкі, загадкі, каламбуры / М. І. Бусько. — Мінск : Юнацтва, 2001. — 225 с.

*Бусько, М. І.* У бары жывуць сябры : казка, апавяданні / М. І. Бусько. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2017. — 95 с.

*Бутэвіч, А.* Як акіян з кропелькай барукаўся : казкі / А. Бутэвіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — 235 с.

*Быкаў, В.* Аблава / В. Быкаў // Поўны збор твораў : у 14 т. — Мінск, 2005—2019. — Т. 2 : Аповесці. — 2005. — С. 375—453.

*Васілевіч, А.* Выбраныя творы / А. Васілевіч. — Мінск : Беларуская навука, 2010. — 532 с.

Величайшие чудеса света. — Минск : Харвест, 2007. — 96 с.

Вір жыцця : сучасная беларуская проза / В. Адамчык [і інш.] ; склад. Л. Ф. Леўкіна. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2002. — 528 с.

*Вітка, В.* Урокі роднага слова : вершы, казкі, апавяданні / В. Вітка. — Мінск : Юнацтва, 1997. — 224 с.

*Выгонная, Л. Ц.* Ад гука да літары / Л. Ц. Выгонная. — Мінск : Народная асвета, 1991. — 78 с.

Вясёлка : вершы, апавяданні, казкі, п’есы, песні / уклад. М. А. Маляўка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2012. — 279 с.

Вясёлка [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу : http ://www.veselka.by.

Вяснянка : вершы, апавяданні, казкі беларускіх пісьменнікаў. — Мінск : Юнацтва, 1983. — 225 с.

*Галіноўская, Н.* Калі я шчаслівы : вершы, казкі, жарты, небыліцы / Н. Галіноўская. — Мінск : Звязда, 2013. — 160 с.



Правообладатель Национальный институт образования

*Галубовіч, Я.* Дзівосы роднай прыроды : апавяданні і казкі для дзяцей / Я. Галубовіч. — Мінск : Пачатковая школа, 2012. — 168 с.

*Гніламёдаў, У. В.* Вяртанне : раман / У. В. Гніламёдаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. — 429 с.

*Грахоўскі, С.* Выбраныя творы / С. Грахоўскі. — Мінск : Кнігазбор, 2007. — 542 с.

*Гурскі, В.* Кучараўчык : апавяданні / В. Гурскі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. — 135 с.

*Гурыновіч, Х.* Лес на далоні : вершы, апавяданні. — Мінск : Юнацтва, 2001. — 320 с.

*Дайнека, Л.* Меч князя Вячкі : раман / Л. Дайнека. — Мінск : Юнацтва, 2000. — 335 с.

*Далідовіч, Г.* Жар кахання : апавяданні пра жанчын / Г. Далідовіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1996. — 350 с.

*Дамаронак, Т. І.* Казкі сінявокай зямлі / Т. І. Дамаронак. — Мінск : Беларусь, 2016. — 160 с.

*Дзеружынскі, А.* Залаты каласок : вершы, пацешкі, небыліцы / А. Дзеружынскі. — Мінск : Юнацтва, 1989. — 302 с.

*Жуковіч, В.* Пра што гаманілі рамонкі : вершы, пацешкі, скорагаворкі, загадкі, казкі / В. Жуковіч. — Мінск : Першая ўзорная друкарня, 2012. — 88 с.

*Жуковіч, В.* Цудоўная краіна : вершы, п'есы-казкі, сцэнкі / В. Жуковіч. — Мінск : Вышэйшая школа, 1997. — 270 с.

*Збароўскі, Э.* Чарнобыльскія пантэоны : сны і явы / Э. Збароўскі. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2012. — 240 с.

*Зуёнак, С. В.* Птушкі. Крылатая песня зямлі : нарысы / С. В. Зуёнак. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. — 63 с.

*Зэкаў, А. М.* Пад кронай белых аблачын : вершы / А. М. Зэкаў. — Мінск : Ковчег, 2013. — 172 с.

Зямля бацькоў, святая... : зборнік вершаў пра малую радзіму / уклад. В. Шніп. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2018. — 143 с.

*Казлоў, А. С.* Юргон : раманы, аповесці, апавяданні / А. Казлоў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2006. — 255 с.

*Казько, В.* Выбраныя творы : у 2 т. / В. Казько. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1990.

Калі цвіла чаромха : аповесці, апавяданні / уклад. В. Шніп. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2014. — 471 с.



Правообладатель Национальный институт образования

Каляндар школьніка : тэматычны зборнік прозы, паэзіі, драматургіі, эсэ / уклад. А. Бадак. — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2016. — 72 с.

*Караткевіч, В. Г.* Жыве на свеце шчасце : казкі для дзяцей і дарослых / В. Г. Караткевіч. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2010. — 140 с.

Кніга пра расліны / пер. з рус. і апрац. С. У. Фядотавай. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2004. — 64 с.

*Коваль, У. І.* Чым адгукнецца слова : фразеалогія ў паверʼях, абрадах і звычаях. — Мінск : Народная асвета, 1994. — 48 с.

*Ліпскі, У. С.* Гомельская зямля — Радзіма твая і мая : дзецям пра Гомельшчыну / У. С. Ліпскі. — Мінск : Звязда, 2013. — 256 с.

*Ліцвінка, В. Д.* Слова міма не ляціць : беларус. нар. прыказкі і прымаўкі. — Мінск : Універсітэцкае, 1985. — 149 с.

Лучынка : сінанімічныя ўзоры, моўны этыкет, вершы, проза, замовы, крылатыя выслоўі, смяшынкі, беларускі народны гумар / уклад. : З. І. Кустава, В. А. Салаўёва. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. — 240 с.

Мама — сонейка маё... : вершы, песні / уклад. М. А. Маляўка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. — 118 с.

*Минкевич, Л. С.* Самые необычные музеи Беларуси / Л. С. Минкевич. — Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2017. — 71 с.

*Мінскевіч, С.* Вялікія прыгоды Какоса Маракоса / С. Мінскевіч. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2015. — 142 с.

Міфалогія беларусаў : энцыклапедычны слоўнік / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. — Мінск : Беларусь, 2011. — 607 с.

*Мушынская, Т. М.* Вожыкі ў футбол гуляюць : вершы, апавяданні, казкі : для дзяцей мал. шк. узросту / Т. М. Мушынская. — Мінск : Литература и Искусство, 2008. — 136 с.

Ніве і хлебу : паэзія, проза / уклад. А. Рыбака і К. Цвіркі. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. — 463 с.

*Пазнякоў, М. П.* Святло дабрыні : азбука, лічэбнікі, лічылкі, вершы, скорагаворкі, каламбуры, загадкі, крылатыя выразы, казка / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Звязда, 2015. — 320 с.

*Пазнякоў, М. П.* Хто прыдумаў і калі? : з гісторыі тэхнікі, транспарту і рэчаў / М. П. Пазнякоў. — Мінск : Коларград, 2017. — 100 с.



Правообладатель Национальный институт образования

Пакуль б’еццa сэрца… : аповесці, апавяданні / уклад. А. Лесавік. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2013. — 375 с.

Песня пра хлеб : зб. паэзіі : для ст. шк. узросту / уклад. В. Шніп. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2012. — 230 с.

Птушка шчасця : зб. казак. — Мінск : Юнацтва, 1991. — 175 с.

Родная крыніца : кніга для вучняў : 6 клас / склад. : В. М. Захарэвіч, І. П. Крэнь. — Мінск : Народная асвета, 1986. — 255 с.

*Рублеўская, Л.* Сэрца мармуровага анёла : аповесці, апавяданні / Л. Рублеўская. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2003. — 288 с.

Самотная зорка Венера : аповесці, апавяданні / уклад. А. Лесавік. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2012. — 335 с.

*Санько, З.* Малы руска-беларускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем. — Мінск : Навука і тэхніка, 1991. — 218 с.

*Сачанка, Б.* Выбраныя творы : у 3 т. / Б. Сачанка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1994.

Свяці, свяці, сонейка : творы беларускага фальклору / уклад. І. К. Цішчанка. — Мінск : Юнацтва, 1997. — 350 с.

*Сіпакоў, Я.* З вясны ў лета / Я. Сіпакоў. — Мінск : Беларусь, 1972. — 168 с.

*Сіпакоў, Я.* Зялёны лісток на планеце Зямля : эсэ / Я. Сіпакоў. — Мінск : Харвест, 2006. — 288 с.

*Стадольнік, І.* Лістапад на пачатку лета : аповесць, апавяданні / І. Стадольнік. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1987. — 344 с.

Хрэстаматыя па беларускай дзіцячай літаратуры / склад. М. Ф. Шаўлоўская. — 2-е выд., перапрац. і дап. — Мінск : Вышэйшая школа, 1989. — 511 с.

Чытанка для ласуноў : для дзяцей мал. шк. узросту / уклад. І. Буторына. — Мінск : Звязда, 2016. — 168 с.

*Шамак, А. А.* Міфалогія Старажытнай Беларусі / А. А. Шамак. — Мінск : Сэр-Віт, 2004. — 240 с.

*Шпадарук, І. П.* Чаму мы так гаворым / І. П. Шпадарук, В. В. Рудакоўскі. — Мінск : Народная асвета, 1985. — 72 с.

Правообладатель Национальный институт образования

## Змест

### ФАНЕТЫКА І АРФАЭПІЯ. ГРАФІКА І АРФАГРАФІЯ


§ 1. Гукі беларускай мовы ........................................ 3
§ 2. Літара як знак гука ........................................ 6
§ 3. Прызначэнне літар *е, ё, ю, я, і* ........................................ 10
§ 4. Беларускі алфавіт. Назвы літар ........................................ 13
§ 5. Склад ........................................ 16
§ 6. Націск ........................................ 18
§ 7. Правілы пераносу слоў (паўтарэнне) ........................................ 20
§ 8. Галосныя гукі ........................................ 22
§ 9. Вымаўленне і правапіс галосных *о, э, а* ........................................ 24
§ 10. Вымаўленне і правапіс галосных *е, ё, я* ........................................ 30
§ 11. Вымаўленне і правапіс спалучэнняў *іё (ыё), ія (ыя), іе (ые)* у запазычаных словах ........................................ 34
§ 12. Зычныя гукі ........................................ 37
§ 13. Глухія, звонкія і санорныя зычныя. Іх вымаўленне і правапіс 39
§ 14. Свісцячыя і шыпячыя зычныя. Іх вымаўленне і правапіс .... 44
§ 15. Цвёрдыя, мяккія і зацвярдзелыя зычныя. Іх вымаўленне і правапіс ........................................ 47
§ 16. Мяккі знак і апостраф ........................................ 50
*Змякчальны мяккі знак* ........................................ 50
*Раздзяляльны мяккі знак і апостраф* ........................................ 53
§ 17. Зычныя [д] — [$\widehat{дз}$’], [т] — [ц’], іх вымаўленне і правапіс .... 57
§ 18. Правапіс *у, ў* ........................................ 62
§ 19. Падоўжаныя зычныя, іх вымаўленне і правапіс ........................................ 67
§ 20. Прыстаўныя зычныя і галосныя, іх правапіс ........................................ 71
§ 21. Правапіс некаторых спалучэнняў зычных ........................................ 74


### ЛЕКСІКА. ФРАЗЕАЛОГІЯ


§ 22. Лексічнае значэнне слова ........................................ 82
§ 23. Адназначныя і мнагазначныя словы ........................................ 86
§ 24. Прамое і пераноснае значэнне слова ........................................ 88
§ 25. Сінонімы ........................................ 91




Правообладатель Национальный институт образования

§ 26. Антонімы ........................................................ 95
§ 27. Амонімы (азнаямленне) ........................................ 98
§ 28. Агульнаўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку 102
§ 29. Устарэлыя словы ............................................... 109
§ 30. Неалагізмы ....................................................... 111
§ 31. Запазычаныя словы ў беларускай мове ........................ 114
§ 32. Паняцце пра фразеалагізмы. Роля фразеалагізмаў у маўленні 119

**ПАДАГУЛЬНЕННЕ І СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ВЫВУЧАНАГА ЗА ГОД** (127)

Тлумачальны слоўнік ................................................ 134
Слоўнікавыя словы .................................................. 136
Спіс выкарыстаных крыніц ......................................... 137

Правообладатель Национальный институт образования

Вучэбнае выданне

**Валочка** Ганна Міхайлаўна
**Зелянко** Вольга Уладзіміраўна
**Мартынкевіч** Святлана Васільеўна
**Якуба** Святлана Міхайлаўна

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

Вучэбны дапаможнік для 5 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

У дзвюх частках

Частка 2

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Л. Ф. Леўкіна*
Мастакі *З. П. Болцікава, М. М. Рудакоўская, Ю. М. Галавейка*
Мастацкі рэдактар *Л. М. Рудакоўская*
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Кісялёва*
Карэктары *К. В. Шобік, Д. Р. Лосік*

Падпісана да друку 30.09.2019. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 10,53. Ул.-выд. арк. 6,0. Тыраж 137 000 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 04.10.2013.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск

Правообладатель Национальный институт образования

(Назва і нумар установы агульнай сярэдняй адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Правообладатель Национальный институт образования

## ПАРАДАК
## ФАНЕТЫЧНАГА РАЗБОРУ СЛОВА

1. Вымавіць слова, вызначыць склады, назваць націскны склад.
2. Ахарактарызаваць гукі:
   - галосныя (націскны ці ненаціскны, якой літарай абазначаны);
   - зычныя (мяккі, цвёрды ці зацвярдзелы; санорны, звонкі ці глухі; свісцячы ці шыпячы; якой літарай абазначаны).
3. Указаць колькасць гукаў і літар.

### УЗОР РАЗБОРУ

Дзьмухавец — *дзьму-ха-ве́ц*.

| **Гукі:** | **Літары:** |
| --- | --- |
| [дз’] — зычны мяккі, звонкі, свісцячы | д, з, ь |
| [м] — зычны цвёрды, санорны | м |
| [у] — галосны ненаціскны | у |
| [х] — зычны цвёрды, глухі | х |
| [а] — галосны ненаціскны | а |
| [в’] — зычны мяккі, санорны | в |
| [э] — галосны націскны | е |
| [ц] — зычны зацвярдзелы, глухі, свісцячы | ц |
| 8 гукаў | 10 літар |

## ПАРАДАК
## ЛЕКСІЧНАГА РАЗБОРУ СЛОВА

1. Растлумачыць лексічнае значэнне слова.
2. Указаць, адназначнае ці мнагазначнае слова.
3. Вызначыць, у якім значэнні — прамым ці пераносным — слова ўжыта ў тэксце (сказе).
4. Падабраць да слова сінонімы, антонімы (калі магчыма).
5. Указаць, якое слова паводле ўжывання — агульнаўжывальнае ці абмежаванага ўжытку (дыялектнае, прафесійнае, тэрмін).
6. Указаць, ці з'яўляецца слова ўстарэлым або неалагізмам.
7. Вызначыць паходжанне слова (спрадвечна беларускае ці запазычанае).

### УЗОР РАЗБОРУ

*На наступны дзень ужо ў восем гадзін* ***раніцы*** *я быў на нагах* (Д. Пятровіч).

***Раніца*** — час сутак ад канца ночы да пачатку дня, першыя гадзіны дня. Слова адназначнае. Ужыта ў прамым значэнні. Сінонімы — *ранак, ранне*; антонім — *вечар*. Слова агульнаўжывальнае, спрадвечна беларускае.

## МАЎЛЕНЧАЯ СІТУАЦЫЯ




## НАВУКОВЫ СТЫЛЬ МАЎЛЕННЯ

**Мэта выкарыстання**
- паведаміць навуковыя звесткі
- растлумачыць сутнасць з’явы ці прадмета

**Сфера выкарыстання**
- падручнікі
- слоўнікі
- даведнікі
- энцыклапедыі

**Асноўныя моўныя сродкі**
- тэрміны

## ГУТАРКОВЫ СТЫЛЬ МАЎЛЕННЯ

**Мэта выкарыстання**
- абмяняцца думкамі
- выказаць пачуцці
- запытацца пра нешта

**Сфера выкарыстання**
- бытавыя (неафіцыйныя) абставіны

**Асноўныя моўныя сродкі**
- гутарковыя словы і выразы
- дыялог

## МАСТАЦКІ СТЫЛЬ МАЎЛЕННЯ

**Мэта выкарыстання**
- вобразна апісаць пэўныя з’явы, прадметы, падзеі

**Сфера выкарыстання**
- мастацкая літаратура
- вусная народная творчасць

**Асноўныя моўныя сродкі**
- эпітэты
- параўнанні
- словы з пераносным значэннем